№ 30 (388) 13 жніўня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Алімпіяда ў эпоху тэрарызму



### Генэрал, якому ня вераць

Нібы менавіта экс-міністра ўнутраных справаў лічаць слабым месцам сыстэмы, нібы ў ягоную ідэалягічную вытрыманасьць і эмацыйную ўраўнаважнасьць ня вераць. Нібы нехта баіцца, каб ён не загаварыў іншым голасам…

старонка 3

КУЛЬТУРА

### Начныя кашмары Беларусі

Прыйшоў час аддаць належнае жахам, апрануць іх па прыстойнай магільнай модзе — і паставіць на службу вызваленьню і беларушчыне. Пантэон найлепшых кашмараў, жахі на службу Беларусі ў эсэ Андрэя Расінскага — **старонкі 14—15.**

КАЛЯНДАР

## Усяславава навука

### Да 975-годзьдзя полацкага князя

Калі прыйдзе час ствараць праўдзівы нацыянальны Пантэон, дык мусім пачаць з Усяслава Чарадзея. Як хрысьціянства пачалося з нараджэньня Хрыста, так і Беларусь (як бы пры тым краіна ні называлася ў часе, між людзей і ў прасторы) пачалася з нараджэньня Ўсяслава. Нават міт пра зьяўленьне на сьвет полацкага князя падобны да міту Хрыстовага: містычнасьць нараджэньня (ад чарадзейства), да калыскі прыйшлі вешчуны, прырода падавала знакі — на небе зьявілася зьзяньне ў выглядзе зьмея. Так сьведчаць летапісы.

Вядома, не было б Рагвалода, полацкіх Ізяслава і Брачыслава — не было б і Ўсяслава Чарадзея. Гэтаксама, як перад Янкам Купалам былі Дунін-Марцінкевіч, Багушэвіч, Лучына.

Няпроста будавалася Полацкая дзяржава: няшмала было ахвотнікаў на тутэйшыя багацьці. Шмат хто хацеў уладарыць на гэтых прыбытковых «транзытных» землях, кантраляваць шлях «з варагаў у грэкі». Менавіта Дзьвіна была той «трубой», за якую змагаліся валадары Ўсходняе Эўропы. Улічваючы тагачасныя транзытныя жарсьці, зразумела, чаму так часта ваяваў Чарадзей супраць Кіева і Ноўгараду — галоўных канкурэнтаў на «вараскім шляху». Моцнай краіны не бывае бяз моцнай эканомікі.

Працяг на старонцы 2.



НАКІД АЛЕСЯ ШАТЭРНІКА

### Гіпнатычны фільм

пра беларускі народ і Васіля Быкава.

старонка 6

### Нарач даражэйшая за Крым

Дзе адпачываюць беларусы.

старонка 9



# Прэм’ер росту

### За прэм’ерам Сяргеем Сідорскім эканамічны рост у краіне дасягнуў 10 працэнтаў за год

**Сідорскі задаволены сабой, сваёй пасадай і вынікамі працы. Прамысловасьць і сфэра паслуг растуць яшчэ хутчэй, чым ВУП. Даходы людзей перавысілі апошнія савецкія паказчыкі на 30%. Можна доўга спрачацца, чыя ў гэтым заслуга, параўноўваць з посьпехамі Ўкраіны й Польшчы, адсочваць цэны на нафту і каньюнктуру расейскага рынку. Рост усё адно пачынае асацыявацца з напорыстым каржакаватым прэм’ерам.**

**Сідорскі розьніцца ад сваіх папярэднікаў. Ён яшчэ ня вырас у палітычную фігуру першага шэрагу, але надзвычай хутка апанаваў рычагі і нітачкі, якія прыводзяць у дзеяньне ня дужа разваротлівую беларускую гаспадарку. Яму нават удаецца павялічваць колькасьць ідэалягічна блізкіх яму людзей ва ўрадзе. Ён амбітны і выпраменьвае аптымізм.**

**Вага Сідорскага ня большая, чым вага старшыні Саўміну ў савецкі час у параўнаньні зь першым сакратаром ЦК. Ён займаецца выкананьнем, але ня мае ўлады. Але… Цьвёрды — праявіў сябе прыхільнікам жорсткага адстойваньня нацыянальных эканамічных інтарэсаў на перамовах з Расеяй. Адкрыты — пабываў у Брытаніі, Італіі, Аўстрыі, шукае кантактаў у эўрапейскіх бізнэсколах. Камусьці спатрэбілася нават перашкодзіць ягонаму польскаму візыту. Удачлівы — ня толькі ў эканамічным росьце, а нават у надвор’і для сельскай гаспадаркі. Ды не ў мадэрнізацыі эканомікі, для чаго патрэбна палітычная воля.**

**Насуперак Лукашэнкаваму выхваляньню, доля Расеі ў замежным гандлі Беларусі працягвае толькі расьці, а зь ёю — і залежнасьць, і пагроза нацыянальнай бясьпецы. Экспарт у Расею ў гэтым паўгодзьдзі вырас на 35,7%, у краіны за межамі СНД — толькі на 27,2%. Імпарт з Расеі павялічыўся на 32,7%, з краін за межамі СНД — толькі на 29,2%. Гіганцкія лічбы росту нават палохаюць. Шалёныя грошы сыходзяць гэтак жа лёгка, як прыйшлі. Аднак пра гэта людзі думаюць, толькі калі застаюцца з парожнімі кішэнямі.**

**Яшчэ трохі такога росту — і Сідорскага запомняць выбарцы, і палітолягам у самы час будзе задумацца: хто ён, прэм’ер Сідорскі?**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Сяргей Сідорскі нарадзіўся ў 1954 у Гомелі. Скончыў Інстытут інжынэраў чыгункі. Працаваў у Гомелі. Ва ўрадзе з 2001.

**На фота: Сяргей Сідорскі на 60-годзьдзі МАЗу.**

## Апазыцыю штурхаюць да байкоту

### Пачатак выбарчай кампаніі азначыўся масавым ціскам на незалежных кандыдатаў

Паводле зьвестак незарэгістраванага праваабарончага цэнтру «Вясна», кандыдаты ад апазыцыйных партыяў складаюць толькі 2% сяброў аркуговых выбарчых камісій. Большасьць у камісіях трымае вэртыкаль. Самай дэмакратычнай называюць сябры «Вясны» выбарчую камісію на Глыбоччыне. У яе ўвайшлі па адным прадстаўніку з ПКБ, Народнай грамады і БНФ: 3 дэмакраты з 13 сяброў. На думку «Вясны», выбары пакуль не праходзяць пад азначэньне «свабодных» ні па адным парамэтры.

Першы ціск адчулі дэмакратычныя кандыдаты, якія падалі сьпісы сваіх ініцыятыўных групаў. Робіцца ўсё, каб не дапусьціць нават іх рэгістрацыі.

Настаўніцы Берштаўскай базавай школы (Шчучынскі раён) Марыі Будзько загадчык аддзелу адукацыі Ўладзімер Дубок прыгразіў звальненьнем за ўдзел у групе Аляксандра Мілінкевіча.

Татальная «зачыстка» прайшла ў Барысаве,

Працяг на старонцы 3.

# Усяславава навука

Працяг са старонкі 1.

Чарадзей быў мудрым палітыкам. Ён разумеў, што ізаляцыянізм — гэта шлях у нікуды. Таму, не руйнуючы паганства на сваіх землях, ён будуе ў Полацку хрысьціянскі храм Сьв.Сафіі, трэці на землях Усходняе Эўропы — пасьля Кіева і Ноўгараду. Чарадзей ніколі б не сказаў: «Не паваду свой народ за цывілізаваным сьветам».

Культура і навука — гэткі ж падмурак дзяржаўнасьці, як і эканоміка. Нават полацкія муляры, якія будавалі Сафійку, былі пісьменныя — яны пакінулі свае імёны на камені, умураваным у сьцяну храму: Давыд, Таўма, Мікула, Капес… Вынікам палітыкі Ўсяслава — а нярэдка вынікі асобных дзеяньняў праяўляюцца праз стагодзьдзі — і стала нараджэньне ў Полацку Эўфрасіньні і Скарыны — людзей надзвычай высокай культуры і адкрытых сьвету, глыбока інтэграваных у яго, *але пры гэтым вельмі патрыятычных.*

Летась я паспрабаваў высьветліць: дзе ж мог быць пахаваны полацкі валадар? Некаторыя гісторыкі сьцьвярджаюць, што парэшткі Ўсяслава знайшлі спакой у галоўнай катэдры краіны — Сьвятой Сафіі, маўляў, гэткім чынам нашчадкі мусілі адзначыць ягоныя заслугі перад Полаччынай. Але ж мне бліжэй гіпотэза маладога полацкага гісторыка і археоляга Дзяніса Дука. Ён лічыць, што хутчэй за ўсё саркафаг Усяслава знаходзіўся ў храме на стрэлцы Ніжняга замку. Менавіта каля падмуркаў гэтай бажніцы былі знойдзены аскепкі багата аздобленага саркафага з шыфэрнага сланцу, які быў прывезены з-за тысячы кілямэтраў для вельмі знакамітай асобы. Ведаючы, як ненавідзелі Ўсяслава яго ворагі, зразумела, чаму храм на стрэлцы Ніжнага замку праіснаваў толькі да XVI ст., само ж пахаваньне, магчыма, было зьнішчана яшчэ раней — падчас цяжкіх выпрабаваньняў XII ст., калі на Полацак хадзілі вайной кааліцыі старажытных славянскіх князёў.

Але дух Усяслава Чарадзея немагчыма зьнішчыць. Ён усё адно застаўся ў Полацку. Сапраўднае адраджэньне Беларусі пачнецца з аднаўленьня храму-пахавальні славутага князя, прабацькі беларускага сьвету.

**Алесь Аркуш**

АД РЭДАКЦЫІ

## Памажыце «Нашай Ніве»

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» зьвяртаецца да чытачоў «НН», суродзічаў, беларускіх арганізацый з просьбай аб фінансавай дапамозе. Крызыс, што паўтараецца штолета праз сэзоннае паніжэньне продажу, сёлета асабліва цяжкі — прычыны ў незвычайнай фінансавай дыскрымінацыі газэты дзяржаўнымі манапалістамі. Газэта патрабуе Вашай тэрміновай падтрымкі, каб застацца яскраваю.

Т.: 284-73-29, 613-32-32, 707-73-29. E-mail: nn@promedia.by.
Адрас: 220050. Менск, а/с 537.

# Кнігі, якіх ня купіш

Наталка Бабіна



Што творыцца зь беларускімі пісьменьнікамі?

Ці сьпеюць пад гэтым дахам, бы ананасы ў аранжарэі, таленты, як на гэта спадзяваўся Кароўеў у дачыненьні да расейскіх пісьменьнікаў?

Без сумневу.

Але паставім пытаньне другім бокам: ці ёсьць магчымасьць у беларускага чытача прачытаць створаныя ананасамі шэдэўры?

Без сумневу — але калі чытач будзе ганяцца за шэдэўрамі, высалапіўшы язык, як супрацоўнік Скотланд Ярду за пэрсанажам Грэма Грына.

Ня ведаю, ці справядлівыя нараканьні на тое, што беларусы ня хочуць чытаць па-беларуску. Можа, і не: аказалася ж паводле перапісу, што больш за сорак працэнтаў беларусаў карыстаюцца беларускай у побыце, — а хто б рашыўся такое сьцьвярджаць?

Працяг на старонцы 7.



## Пяць дзён у рэальным сьвеце

**«На Акрэсьціна я, наймаладзейшая ў камэры, мела і самы паважаны статус — палітычны. Да мяне з аднолькавай павагай ставіліся і рэцыдывісткі, і бамжы. А гожыя амонаўцы — гэта ўвогуле асобная песьня», — піша Наста Азарка, арыштаваная за ўдзел у акцыі 21 ліпеня.**

Працяг на старонцы 12.

З УСЁЙ КРАІНЫ

## Суіцыд з мужчынскім тварам

Толькі за ліпень на Аршаншчыне пайшлі з жыцьця па ўласным жаданьні тры мужчыны. У вёсцы Савішчына павесіўся 50-гадовы калгасьнік, які, паводле слоў сваякоў, стаміўся ад беспрацоўя. Хоць не працуе там амаль палова вёскі, дый тыя, хто робіць у гаспадарцы, зарабляюць па 20—60 тыс. рублёў. Яшчэ адзін 40-гадовы самагубца пакінуў запіску родзічам: «Прабачце, але не магу так жыць далей, калі ня ў стане забясьпечыць сям'ю». 30-гадовы вясковец застрэліўся, а ў перадсьмяротнай запісцы напісаў: «Не магу жыць у галечы, ня бачу будучыні». У сьледчых органах з гэтай нагоды зазначаюць, што самазабойцы з кожным годам маладзеюць. Яшчэ гадоў 5—7 таму суіцыд быў пашыраны сярод адзінокіх пэнсіянэраў зь мінімальнай пэнсіяй, у якіх не хапала сродкаў на жыцьцё. А вось за апошнія гады пачасьціліся выпадкі суіцыду сярод працаздольных мужчын. Прычын доўга шукаць ня трэба — высокі ўзровень беспрацоўя, беднасьць, пагалоўнае п'янства.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

Іншыя паведамленьні з усёй краіны — старонка 5.

ТЭНДЭНЦЫІ

## Людзям лепей — моваў меней

На міжнароднай канфэрэнцыі лінгвістаў у Ляйпцыгу (Нямеччына) было абвешчана, што за 20—30 гадоў 60% моваў Зямлі стануць мёртвымі. Прычыны — глябалізацыя, разбурэньне традыцыйных ладаў жыцьця й наступ ангельскай мовы. Сёньня пад пагрозай зьнікненьня — каля 4000 моваў і гаворак.

Людзі жывуць усё даўжэй і зручней. А мовы і лады жыцьця штодзённа зьнікаюць. Справа ў выгодах і грошах: у пагоні за імі людзі забываюцца пра ўсё на сьвеце. Трэба дасягнуць пэўнага ўзроўню сытасьці, каб думаць пра духоўнае? Хіба так. Якраз на багатым захадзе Эўропы працэс звужэньня кола носьбітаў малых моваў безьдзяржаўных народаў замарудзіўся, а сям-там яго нават удалося адвярнуць назад.

**Мікола Бугай**



## «Калевала» па-беларуску

Перакладчык Якуб Лапатка ўзяўся за пераклад слыннага фінскага эпасу «Калевала». На сёньня Лапатка — адзіны перакладчык, які перастварае тэксты зь фінскай на беларускую бяз моў-пасярэдніц.

Іншыя навіны культуры — старонка 13.

ПРАЎДА

**«Комсомольская правда в Белоруссии» пра эпізод чачэнскае вайны:**

«На шум запусканага рухавіка ў двор выбеглі бацькі Рамзана, і нехта з бандытаў адным высьпяткам зьбіў з ног 70-гадовага старога, вэтэрана Вялікай Айчыннай вайны». Выходзіць, старога прызвалі на фронт ваяваць з фашыстамі ў 10 гадоў?! У справе дыскрэдытацыі чачэнскіх партызанаў трэба быць танчэйшаю, «Камсамолка».

**Ніўскі**

## Увазе распаўсюднікаў

Прыватныя распаўсюднікі могуць купляць «НН» па мінімальнай цане 550 рублёў у краме УП «Марат». Менск, вуліца Інтэрнацыянальная, 11А, 2-гі паверх. Ад 9 да 17, перапынак ад 13 да 14, тэл. 226-87-99.



## Райс прыняла Красоўскую

Дарадца прэзыдэнта ЗША па нацыянальнай бясьпецы Кандаліза Райс 6 жніўня сустрэлася ў Вашынгтоне з Ірынай Красоўскай, жонкай бізнэсоўца Анатоля Красоўскага, які зьнік у 1999. І.Красоўская паінфармавала К.Райс пра сытуацыю ў Беларусі.

**Charter97.org**

# Вуліца Драздовіча, бульвар Мулявіна

Менгарвыканкам прыняў пастанову пра перайменаваньне шэрагу гарадзкіх вуліц. Найбольшая колькасьць — па ўскраінах, дзе вёскі ўвайшлі ў межы гораду і назвы вуліц супалі з ужо наяўнымі гарадзкімі. У новым мікраёне Лошыца зьявіліся вуліцы Станіслава Манюшкі, Каруся Каганца і Язэпа Драздовіча. Бульвару Луначарскага пастанавілі даць імя Мулявіна. Імя Быкава пакуль не ўвекавечана. Памянялі назву дзясяткі вулак у былых падгародны вёсках Заслаўе, Цна ды інш. Найбольш тым выкарысталі назвы былых хутароў ды ўрочышчаў. Падрабязна распавядае пра новаазвы «Звязда» ад 10 жніўня.

**АШ**

## Кніга пра нераскрытыя злачынствы




Кніга «Беларусь: нераскрытыя злачынствы найноўшай гісторыі» — дакумэнтальны аповед пра зьніклых у нашай краіне. На 30 старонках ані ўспамінаў, ані вэрсіяў. Толькі дакумэнты: мэмарандум Хрыстаса Пургурыдэса «Зьніклыя асобы ў Беларусі», рапарты міністру ўнутраных спраў Навумаву, напісаныя генэрал-маёрам Лапацікам і палкоўнікам Алкаевым, ды яшчэ пастанова аб затрыманьні Паўлічэнкі за подпісам старшыні КДБ Мацкевіча і з санкцыяй генпракурора Бажэлкі. Брашура выйшла без выходных зьвестак.

АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Вы за Грузію




У апошні тыдзень адносіны паміж Грузіяй і Абхазіяй сталіся яшчэ больш напружанымі. Падчас сваёй паездкі ў ЗША прэзыдэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі чарговы раз папярэдзіў расейцаў устрымацца ад вандровак у Абхазію і загадаў страляць па ўсіх суднах, што будуць намагацца бяз санкцыі Тбілісі патрапіць на абхаскае ўзьбярэжжа. «Расейцы мусяць зразумець, што гэта ня месца адпачынку, а зона ваенных дзеяньняў, дзе на пляжы гулялі ў футбол галовамі грузінаў». Масква — а 70% жыхароў Абхазіі прынятыя ў расейскае грамадзянства — адгукнулася адразу ж: Дзяржддума зрабіла заяву, у якой папярэдзіла, што падобныя дзеяньні будуць расцэньвацца як «варожы акт з усімі наступнымі вынікамі». Кіраўнік МУС непрызнанай рэспублікі Ігар Ахба ў чацьвер заявіў аб жаданьні Абхазіі яшчэ больш шчыльна супрацоўнічаць з Расеяй, асабліва ў пытаньнях абаронча палітыкі і валюты. Саакашвілі ж паабяцаў, што праз 3—4 гады, калі абхаская сытуацыя залагодзіцца, на тэрыторыі Сакартвэла ня будзе ніводнага расейскага вайскоўца. На чыім баку беларускія палітыкі?

Большасьць з апытаных намі мяркуюць, што ўрад Саакашвілі мае рацыю. «Прэзыдэнт Грузіі дзейнічае паводле Канстытуцыі сваёй краіны, дзе ясна запісана, што Грузія — адзіная, непадзельная і сувэрэнная дзяржава, абхазцы — сэпаратысты, і супраць іх трэба весьці барацьбу», — лічыць былы намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта, дэпутат палаты прад-

# Генэрал, якому ня вераць

Само прызначэньне танкіста і міліцыянта Юр'я Сівакова міністрам спорту выглядала дзіўна. Як бы гэтага чалавека баяцца пакінуць без пасады, але ўдвая баяцца выпусьціць з краіны паслом у які-небудзь Узбэкістан.

Старшыню КДБ Мацкевіча, ублытанага ў тую ж гісторыю, але зь іншага боку, такі выправілі ў Сэрбію паназіраць за непазьбежным хаосам першых гадоў дэмакратыі. Сівакова ж — не. Так, нібы менавіта экс-міністра ўнутраных справаў лічаць слабым месцам сыстэмы, нібы ў ягоную ідэалягічную вытрыманасьць і эмацыйную ўраўнаважанасьць ня вераць. Нібы нехта баіцца, каб ён не загаварыў іншым голасам.

Апэляцыя Сівакова да Расеі і славянаў выдала лёгкае замяшаньне. Сівакоў адчувае сябе ў гэтай гісторыі падстаўленым. Выпраўляючы ў Атэны міністра спорту, не маглі ж ня ведаць, якую рэакцыю гэта выкліча цяпер, пасьля спэцыяльнага дакладу Пургурыдэса.

«Мы, славяне, на чале з Расеяй, павінны праяўляць больш актыўнасьці ў абароне ўстаноўленых міжнародных нормаў і правілаў, а не заставацца пасіўнымі пабочнымі назіральнікамі», — напісаў міністар у сваёй заяве. «З пункту гледжаньня прэзумпцыі невінаватасьці і сутнасьці праблемы, вакол якой узьнікла ўся гэтая шура-бура, магу сказаць толькі адно, — працягвае міністар Юры Сівакоў, — ніхто ня мае права называць чалавека злачынцам і выносіць яму прысуд без рашэньня суду».

Грэцыя ня ўпусьціць на Алімпіяду таксама міністраў спорту Бірмы і Зымбабвэ. «У адпаведнасьці з рашэньнямі ЭЗ адносна краінаў, дзе парушаюцца правы чалавека», — заявіў прадстаўнік грэцкага ўраду.

Камэнтуючы рашэньне, міністар Сівакоў адзначыў, што з маральна-псыхалягічнага гледзішча гэта сур'ёзная траўма, і ня толькі асабіста для яго. Сівакоў спадзяецца, што спартоўцы і трэнэры «зразумеюць усё правільна». Сам Сівакоў будзе кіраваць дэлегацыяй зь Менску, у Атэнах жа знаходзіцца ягоная намесьніца па міністэрстве Галіна Забур'янава.

У адрозьненьне ад украінскага прэм'ера Віктара Януковіча, вышэйшыя асобы Беларусі на Алімпіяду не зьбіраюцца. У мінулым на кожны дыпляматычны ўдар Эўропы ўрад адыгрываўся на незалежным грамадзтве.

**Мікола Бугай**

**Казку «Выпадак у лесе» чытай на старонцы 16.**



**Юры Сівакоў (зьлева) і Аляксандар Мядзьведзь напярэдадні выправы спартоўцаў у Атэны.**

ДАВЕДКА

58-гадовы генэрал Юры Сівакоў нарадзіўся на Далёкім Усходзе Расеі. Афіцэр-танкіст. Кіраўнік Міністэрства ўнутраных справаў, пасьля намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта, міністар спорту. Праваабаронцы і сем'і ахвяраў даводзяць, што Сівакоў у бытнасьць міністрам меў дачыненьне да зьнішчэньня палітычных апанэнтаў. Тое самае вынікае з рапарту генэрал-маёра міліцыі Мікалая Лапаціка.

## Сьвяты Паўлічэнка

Падпалкоўнік Дзьмітры Паўлічэнка атрымаў ордэн Расейскай праваслаўнай царквы сьвятога роўнаапостальнага князя Ўладзімера трэцяй ступені — за актыўны ўдзел у будаўніцтве храму на тэрыторыі вайсковай часткі, камандзірам якой ён зьяўляецца. За Паўлічэнку перад Алексіем ІІ хадайнічаў асабіста мітрапаліт Філарэт. Праваабаронцы вінавацяць падп. Паўлічэнку ў датычнасьці да ліквідацыі палітычных апанэнтаў рэжыму ў 1999—2000.

## Маккейн не атрымаў візы

Чатыры амэрыканскія сэнатары, сярод якіх Джон Маккэйн, ініцыятар «Акту аб дэмакратыі ў Беларусі», не атрымалі беларускіх візаў. МЗС заяўляе, што кіраўніцтва краіны не задаволілі прапанаваныя тэрміны візыту.

**МБ, радыё «Свабода»**

# Алімпіяда ў эпоху тэрарызму

**13 жніўня, у пятніцу, у Атэнах адкрыюцца XXVIII Летнія алімпійскія гульні. БТ паабяцала паказаць 190 гадзін спорту, па 11—12 гадзін у суткі. Беларускі дэсант у Грэцыі складаецца са 152 спартоўцаў, якія будуць весьці барацьбу ў 23 відах спорту. Сьвет баіцца крывавых тэрактаў і адначасова зь нецярпеньнем чакае відовішча.**

Найбольш прадстаўнічая дэлегацыя — у лёгкай атлетыцы. Прычым з 43 спартоўцаў-лёгкаатлетаў 17 складаюць кідальнікі і штурхальнікі. Галоўныя нашы надзеі на мэдалі зьвязаныя з гэтымі невідовішчнымі дысцыплінамі. Увага будзе прыкавана да штурхальнікаў ядра Андрэя Міхневіча, Надзеі Астапчук, Натальлі Харанекі, кідальнікаў дыска Васіля Капцюха і Ірыны Ятчанкі, молата — Івана Ціхана. Спадзяёмся, што «стрэляць» у кіданьні молата Ігар Астапковіч і Вадзім Дзевятоўскі, а таксама паўторыць «залаты» посьпех Сыднэю-2000 у кіданьні дыска капітан беларускай алімпійскай зборнай Эліна Зьверава.

Лічыцца, што два мэдалі «жалезна» чакаюць беларусаў у роварным спорце. Галоўная наша зорка — пяціразовая чэмпіёнка сьвету Натальля Цылінская. Беларускі «Прессбол» прадказвае ёй золата ў гіце на 500 мэтраў. А пару тыдняў таму «Спорт-экспресс» у якасьці прэтэндэнтак на «золата» ў спрынце назваў нашу Натальлю і расіянку Сьвятлану Гранкоўскую. Інтрыгі двубою надае той факт, што Цылінскую і Гранкоўскую трэніруе адзін чалавек — расіянін Станіслаў Салаўёў.

«Беларускім» відам спорту зьяўляецца і цяжкая атлетыка. Тут найбольшыя шанцы маюць Віталь Дзербянёў (56 кг), Сяргей Лаўрэнаў (69 кг), Аляксандар Анішчанка (85 кг) ды Ганна Бацюшка (63 кг), што ўварвалася ў сусьветную эліту пасьля сэнсацыйнага выступу ў мінулым лістападзе на чэмпіянаце сьвету ў Ванкувэры.

Пазмагаюцца за мэдалі майстры грэка-рымскай барацьбы Аляксандар Кікінёў (74 кг) і Вячаслаў Макаранка (84 кг). А Сяргей Ліштван (97 кг) некалькі тыдняў таму на прэс-канфэрэнцыі паабяцаў прывезьці з Атэнаў золата. У вольнай барацьбе някепскія шанцы, прынамсі, на срэбра ў Мурада Гайдарава (74 кг).

Па трэцяе алімпійскае золата паплыве Кацярына Карстэн-Хадатовіч (акадэмічнае веславаньне). Спадзяюцца на мэдаль у веславаньні і мужчынская чацьвёрка, жаночая двойка (Юлія Бічык і Натальля Гелах). Выдатныя вынікі паказвала апошнім часам пара байдарачнікаў Раман Петрушэнка і Вадзім Махнёў, а таксама канаіст Аляксандар Жукоўскі.

У плаваньні будзем хварэць за Алену Попчанку, Ганну Шчэрбу і Сьвятлану Хахлову. Праўда, на чэмпіянаце Эўропы ў Мадрыдзе ў траўні беларусы выступілі няўдала (Попчанка нагул засталася па-за п'едэсталам).

Незалежна ад вынікаў прыемна глядзець мастацкую гімнастыку. Беларускі. У асабістым першынстве ў нас ёсьць свая зорачка — Іна Жукава. Праўда, пасунуць зь першага месца Аліну Кабаеву будзе складана.

Пазмагаюцца таксама за мэдалі беларускія батутысты, стралкі Юры Шчарбацэвіч, Сяргей Мартынаў і прызэр алімпіяд-88, -96 і -2000 Ігар Басінскі.

У настольным тэнісе наша галоўная надзея — Уладзімер Самсонаў. Прынамсі, хацелася б, каб ён прабіўся як мінімум у паўфінал.

Што да «вялікага тэнісу», то ёсьць шанец, што ў парным разрадзе дуэт Макса Мірнага і Ўладзімера Ваўчкова паўторыць посьпех Кубку Дэвіса.

«Беларускім» відам была да нядаўняга часу спартовая гімнастыка. Але з прычыны правалу ў мінулым жніўні на чэмпіянаце сьвету ў Анагайме ў Атэны паехалі толькі тры гімнасты — Іван Іванкоў, Дзяніс Савянкоў, Юля Тарасенка. Найбольшыя шанцы Іванкова — на пераКладзіне і кольцах. Дзяніс Савянкоў моцны ў вольных практыкаваньнях.

Магчыма, мэдалі заваюе той, каго не згадалі ў гэтым артыкуле. Ці застануцца без мэдалёў некаторыя зь пералічаных атлетаў. Спартоўцы — звычайныя людзі, і выступ залежыць ад безьлічы фактараў. Проста пажадаем нашым посьпехаў!

**Алег Раявец**



**Перад Алімпіядай: цэнтар Атэнаў хаваюць пад банэрамі з выявамі антычных помнікаў.**

# Апазыцыю штурхаюць да байкоту

**Працяг са старонкі 1.**

дзе вылучаецца Сяргей Салаш (ПБНФ). Сяброўку ініцыятыўнай групы Салаша пэнсіянэрку Тамару Садчанку зьмусілі пісьмова адмовіцца ад удзелу ў групе. Пазьней жанчына напісала ў акруговую камісію новую заяву, у якой указала на ціск з боку выбарчай камісіі й пацьвердзіла сваё жаданьне быць у ініцыятыўнай групе. Да яшчэ адной удзельніцы групы, Галіны Башковай, прадстаўнік выбарчай камісіі й кіраўнік яе прадпрыемства прыехалі на лецішча й прымусілі падпісаць заяву аб выхадзе з групы, пагразіўшы не працягваць кантракту. Гэтыя заявы далі акруговай выбарчай камісіі падставу не рэгістраваць групу. Салаш, каб не губляць час, падаў для рэгістрацыі новы сьпіс ініцыятыўнай групы. У яе ўвайшлі толькі 15 чалавек (у першай было 80), на якіх вэрталькашчыкам уплываць цяжэй.

Лідэр ПКБ Сяргей Калякін балятуецца ў Гомельскай-Навабеліцкай акрузе. У Менску па месцы жыхарства вылучаюцца Вінцук Вячорка (Зялёны Луг) і Анатоль Лябедзька (Сухарава). Зрэшты, А.Лябедзька не выключае, што можа адправіцца выбірацца ў Гарадзенскую вобласьць, «калі будзе рашэньне партыі». У Сэрабранцы маюць балятавацца кіраўнік Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў і іншы лідэр АГП Аляксандар Дабравольскі. Па сваёй старой акрузе ідзе Станіслаў Шушкевіч. Валер Фралоў зьбіраецца балятавацца ў Фрунзэнскім раёне сталіцы, У.Парфяновіч — у Кастрычніцкім раёне, Сяргей Скрабец — у Лідзе.

**Аркадзь Шанскі**

АПЫТАНЬНЕ «НН»

# ці Абхазію?

стаўнікоў **Іван Пашкевіч**. «Я была ў Грузіі падчас парлямэнцкіх выбараў і адчула тую атмасфэру знутры. Грузінскі народ зьвязвае свае спадзяваньні асабіста з палітыкай Саакашвілі. Адна зь ягоных стратэгічных мэтаў — сабраць усе землі і аднавіць цэласнасьць рэспублікі. Адно, што мне не даспадобы, — гэта залішне жорсткія захады грузінскага ўраду ў дачыненьні да Абхазіі, якая, па сутнасьці, зьяўляецца разьменнай манэтай у расейскай гульні. Трэба зазначыць, што Расея праводзіць даволі дэструктыўную палітыку ў дачыненьні да Грузіі, што выразна відаць на прыкладзе абхаскай праблемы», — кажа лідэрка АГП **Людміла Гразнова**. З асуджэньнем імпэрскіх настрояў Расеі выступае каардынатар «Хартыі'97» **Андрэй Саньнікаў**. На яго думку, расейскае ўмяшальніцтва ў грузінскую палітыку значна ўскладніць канфлікт і яшчэ болей зацягне яго. «Народ, які спадзяецца, што яго заступнікам будзе Масква, робіць вялікую памылку», — засьцерагае старшыня БНФ **Вінцук Вячорка**.

Менш радыкальна настроены лідэр камуністаў **Сяргей Калякін**: «Я найперш на баку людзей, што жывуць і ў Грузіі, і ў Абхазіі, таму, мяркую, сілавым шляхам такое пытаньне вырашаць ня трэба, бо адбіваецца гэта найперш на простым народзе. Выйсьце — сабраць за сталом перамоў і намагацца ўлічыць інтарэсы абедзьвюх краін».

А вось **Станіслаў Шушкевіч** ня бачыць падстаў уцягваць Абхазію ў склад Грузіі: «Працуючы яшчэ за савецкімі часамі ў Грузіі, я зразумеў, што гэта даволі штучнае ўтварэньне, грузінскі ўрад намагаецца аб'яднаць вакол сябе тое, што не аб'ядноўвалася, а Расея цяпер выкарыстоўвае гэтую штучнасьць. Выйсьце бачу толькі ў тым, каб правесьці ў Абхазіі нармальны рэфэрэндум, каб высьветліць, чаго, уласна, жадаюць самі абхазцы». «Гэтая сытуацыя папросту ня мае аптымальнага рашэньня. З аднаго боку, натуральна, абхазкі народ мае права на самавызначэньне, аднак і Грузія мусіць быць тэрытарыяльна цэласнай дзяржавай, таму, каб улічыць інтарэсы абедзьвюх краін, варта зацьвердзіць аўтаномнасьць Абхазіі ў складзе Грузіі», — мяркуе лідэр БСДП (НГ) **Мікола Статкевіч**.

**Сяргей Будкін**

# Правілы граматыкі

Віталь Тарас



Студэнты ЭГУ засталіся сам-насам з рэчаіснасьцю, якой яны не хацелі заўважаць. Самы радыкальны крок, на які яны наважыліся, — гэта напісаць ліст прэзыдэнту. Дзе карані пасіўнасьці?

Здымак, на якім студэнты Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту на Кастрычніцкай плошчы ў Менску седзячы пратэстуюць супраць закрыцьця навучальнай установы, выклікае супярэчлівыя пачуцьці. Студэнты сядзяць на адлегласьці адзін ад аднаго, нібы ў мэдытацыі. Яны пратэстуюць як бы кожны паасобку, кожны сам за сябе. Ці можна ўявіць сабе больш сымбалічную для сучаснай Беларусі і больш неймаверную для Эўропы карціну?

Ня памятаю, як звалі таго хлопца зь Белдзяржунівэрсытэту. Перад тым як перайсьці вучыцца зь біяфаку на іншы факультэт, я воляю абставінаў апынуўся на кароткі час на курсе, які перад тым ужо скончыў, — сярод маладзейшых за мяне і зусім незнаёмых мне студэнтаў. Аднаго зь іх я запомніў надоўга — вось толькі імя ніяк ня ўспомню…

У той час ва ўсіх савецкіх вышэйшых навучальных установах, не выключаючы й біяфак БДУ, абавязковым прадметам была гісторыя КПСС. Своеасаблівасьць гэтай навучальнай дысцыпліны, таксама як і навуковага камунізму альбо, напрыклад, палітэканоміі сацыялізму, палягала ў тым, што веданьне прадмету, у прынцыпе, не было абавязковым. Цяперашні падручнік дзяржаўнай ідэалёгіі, дарэчы, у сэнсе мэтадалёгіі мала чым адрозьніваецца ад колішніх фаліянтаў, што выходзілі пад рэдакцыяй кандыдата ў члены палітбюро акадэміка Панамарова. Зьмест гэтага й падобнага падручнікаў гісторыі й грамадазнаўства наагул цяжка назваць ведамі. Але ня ў тым справа. Куды важнейшымі за лекцыі ды іспыты ў інстытуце былі тады так званыя сэмінары. Сэнс іх заключаўся ня ў тым, каб студэнты працавалі зь «першакрыніцамі» («першакрыніцамі» называліся зусім не дакумэнты, а толькі й выключна кананічныя тэксты з кананічнага збору твораў У.І.Леніна), а ў тым, каб студэнты ўздельнічалі ў «дыскусіі» на зададзеную падручнікам ды выкладчыкам тэму і тым самым дакумэнтальна, з дапамогай адзнак і залікаў, публічна пацьвярджалі сваю ляяльнасьць камуністычнаму рэжыму. Іншымі словамі, студэнты паказвалі, што яны гатовыя прыняць правілы гульні й фактычна разам з выкладчыкамі ўжо ўдзельнічаюць у ёй.

Гэта здавалася настолькі натуральным, што, сутыкнуўшыся з адрознымі паводзінамі, я, таксама як і іншыя студэнты, аслупянеў у жаху й чаканьні імгненнага й балючага пакараньня з боку сыстэмы…

Тэмай чарговага сэмінару па гісторыі КПСС была пастанова партыі ці то аб павелічэньні ўраджайнасьці зерневых культур ва ўмовах крайняй Поўначы, ці то аб узмацненьні ідэалягічнай работы сярод мэханізатараў на машынна-трактарных станцыях. Усе студэнты адказвалі нешта дзяжурна-няўцямнае на пытаньне выкладчыка аб значэньні гэтага дакумэнту. Выкладчык быў нездаволены пасіўнасьцю аўдыторыі і ў пошуках ахвяры зьвярнуўся да аднаго хлопца, які дагэтуль адмоўчваўся: а што вы думаеце пра значэньне гэтай пастановы, малады чалавек? Малады чалавек, зь якім выкладчык, мяркуючы з усяго, датуль быў незнаёмы, адказаў ахвотна і не раздумваючы. На яго думку, згаданую пастанову найлепш было б адразу выкінуць у сьметніцу — таксама, дарэчы, як і ўсе іншыя паперкі, якія РКП (б) — ВКП (б) — КПСС напладзіла за часы свайго існаваньня. Таму што, працягваў студэнт, гэтая пастанова, як і ўсе астатнія, што выходзілі да гэтага і працягвалі выходзіць пасьля, ня мела нічога агульнага з рэальнасьцю і рабочаму клясу, як і сялянству, ад гэтых пастаноў было ні горача і ні холадна. Насамрэч у лягерах зэкам было і горача, і холадна, і галодна, але вось пра гэта ў пастановах і ня згадвалася…

Пакуль студэнт гаварыў, астатнія нэрвова пырскалі ў кулак, давячыся калектыўным прыступам гістэрычнага сьмеху. А калі ён скончыў, аўдыторыяй раптам апанавала ціша. Хто ўтаропіўся ў падручнік, хто ў канспэкт, хто проста глядзеў сабе пад ногі, баючыся зірнуць на студэнта й выкладчыка, які меў неасьцярожнасьць да яго зьвярнуцца. Але, як я ўжо казаў, нічога ня здарылася. Выкладчык проста пераключыў увагу на іншага студэнта, як бы і не пачуўшы дзёркага адказу. Як я потым давedаўся, гэты хлопец ня быў дысыдэнтам або ненармальным. Ён проста рана застаўся сіратою, вымушаны быў сам зарабляць на жыцьцё. І хаця вучыўся на дзённым факультэце, начамі разгружаў вагоны на вакзале. Пры гэтым хлопец ня толькі меў характар і мог пастаяць за сябе, але быў, відаць, здольным студэнтам. Прынамсі, у дэканаце на яго «подзьвігі» стараліся глядзець праз пальцы. Гісторыя КПСС проста не ўваходзіла ў кола яго інтарэсаў, яму шкада было часу на бязглуздзіцу, і сваімі нестандартнымі адказамі ён надоўга адбіваў ахвоту ў выкладчыкаў-марксістаў чапляцца да яго зь недарэчнымі пытаньнямі.

Я далёкі ад думкі назваць таго хлопца героем свайго часу. Мяне цікавяць цяпер не яго паводзіны, у якіх маглі быць самыя розныя матывы й тлумачэньні, а паводзіны астатніх студэнтаў. Самай галоўнай заваёвай бальшавікоў, якой яны могуць ганарыцца дагэтуль, стала стварэньне новага чалавека. Прынамсі, яны здолелі вырасьціць тып студэнта, якога няма, бадай, больш нідзе ў сьвеце, — студэнта, які ня ўмее, ня хоча і нізавошта ня будзе дзейнічаць або думаць самастойна. Незалежныя паводзіны, незалежны погляд на рэчы, як можна пераканацца на прыкладзе таго студэнта, пачалі ўспрымацца як нешта ненармальнае — як быццам чалавек раптам публічна агаліў зад. Студэнцтва, якое ва ўсім сьвеце зьяўляецца асяродкам вольнасьці, радыкалізму й нежаданьня кіравацца агульнапрынятымі стандартамі, у Савецкім Саюзе стала ледзьве ня самай кансэрватыўнай часткай грамадзтва.

Прычым размова тут не пра погляды самі па сабе. Студэнты, якія рабілі культурную рэвалюцыю ў Кітаі, студэнты, якія будавалі барыкады ў Парыжы ў 68-м годзе, студэнты, з асяродку якіх выйшаў Ян Палах, што скончыў жыцьцё самаспаленьнем на знак пратэсту супраць уварваньня савецкіх войскаў у Чэхаславаччыну, і студэнты, якія пэрыядычна б'юцца насьмерць з паліцыяй ва ўнівэрсытэтах Паўднёвай Карэі, адрозьніваюцца і мэнтальна, і паводле перакананьняў. Сярод парыскіх студэнтаў, дарэчы, былі і мааісты, і анархісты, і «новыя левыя», і сытуацыяністы, і шмат хто яшчэ. Больш за тое, унукі хунвэйбінаў праз дваццаць гадоў пасьля «культурнай рэвалюцыі» выйшлі на плошчу Цяньаньмэнь. Пачаўшы з чыста камуністычных лёзунгаў накшталт «дэмакратычнага цэнтралізму», яны за некалькі тыдняў процістаяньня з уладамі лягічна дайшлі да разуменьня неабходнасьці простай дэмакратыі, за што і былі расстраляныя ды размазаныя танкамі.

Так, радыкальная сіла можа быць і разбуральнай, аб чым сьведчыць тая ж культурная рэвалюцыя. Наўрад ці студэнцтва ўвогуле можа быць самастойнай сілай, інтэлектуальным авангардам грамадзтва, як марылі Гербэрт Маркузэ й малады Даніэль Кон-Бэндыт (пазьней прызнаны адным з выдатных француcкіх філёзафаў сучаснасьці). Але яно, студэнцтва, здольнае на праявы сапраўднай салідарнасьці й самаахвярнасьці. Нездарма самым славутым лёзунгам 68-га стала «Будзьма рэалістамі — патрабуйма немагчымага!».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Але студэнцтва ў наш час можа быць таксама інфантыльным, несамастойным, нерашучым і проста баязьлівым. Калі навучэнцы Беларускага гуманітарнага ліцэю на чале са сваім дырэктарам, разам з бацькамі й некаторымі выкладчыкамі спрабавалі адстаяць у пікетах права на існаваньне ўнікальнай навучальнай установы, ніхто са студэнтаў ЭГУ нават не паглядзеў у бок ліцэістаў. Потым недзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы пачалі пазбаўляць ліцэнзій паступова, па адной. Ніхто са студэнтаў іншых ВНУ не выходзіў на акцыі пратэсту, не падтрымліваў таварышаў. У выніку студэнты ЭГУ засталіся сам-насам з рэчаіснасьцю, якой яны не хацелі заўважаць. Самы радыкальны крок, на які яны наважыліся, — гэта напісаць ліст прэзыдэнту.

Мне давялося размаўляць з адной студэнткай чацьвёртага курсу — яна абуралася паводзінамі рэктара Міхайлава, дзеяньнямі адміністрацыі, якія пайшлі на канфрантацыю з уладамі, празьмерна палітызавалі сытуацыю, ускладалі марныя спадзяваньні на заходніх спонсараў замест таго, каб ціха дамаўляцца зь Міністэрствам адукацыі. Безумоўна, такі пункт гледжаньня мае права на існаваньне. Мабыць, у гэтых развагах ёсьць свая рацыя… Але чуць такія развагі з вуснаў дваццацігадовай дзяўчыны было трохі дзіўна. Хацелася спытаць — няўжо ў гэтым унівэрсытэце ніхто й ніколі не расказваў студэнтам пра тое, што свае правы трэба таксама вучыцца адстойваць?

Было б недарэчна ва ўсім вінаваціць студэнтаў. Хацелася б зразумець прычыну іх безабароннасьці ці адмовы ад барацьбы. Магчыма, гэтая пасіўнасьць сфармавалася дзесяцігодзьдзямі грэблівага стаўленьня да інтэлектуальнай працы ўвогуле, стаўленьня да інтэлігенцыі як да «слуг народу»? Навучаньне ў інстытуце дагэтуль успрымаецца немалой часткай грамадзтва як спосаб «адкасіць» ад службы ў войску, як свайго роду халява, нежаданьне цяжка працаваць альбо ў крайнім выпадку — як прывілея, магчымасьць зьехаць за мяжу. У Беларусі веды й талент па-ранейшаму не ў пашане. Здольнасьці ня маюць значэньня — мае значэньне, як і паўвека таму, сацыяльнае паходжаньне. Калі ты зь вёскі, дык і патрабаваньні да цябе ніжэйшыя. І ніхто не задумваецца, што гэткі клопат дзяржавы прыніжае ня толькі гараджан, але й вяскоўцаў.

Прадаўжальнікі савецкай сыстэмы адукацыі — розная кшталту прапагандысты ды ідэолягі, узрошчаныя на падручніках гісторыі КПСС, — працягваюць сеяць неразумнае, ндобрае і нявечнае. Між тым, ёсьць унівэрсальнае правіла граматыкі, сфармуляванае невядомым актывістам студэнцкага руху ў Парыжы ў траўні 1968-га:

«Я маўчу — ты маўчыш — ён, яна маўчыць — мы маўчым — яны сьвяткуюць перамогу.

Я пратэстую — ты пратэстуеш — ён, яна пратэстуе — мы пратэстуем — яны церпяць паразу».



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Паломніцкая дэлегацыя з 150 амэрыканскіх рабінаў на чале з Пэйсахам Кроўнам тры дні гасьцявала ў Беларусі. Яны наведалі свае рэлігійныя сьвятыні ў Радуні (Гарадзеншчына), Валожыне і Міры. Юдэйскае рэлігійнае аб’яднаньне (ЮРА), якое арганізоўвала гэтую паездку, ладзіць падобныя паломніцтвы для замежнікаў ужо трэці год. Але, як сказаў старшыня арганізацыі Юры Дорн, упершыню нашую краіну наведала такая шматлікая дэлегацыя. Звычайна за год у Беларусі бывае каля 3000 паломнікаў. Паломнікі-юдэі едуць у Беларусь, каб паглядзець сынагогі й ешыботы, праслаўленыя ў гісторыі. Так, Валожынскі ешыбот, заснаваны ў 1806 г., лічыўся «маткай» усіх падобных школаў Усходняй Эўропы. Яшчэ адна юдэйская сьвятыня ў Беларусі — магілы габрэйскіх мудрацоў: рабіны наведалі магілы Хафец Хаіма ў Радуні і заснавальніка Валожынскага ешыботу Хаіма Валожынера.**
**На думку Ю.Дорна, Беларусь магла б стаць магутным цэнтрам юдэйскага паломніцтва. Перашкоды для гэтага стварае толькі сама Беларусь — дарагія візы (100 даляраў для грамадзянаў ЗША) і складаны парадак пераезду мяжы: група рабінаў, у якой былі й маленькія дзеці, у сьпёку пяць з паловаў гадзінаў афармляла дакумэнты на мяжы. Вось таму ў суседнюю Літву палігрымаў-юдэяў сёньня едзе ў 4 разы болей, чым да нас.**



# Ельнікі пад пагрозай

Галоўнай праблемай лясной гаспадаркі Аршаншчыны апошнім часам сталі жукі-карааеды, якія паразытуюць на ельніках. Пры канцы 1980-х рост іхняй папуляцыі быў заўважаны ў Нямеччыне ды Польшчы. Цяпер гэтая пошасьць апанавала і беларускія лясы. На адно дрэва можа засяліцца да 10 тыс. насякомых. У выніку назіраецца масавае засыханьне елак.

У аршанскім лясьніцтве ельнікі займаюць плошчу ў 23 га, або 35% лесанасаджэньняў. За апошнія 8 гадоў ужо высечана дзясятая частка ельнікаў. Дарэчы, яшчэ ў 90-х у тэхнікумах лясной гаспадаркі не было спэцыяльнага курсу па барацьбе з карааедамі. Таму працаўнікам лесу даводзіцца ўсё пазнаваць на ўласным вопыце. Супраць шкоднікаў вывешваюцца пасткі-пакеты са спэцыяльнымі фэрмэнтамі, у якія за 10 дзён трапляюць да 5 тыс. насякомых. Выкарыстоўваецца і так званая лоўчая драўніна, якая потым вывозіцца на пераапрацоўку. Клапоцяцца лесаводы і пра карысных птушак ды мурашак, якія дапамагаюць чалавеку ў барацьбе са шкоднікамі. Толькі дзякуючы цэламу комплексу антыкараедавых мерапрыемстваў можна выратаваць нашы хваёвыя лясы.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## Аб’язная ў Берасьці

Новую дарогу ў аб’езд гораду збудуюць у Берасьці. Яна пройдзе між Кавалёўкай і Мухаўцом ды злучыць варшаўскую шашу з маскоўскай.

**Андрэй Карнялюк, Берасьце**

## Пад зубром

Сэрвісна-забаўляльны комплекс зьбіраюцца пабудаваць баранавіцкія ўлады каля вялізнай фігуры зубра, якую паставілі летась перад дажынкамі на мяжы Баранавіцкага раёну.

Пакуль 25-мэтровы зубр стаіць адзінцом каля магістралі Берасьце—Масква. Плянуецца, што потым побач зь ім «вырастуць» запраўка, гатэль, рэстаран і СТА.

Усё нішто, ды ёсьць адна праблема: у выканкаме няма грошай, каб гэта ажыцьцявіць, таму ўлады шукаюць інвэстараў, якія і абудуюць лясного волата.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Вяртаньне перакладчыка

У Полацак вярнуўся адзіны ў краіне перакладчык з вугорскай на беларускую Мікола Ермалаеў, які два гады таму выехаў зь сям’ёй на стала ў Нямеччыну. На чужыне Ермалаевы не прыжыліся, вярнуліся зь сямімесячным сынам Янам. Старэйшы сын Ермалаевых цяпер служыць у войску. М.Ермалаеў перакладае таксама зь нямецкай.

**ВК, Полацак**

## Сучасныя абразы

Мастачка з Маладэчна Ядвіга Сянько, аўтарка болей чым 400 палотнаў на біблійныя тэмы, адкрыла сваю выставу ў Слуцкім краязнаўчым музэі, прэзэнтаваўшы 36 абразоў. Раней яе пэрсанальныя выставы прайшлі ў Валожыне, Ашмяне і Смургонях. Абразы мастачкі можна ўбачыць як у праваслаўных, так і ў каталіцкіх храмах.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

# Віно з «Баторыі»

летнія зацемкі зь берагоў Гараднічанкі

Раптам алень, алень нашага дарагога і сьвятога Губэрта, ускочыў на камяніцу гарадзкой улады. Прыемная навіна на пачатак лета. Доўга пуставала месца, занятае калісьці «Славай КПСС». Лепей позна, як ніколі, — напраўду. І на Днях культуры ва Ўроцлаве лунаў наш гарадзкі — сіні і менавіта з аленем сьцяг, а не чырвона-зялёная памяць аб здохлай імпэрыі.

Гадамі мы патрыятычна скрыгаталі зубамі: бальшавікі наламалі дроў у Старым горадзе, панаставілялі хрушчовак, Швайцарскую даліну ўздоўж Гараднічанкі ператварылі ў якуюсьці тайгу, а рачулку — у каналізацыйны сьцёк. Пачуты праклёны, зьдзейсьнены мары! Масткі, міні-вадаспады, выбрукаваныя сьцяжыны і аглядныя пляцоўкі з парэнчамі. Усё як мае быць.

Сьпяшаліся айцы гораду і нашай 200-гадовай губэрні да «сьвята народаў Беларусі». Такі міні-СССР. Шмат народаў, і з кожным фэстам усё больш. Імёны іх вядомыя! Карэйцы, нашчадкі Гамэра і Пэрыкла, розныя джыгіты і самы новы беларускі народ — казакі. Так на вачах ствараюцца шчасьлівыя краіны дружбы народаў. Усё айцы выбрукавалі, каб зручна было танчыць лезгінку, сіртакі і кракавяк. І цыганачку, само сабой.

Адна непрыемнасьць: ніколі не прыязджаюць айцы рэспублікі маёй на сьвята дружбы сваіх народаў. Праўда, заўсёды прысылаюць тэлеграму-маланку: «паздраўляем зпт нашы дружныя народы з бальшой пабедай ітд тчк». У нас усё цяпер толькі з нагоды вялікай перамогі. Піва сабраліся папіць, пагатоў гарэлкі, ці ў даміно згуляць — абавязкова з нагоды перамогі.

А сьвяточная калёна дружных народаў? Незабыўнае відовішча. Раней перад маўзалеем нябожчыка праходзілі ў фальклёрных шатах, танчылі і сьпявалі. Цяпер у нас ходзяць. Нечакана самая доўгая частка калёны — палякі, быццам найбольшы з народаў рэспублікі. Беларусы несьлі птушку бусла. Неспадзявана ў беларускай калёне крочыў міліцэйскі ўзвод (???). Ат, паліцэйская краіна. Аказалася, што не — гэта ўзвод школьнікаў, закаханых у правапарадак.

А колькі было нагаворана пра вялікую перамогу, мікрафон амаль сапсаваўся! А потым па камандзе як кінуцца нацмены да вялікага зялёнага танка на пастамэнце. Наперадзе немцы ў баварскіх адзеньнях, габрэі ды іншыя. Удзячныя народы дзякуюць свайму танку, ускладаючы да яго гусеніц букеты і кашы з кветкамі. Цырк на дроце, дый годзе.

Яшчэ ў нас манумэнт адкрылі з нагоды заканчэньня пакту Молатава—Рыбэнтропа. Сто тонаў граніту, дзясяткі тонаў бронзы. Лес слупоў з нашараваным гербам СССР — помнік савецкім заставам на тэрыторыі сучаснай Польшчы, дзе яны апынуліся амаль пад самай Варшавай дзякуючы ўсё тым жа наркаму Молатаву і ягонаму нямецкаму калегу. Натуральна, што польскага вайсковага аташэ не запрасілі. Між іншым, на месцы манумэнту раней штогод выступаў вандроўны цырк.

Апрач слупоў ёсьць яшчэ «пагранцы», як іх гарадзенцы на трасянцы называюць. Галовы з разяўленымі ратамі і са стрэльбамі ў руках. Адно сабакі няма. А які ж пагранец без сабакі? У дзень адкрыцьця зьвілася чутка, якая ператварылася ў показку: сабака быў, але яго валацугі адламілі і здалі ў лом. Бадай, цяпер гэта будзе ўлюбёны помнік жыхароў, бо мае сваю легенду.

Зубра ў нас вельмі баяцца ў горадзе і вершаў. Напісалі маладзёны слова «Зубр» на сьцяне, і адразу — суд, выключэньне з унівэрсытэту. Страшнае слова. Амаль як NATO. А за верш сядзіць чалавек у турэмнай камэры чацьвёрты месяц! Маўляў, абразіў важную асобу. Верш сьмешны. Сьледчыя, мабыць, рагочуць, чытаючы. Але справу «шыюць». Напэўна, гульня ў голага караля працягнецца і на судзе, бо ня будзе ж судзьдзя вымаўляць уголас тое, што там напісана.

Зьедзеш на некалькі дзён за калючы дрот, падыхаеш вольным паветрам, прыедзеш, а ў «яшчыку» — «рыэліці-шоў». Гадзінамі паказвае «бальшую сьцірку». У «прачачнайдурачачнай» усіх на пральнай дошцы адмываюць, у пераносным, зрэшты, сэнсе. Карацей, прапясочваюць. Ажно карціць засьпяваць колішні шлягер: «Я другой такой страны ня знаю, гдзе так вольна дышыць чалавек...»

Існуе ў горадзе крама «Баторыя». Дарэчы, на вуліцы караля Стэфана Баторыя, побач зь ягоным колішнім палацам. Шмат у ёй віна, гарэлкі, піва і чарніла. Днямі ўбачыў я шыльдачку: наліваем віно ў плястыкавыя бутэлькі. Не паверыў я, але пацікавіўся: чаму цана не кусаецца? А яна, прадаўшчыца, паказвае на вялікія мэталёвыя бочкі — кегі, здаецца, называюцца. І як ваша «кадарка»? А мы яе ня п’ём: пацяплела — і віно бурболіць…

Ах, кароль! Што б ён на гэта сказаў? Калі ён памёр, у склепе нявыпітым засталося мноства віна, але ў бочках дубовых. Панавала марозная зіма. Ад караля засталося віно, магчыма, таксама «кадарка». Але гэта было каралеўскае віно.

**Сяргей Максімовіч, Горадня**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# «Васіль Быкаў. Вяртаньне»

Рана ці позна хаосу і расчараваньню прыходзіць канец. І абвяржэньнем расхожай фразы «ў беларусаў свайго кінэматографу няма» рана ці позна зьяўляецца кіно.

**Наша грамадзянская дакумэнталістыка апошніх дзесяці гадоў распавядала альбо пра рэчы прыватныя, альбо кпіла з рэчаіснасьці, або малявала яе мусова цёмнымі фарбамі. Згадваецца, як аўтары пачыналі расповед пра Беларусь сцэнамі разбору сьвіной тушы на Камароўскім рынку ці шабасам сатаністаў, якія ўкрыжоўваюць сабаку. І цалкам можна было зразумець стваральнікаў такіх фільмаў — сапраўды ж дастала. Але такі настрой, такія ілюстрацыі рэжысэрскай роспачы ніяк не спрыялі ані роздуму, ані хоць якому прасьвятленьню наперадзе. Словам, даўно хацелася пабачыць кіно яснае і разумнае, у якім не было б гэтага рэжысэрскага «дастала». І такое кіно зьявілася. Дзякуючы аўтару Віктару Корзуну, дзякуючы магічнаму зьбегу абставінаў, а найперш дзякуючы Васілю Быкаву. Галоўным героем фільму стаў наш народ.**

**Народ таксама можна паказваць па-рознаму. Можна выбіраць у вулічным натоўпе сінюшныя твары бамжоў ці якіх недарэкаў і калі пры гэтым за кадрам гаварыць пра Беларусь, ва ўяўленьні гледача гэта і будзе Беларусь — сінюшная, страшная. У фільме В.Корзуна мы бачым цалкам адваротную карціну.**

**Аўтар абраў надзвычай рызыкоўны прыём: на працягу чвэрці гадзіны мы бачым на экране пахавальную працэсію — тое, што звычайна не эстэтызуецца, не ператвараецца ў мастацтва. І каб паказаць пахаваньне як мастацтва, патрэбнае далікатнае, карэктнае абыходжаньне з матэрыялам. Рэжысэру гэта ўдалося, бо ён не спыняе ўвагі на знаках сьмерці. Камэра плыве паўзь людзкое мора, што расьцягнулася бясконцай чаргой да Быкава. На экране — тысячы твараў, на якіх у гэтую хвіліну адбілася самае лепшае, што ёсьць у чалавечай душы. Адно глядзеньне на гэтыя твары заварожвае. Гэтаксама заварожвае голас Быкава за кадрам.**

**Аўтар не гвалтуе матэрыял і не дазваляе публіцыстыцы разбурыць настрой — самае важнае ў гэтым творы. Агульны настрой, якім апанаваныя тысячы тваіх суайчыньнікаў і які адразу й напоўніцу перадаецца табе. На зьмену хаосу і расчараваньню прыходзяць надзея і пэўнасьць у тым, ува што верыш.**

**Сяргей Дубавец**


PHOTO.BYMEDIA.NET



## Васіль Быкаў у фільме «Вяртаньне»:

«Чалавек, як і кожная жывая істота ад Бога, нараджаецца свабодным. Ад нараджэньня закладваецца ў чалавека інстынкт свабоды. Менавіта ў стане свабоды чалавек можа з найбольшым эфэктам рэалізаваць сябе як боскае стварэньне, па-першае, і, па-другое, як грамадзкае стварэньне».

«Нацыі або грамадзтвы свабодныя жывуць добраўпарадкавана, багата. А нацыі несвабодныя заўсёды жывуць бедна. Распаўсюджанае такое меркаваньне, што ў стане закабаленьня, заняволеньня чалавек можа даць больш. Мы гэта бачым на прыкладзе нашай найноўшай гісторыі — з нацысцкага рэжыму або камуністычнага, калі з чалавека выціскалі ўсё, што толькі можна, і гэтага было недастаткова. І толькі ў самы апошні час стала зразумела, што тыранія або закабаленьне — гэта ня самы прадуктыўны мэтад жыцьця, што ёсьць прыклады Захаду, калі ў стане свабоды чалавек і грамадзтва могуць даць куды болей для цяперашняга свайго існаваньня, а таксама для будучыні».

«Для таго каб дамагчыся свабоды, трэба перш за ўсё дамагчыся дзяржаўнасьці, а для таго каб дамагчыся дзяржаўнасьці, трэба ўсьвядоміць сябе нацыяй, асобнай нацыяй. А гэта немагчыма без устойлівай, выхаванай нацыянальнай самасьвядомасьці. Усё вельмі цесна зьвязана. Таталітарныя сілы гэта выдатна разумеюць і пачынаюць з ключавога моманту — яны адмаўляюць нацыі ў яе асобнасьці. Беларусам кажуць — вы частка расейскай нацыі. З гэтага ўсё пачынаецца. Ствараюцца перадумовы існаваньня гэтай часткі менавіта як часткі іншай нацыі, а ня цэлага... Бо ўсьведамленьне сябе асобнай цэлай нацыяй разбурае імпэрскую ідэю. У аснове гэтага працэсу ляжыць мова. Імпэрцы выдатна ведаюць, што нацыя бяз мовы — гэта ня нацыя. І гэта ўжо палова іхнае перамогі».

«Я цьвёрда ведаю, што Беларусь ня можа пайсьці насуперак усеагульным, сусьветным, эўрапейскім працэсам. Яна рана ці позна пойдзе за імі, і вельмі шкада, што гэта будзе позна, як заўсёды. Улады думаюць, што можна павярнуць некуды назад, што там ззаду нешта знойдзем — тое, што сьвет чакае наперадзе. Гэта немагчыма. І ўсё гэта «чрэвата» толькі ломкай — ломкай маральнай, псыхалягічнай, эканамічнай — і змарнаваным часам. А ўрэшце мы пойдзем туды, куды ідуць усе на сваім гістарычным шляху, толькі страціўшы пяць, дзесяць, а можа, і сто гадоў. Такі лёс. Лёс, канечне, жахлівы. Ну што зробіш. Хто тут больш вінаваты? Я думаю, што ўсё ж вінаватая нацыя, тут яе мэтафізычная віна».

«Я, праўда, не аптыміст, але я такі пэсыміст, які прагне, каб ягоны пэсымізм быў абвергнуты жыцьцём ці гісторыяй, ці нават апанэнтам».

«Нецярплівасьць апалягетаў беларускасьці, «апосталаў», зьяўляецца момантам адмоўным. За вялікім імпэтам і вялікай нецярплівасьцю ідзе ня меншае расчараваньне, ня меншая катастрофа, каторая перажываецца нацыяй вельмі балюча. Таму нецярплівасьць — ня самая лепшая беларуская якасьць характару.

Трэба запасьціся цярпеньнем. Трэба запасьціся цярпеньнем. І за кожнай няўдалай спробай бачыць наступную, і зьбіраць для яе сілы».

# Гіпнатычны фільм пра беларускі народ

## Гутарка з кінарэжысэрам Віктарам Корзунам



Ці магчымы паказ фільму на БТ? Для гэтага з стужкі давялося б выразаць усяго Быкава і ўсю карцінку.

**— У падмурку фільму «Васіль Быкаў. Вяртаньне» — інтэрвію пісьменьніка. Калі яно было запісанае?**

— Перад самым ад'ездам Быкава за мяжу — у Фінляндыю. Гэтае інтэрвію я меркаваў ператварыць у фільм пра свабоду. Але яно само сябе закансэрвавала на доўгі час. Выйшла гэта праз тэхнічны брак пры запісе гуку. На той момант шумы і іншыя лішнія гукі не падлягалі вычыстцы. Тэхнічна гэта можна зрабіць толькі на кампутары, а тады ні такія кампутары, ні такія праграмы даступныя яшчэ не былі. У выніку інтэрвію быццам само чакала свайго адпаведнага відэашэрагу.

**— Інакш кажучы, праца над фільмам заняла не адзін год. Распавядзі, калі ласка, пра свой досьвед у дакумэнтальным кіно.**

— Праца над фільмам заняла тры месяцы, а да гэтага 30 гадоў была падрыхтоўка: вучоба, практыка. Па вялікім рахунку, гэта дэбют. Падчас вучобы ў Акадэміі мастацтваў на рэжысуры рабіліся вучэбныя працы, штосьці рабілася на тагачаснай тэлевізіі — у 1994-м. Былі жывыя эфіры, музычныя кліпы... Але такога самастойнага твору, які я наважыўся б паказаць, не было.

**— Твой фільм адначасова і рэалістычны, і гіпнатычны, як нейкі шаманскі танец ці славутае балеро, вылучае шмат пазытыўнай энэргіі. Чаго тут болей — арыентацыі на нейкія чужаземныя ўзоры ці тваёй уласнай вынаходлівасьці?**

— Фільм рабіўся нібыта сам, як гэта ні містычна гучыць. Паглядзі на жыцьцё Быкава: цудам выжыў, цудам не пасадзілі, цудам не расстралялі, цудам пры ўсіх перашкодах выходзілі кнігі. І, мне думаецца, што фільм стаўся нібы працягам лёсу Быкава. Чаму назва такая — «Васіль Быкаў. Вяртаньне»? Фармальнае вяртаньне Быкава на радзіму сталася вяртаньнем да яго творчасьці ўсёй Беларусі. І нездарма вось гэтая стыхія, якая падчас пахаваньня была на вуліцах Менску, паказала, што ўлады з гэтым не маглі справіцца і нават пабаяліся туды блізка падыходзіць. Калі адчулі надчалавечую прыроду гэтага ўсяго...

**— Містыка містыкай, але ёсьць яшчэ рэжысэрскае рамяство — з нажніцамі ў руках перабіраць гадзіны адзьнятага матэрыялу...**

— Ёсьць такая ўсім вядомая формула: трэба ўзяць і выкінуць усё лішняе. Ідэя фільму ўзьнікла ў Вільні. Тык выйшла, што мы зь сябрамі ў дзень пахаваньня не прысутнічалі ў Менску. І калі мне распавядалі, што было шмат людзей, што на чатыры гадзіны затрымалі працэдуру разьвітаньня — і ўсё роўна ня ўсе змаглі патрапіць у Дом літаратара, што ўсе пайшлі на могілкі... Мне сам гэты аповед уявіўся нейкай карцінкай. А пасьля я пачаў шукаць гэтую карцінку і знайшоў матэрыял аднаго апэратара, які літаральна супадаў з тым, што мне ўяўлялася.

**— З аднаго боку, у фільме няма нічога наўмысна апазыцыйнага ці нават палітычнага, а зь іншага боку, Быкаў кажа рэчы, абсалютна важныя ці проста цікавыя для кожнага беларуса. Давай уявім сабе, што табе для паказу фільму на БТ прапанавалі б прыбраць некаторыя месцы. Ці гэта магчыма?**

— Ясна, што БТ ніколі не пакажа праўду. Бо праўда, зафіксаваная дакумэнтальна, нашмат мацнейшая за горы фальсыфікату. І таму сёньняшняе БТ, якое ў прынцыпе не прымае Быкава, не пакажа ніякі фільм пра Быкава. Зноў жа настойваю на тым, што фільм у мяне не пытаўся, дзе яго будзе магчымасьць паказаць і дзе ня будзе. Такой і думкі не было. Для БТ давялося б выразаць усяго Быкава і ўсю карцінку. Бо ў кадры вялізная працэсія зь бела-чырвона-белымі сьцягамі, а за кадрам Быкаў кажа пра свабоду і незалежнасьць тое, што ні ў якім разе ня пусьціць афіцыйнае чынавенства...

**— На тваю думку, ці ўдалося табе сказаць пра Быкава нешта новае або нешта дадаць да ягонага вобразу?**

— Кіно сказала пра Быкава... Яно вярнула вось гэтым словам — «народны пісьменьнік» — іхны першапачатковы сэнс.

**Гутарыў АК**

# Кнігі, якіх ня купіш

— Што творыцца з аргентынскімі пісьменьнікамі? Тоненькі сшытак пад пахай і загадкавы выгляд пэрсанажа Грэма Грына, за якім гоніцца Скотланд Ярд, — усхвалявана сказаў Лопэс.

*Хулiё Картасар*

Друкаванай паперы разьвялося столькі, што хутка ўжо і не прыдумаеш, што б такое загарнуць у яе.

*Мікалай Гогаль*



Франц Сіўко «Удог». Менск: «Беллітфонд», 2001. 332 с., наклад 300 ас.



Марыя Вайцяшонак «Кола». Менск: «Про Хрысто», 2004. 226 с., з ілюстрацыямі, наклад 500 ас.



Наталя Яковенко «Паралельний свит. Дослідження з історії уявлень та ідей в Україні XVI—XVII ст.». Кіеў: «Критика», 2002. 416 с., наклад 3000 ас.

Працяг са старонкі 3.

Завагаўся б нават Зянон Станіслававіч). Аднак можна сказаць напэўна, што беларусы ня хочуць чытаць па-беларуску (як і па-расейску) другаснай белібярды. Калі б усе беларускія рэдактары мелі такі ж дасканалы літаратурны густ, як, напрыклад, Даніла Жукоўскі, дык тыя бяздольныя часопісы, якія рэкламаваліся па «Ладзе» слоганам «Чытай сваё», меліся б выходзіць або раз на пяцігодку, або зь цяперашняй пэрыядычнасьцю, але з пустымі старонкамі (загортваць нешта ў такія старонкі было б больш экалягічна дзякуючы адсутнасьці шкоднай друкарскай фарбы, дарэчы).

Але вартыя кнігі ёсьць, і, у парадку чытацкай салідарнасьці, хацелася б падзяліцца зьвесткамі пра тры такія, што пакручастымі шляхамі трапілі да мяне. Ні адна зь іх не прадаецца ў кнігарнях. Ні адна ня мае дачыненьня да афіцыёзу, дэмагогіі ці парнаграфіі. Ні адна ня можа быць перакладзена на расейскую, хаця і з розных прычынаў.

**Франц Сіўко — майстар новага беларускага рэалізму.**

Стрыжань зборніку Франца Сіўка — аповесьці «Ўдог» ды «Голас». Шкада, што няма ў зборніку аповесьці «Году», якая разам зь першымі дзьвюма складае трылёгію.

Франц Сіўко — вынаходнік ды майстар стылю, які можна назваць *беларускім рэалізмам*. Гэта ніяк ня «Ганна завіхалася ля печы», хаця дзеяньне шмат калі адбываецца ў вёсцы. Гэта ня Маркес і ня Лакснэс. Нешта арыгінальнае і вельмі літаратурнае. Боль, глыбока схаваны, утаймаваны і пераплаўлены. Выпадак нелінейнасьці. За кожнай фразай — сэнс, другі сэнс і кантэкст. Безумоўная знаходка — эпілептычна-галюцынацыйныя трызьненьні герояў, якія ўспухаюць у плыні тэксту кавалкамі паўтлустага курсіву. Безумоўная знаходка — маналёг Польці, прапісаны курсівам. Важна, што сюжэт разгортваецца як спружына.

Але галоўнае — пра што аповесьці.

Пра тое, што гэта няпраўда — «как много даёт Россия, как мало берёт взамен».

Пра тое, як нас жаруць, а мы дзякуй кажам.

Пра падступнасьць і наіўнасьць.

Пра безвыходнасьць нашага лёсу.

Пра ідыятызм нашай млявасьці.

Ніхто пра гэта не пісаў. Прынамсі, не пісаў *так*.

Ясна, не перакладуць гэтага на расейскую, бо, здаецца, усё там праўда. І рукамі аўтара не засыплюць, і нават прэмій не дадуць. А прачытаць гэта варта.

Бо расьце, расьце *дзерава* і называецца то *ўдог*, то *году*, і сыплюцца зь яго атрутныя ягады, а мы ўсё *смотрым* ды маўчым, як ёлупні…

**Вайцяшонак не шукае сэнсу жыцьця. Яна яго бачыць.**

Паэзія і філязофія, злучаныя ў прозе Марыі Вайцяшонак, безумоўна вартыя ўключэньня ў школьную праграму — у выпускной клясе.

Вайцяшонак не шукае сэнсу жыцьця. Яна яго бачыць. Гэтая ўнікальная асаблівасьць зроку дазваляе пісьменьніцы знаходзіць сюжэт у падзеях, якія банальнаму замыленаму сапіенсу падаюцца мізэрнымі: сьмерць ці нараджэньне — саду, сабакі, чалавека, — новая кватэра ў белым доме над ракой, сенакос у вёсцы, прагулянка з сабакам, размова з суседкай — згодна з Вайцяшонак, усё гэта аднолькава вартае сюжэту, і, што самае галоўнае, чытаючы, немагчыма з гэтым не пагадзіцца! Кожны малы момант, кожную будзённую праяву яна павяртае так і гэтак, падбірае ёй *месца і дэкор*, і ў выніку гэтага *стайлінгу* кожная будзённая праява пачынае зьзяць тым сэнсам, якога шукае кожны з нас і якога можна не называць словамі.

Для тых, хто разумее, асобнай крыніцай асалоды стане сама мова кнігі. Абсалютна жывая, без аніводнага фальшывага ці штучнага слоўца, без аніводнай штампаванай інтанацыі. Пісьменьніца — выдатны стыліст беларускі, і бяз стратаў перакласьці яе на расейскую калі і магчыма, то вельмі цяжка: «*Павеяла гэткім палянскім ветрам, з усіх бакоў, спавівальным, бы стаіш увесь час на гары, на самым высокім месцы, і да цябе не даляцяць мітусьлівыя, будзённыя гукі, чужая мова*». «*А цяпер нас было двое, недаверкамі, мы амаль не сустракаліся поглядамі, як два злачынцы. Два жаночыя партрэты, без імёнаў, і бяз вэераў, вядома*».

Шмат якія апавяданьні — пра той пласт жыцьця, які імкліва і бясьсьледна зьнікае і ў якім ніхто, нават самі яго прадстаўнікі, ня бачыць нічога каштоўнага, — пра вёску. Пра тую вёску, дзе дасюль пануе Цар-голад і менавіта ім — ці ўспамінамі пра яго — і тлумачыцца кожны ўчынак. І сама спадарыня Марыя бачыла яго застылы твар і грозныя вочы, але ніколі не была яго падданай. Яна ня памятае твару маці, але помніць кветку сон-травы ў яе заскарузлых ад работы ды марозу руках і помніць, як камяк гліны, упаўшы са століі зямлянкі на падлогу, аджыў і аказаўся жабкай… І ў гэтым, мусіць, і крыецца адзін з сакрэтаў унікальнага зроку пісьменьніцы: «*Хто там адвярнуў камень? Не чапайце, пад ім разам з жабінай ці мышынай і мая нара…*»

**Падзел людзей не па канфэсіях ці багацьці, а на мірных жыхароў і ваяк — такой бачыцца аўтарцы гісторыя XVII ст.**

Навуковае дасьледаваньне Натальлі Якавенкі напісанае з захапляльнасьцю па-майстэрску мастацкай прозы. Чытаючы архіўныя матэрыялы «*не тільки в рядку, а й між рядком, і то, читаючи, женучи* (адганяючы) *від себе, наскільки вдасться, «вірус сучасності»*», аўтарка, знаная ўкраінская гістарыца, ставіць перад сабой мэту расказаць пра сапраўдны ўнутраны сьвет чалавека XVI—XVII ст. Магнат, шляхціц, мяшчанін, зямлянін, халоп, казак — якімі яны былі сапраўды? Што для іх было важна, якім бачылі яны сьвет? Адкіньце сёньняшнія стэрэатыпы, прадзярыцеся праз шкарлупіньне ілюзій таго часу, адчуйце «*смак полювання за другою реальністю*» — і Натальля Якавенка праўдзе вас такімі дарогамі, што мурашкі асалоды прабягуць па сьпіне і адарвацца ад тэксту будзе немагчыма. І няхай беларускага чытача не бянтэжыць слова «Ўкраіна» ў загалоўку: на той час і мова, і Радзіма былі ў нас адны.

Матэрыяльная, грашовая сутнасьць рэлігіі і вайны, падзел людзей не па канфэсіях ці багацьці, а на мірных жыхароў і ваяк, прасталінейная мараль таго часу і яе ўзьдзеяньне на калейдаскоп асабістых матываў і выбараў, штампы бюракратыі ды штампы панэгірыкаў — такой бачыцца гісторыя гісторыку Якавенцы.

Купайцеся ў шчодра разьлітых па старонках азярках тагачаснай мовы, і, можа, замест банальнага мату на старонках беларускага Інтэрнэту загучыць спрадвечная ВКЛаўская лаянка: *Корчемнік! Грач! Здрайця! Потварця! Нецнота! Кат! Лысий! Скурвий син! Через кий будеш скакати! В штуки розрубаю и псам дам!* — і да гэтага.

Такой літаратуры вы не прачытаеце па-расейску — бо гэта не для расейцаў, хоць там ёсьць і пра іх. Дзеля прачытаньня такой кнігі можна і падвучыць украінскую. Але, вядома, страх як хацелася б, каб гэты тэкст існаваў і на беларускай, хай бы, скажам, у неафіцыйным перакладзе на сайце knihi.com.

* * *

Шлях у бэстсэлеры ляжыць не праз «Кнігі — поштай», але калі раптам гэтыя выданьні ёсьць у нашага шаноўнага Алеся Яўдахі (exlibrys@tut.by, 8-029-643-57-33), шчыра рэкамэндую замовіць. Думаю, не пашкадуеце.

## ДЫСКАГРАФІЯ

## Мой Галілей. Лепшае

Маючы на рахунку два з палове выдадзеныя альбомы плюс безумоўны хіт, зь якім дуэт выступаў на «Эўрабачаньні», ды колькі раней ня выдадзеных песень, зборнік «лепшага» можна было рабіць. Без варыянтаў. Бо дыск гэты, так варта разумець, адрасаваны найперш тым, хто мала што ведае пра гэтых музыкаў.

І зборнік удаўся — такое «тры ў адным», калі лічыць мовы, на якіх выконваюцца песьні. Яны даюць уяўленьне пра шырыню творчых памкненьняў дуэту: гэта могуць быць эўрашлягеры («Мой Галілей»), усходнія шлягеры (тры песьні на расейскай мове, якія раней і не выдаваліся) і ўласнабеларускія шлягеры (апрацоўкі народных песень). Мушу прызнацца, што ні адно, ні другое, ні трэцяе не раздражняе і не выклікае пярэчаньняў. Нават расейскамоўныя песьні, якія не бязглуздыя і нават уяўляюць сабой высокамастацкія папсовыя ўзоры, калі толькі іх параўнаць з тым, што цяпер тыражуе якоенебудзь «Русское радио». Аляксандра і Канстанцін ня могуць ужо спусьціцца да папсовае пошласьці хоць бы таму, што дакрануліся да вытокаў, інакш розьніца будзе залішне рэзкая.

«Аляксандра і Канстанцін». (р) «Вестрекордс-плюс», 2004.




**Альбом варты куды больш пачэснага месца, чым сам дуэт заняў на конкурсе.**

Некаторыя песьні ў альбоме, як здалося, былі перазапісаны ў крыху іншых аранжаваньнях. Можна пашкадаваць, што сюды ня трапілі інструмэнтальныя творы Канстанціна Драпезы, якія маглі б паказаць творчасьць дуэту з чацьвёртага боку. Але й трох будзе дастаткова, каб атрымаць задавальненьне, а сам альбом паставіць на куды больш пачэснае месца, чым сам дуэт заняў на конкурсе, якому некаторыя зь недасьведчанасьці надаюць занадта шмат увагі.

**Лепшы СЛУХАЧ**

## Паутинка в небо

Альбом гэты не нашмат адрозьніваецца ад папярэдніх што па музыцы, што па тэматыцы тэкстаў песень, што па аранжаваньнях. Ды разам з тым адчуваецца, што музыкі не стаяць на месцы: альбом запісаны якасна, густоўна, тут амаль няма недарэчных, не да месца цытат, вельмі актыўна працуе акардэон Аляксандра Катовіча.

Што такое музыка «садыстаў» у цэлым? З пункту гледжаньня стылістыкі — гэта нешта накшталт сучаснага гарадзкога рамансу, які пабудаваны часам на знарочыстых штампах, цытатах і намёках на агульнавядомае з адначасным ужываньнем сьцёбу як стылевызначальнага элемэнту. Але гэта ня той раманс, што, напрыклад, у Вайцюшкевіча. «Садъ» іранічны ў дачыненьні нават да ўласнай музыкі, іх песьні адрасаваны не эстэтам высокай пароды, а тым, хто шануе недурныя жарты і маўчыць пры праглядзе «Панарамы», бо сам разумее, як ёсьць у краіне насамрэч. Нехта па інэрцыі залічае «Садъ» да панкмузыкі. Яны гэткія ж далёкія ад панку, як беларускі футбол — ад фіналу чэмпіянату сьвету. Яны — накшталт «Крамбамбулі» берасьцейскага разьліву, толькі што выступаюць не як праект, а самі па сабе. Нарадзіліся такія.

Група «Садъ». (р) аўтарскае выданьне, 2004.




**Музыка «садыстаў» гэткая ж далёкая ад панку, як беларускі футбол — ад фіналу чэмпіянату сьвету.**

Нягледзячы на пэўнае мэлядычнае падабенства песень, я асабіста слухаю творы «Саду» з задавальненьнем. Бо яны густоўныя і стылёвыя, бо музыкі іграюць, а не лабаюць, бо яны маюць клясу. Адзначу таксама наіўны (бо малявала дзіця), але вельмі шчыры дызайн, які выдатна адпавядае назьве альбому, што, дарэчы, неўзабаве будзе перавыдадзены ў Маскве, дзе творчасьць «Саду» запатрабаваная.

Тутака сады ўсё больш высякаюць… Асаблівы дзякуй за «Лапочку» і «НЛО».

**Недасаджаны СЛУХАЧ**

# У Эўропу праз акно

## Чаму чалавек ня можа атрымаць візу ў Літву сам, але лёгка можа купіць яе ў турагенцтве, пераплаціўшы 10 эўра?



PHOTO.BYMEDIA.NET

Яшчэ 15 ліпеня Міністэрства замежных справаў Беларусі ўручыла літоўскаму паслу ноту супраць становішча з чэргамі і замаруджаным працэсам выдачы віз. Для разбору сытуацыі ў Менск прыбыла група чыноўнікаў консульскага дэпартамэнту МЗС Літвы на чале з Вайдатасам Вэрбам. Аднак і больш чым праз паўмесяца чэргі каля консульства ня зьніклі.

Людзі, якія паспыталі чэргаў каля літоўскага консульства, наракаюць на турфірмы, што афармляюць групы без папярэджаньняў: «Турфірмы замаруджваюць, а то і наагул прыпыняюць чаргу для асобных грамадзян. Запускаюць то 6-7 разоў па 10 чалавек, то тройчы па пяць — і ўсё». Людзі каля консульства проста ня ведаюць, чаго чакаць. А прадстаўнікі кампаній, якія займаюцца пасярэдніцкай дзейнасьцю, лічаць немэтазгодным ускладваць на іх віну за чэргі ў консульскія аддзелы: «Для нас існуе асобная чарга і акенцы на прыём дакумэнтаў».

Часовы паверраны пасольства Літвы ў Беларусі Марыюс Януконіс не абвяргае наяўнасьці чэргаў. Але дае афіцыйную вэрсію іх узьнікненьня — новыя стандарты афармленьня анкет, зьвязаныя з уступленьнем Літвы ў Эўразьвяз. «Хаця мы і дабавілі людзей, кожны дзень застаецца па 10—15 непрынятых падаўцоў, — кажа ён. — Сэзонны ўсплёск абяцае спасьці да верасьня».

### Права на выезд

Пераплаціўшы амаль палову кошту самой візы (напрыклад, у выпадку літоўскай, за аднаразовую — 20 эўра, двухразовую транзытную — 25 эўра, шматразовую — 35 эўра), атрымліваеш яе бяз страты нэрвовых клетак. Журналістка Сьвятлана Курс распавяла, што сама прастаяла колькі дзён каля консульства Літвы, а пасьля зьвярнулася да пасярэдніка — турфірмы. «Яны бяруць 8—10 эўра ў дадатак да кошту візы, але ж ня трэба чакаць у бясконцых чэргах», — кажа яна. Дарэчы, сума ў 10 эўра роўная, напрыклад, паўтара дня працы доктара ці пятнаццаці гадзінам працы выкладчыка ўнівэрсытэту без навуковай ступені. У менскіх турфірмах кажуць, што гэты кошт — толькі вынік калькуляцыі: праца супрацоўніка, канцылярскія выдаткі.

Людзі каля консульства Літвы, наадварот, кажуць пра пэўную выгаду, якую нібыта маюць ад турагенцтваў супрацоўнікі консульства. На пытаньне «НН» пра турагенцтвы-пасярэднікі часовы паверраны пасольства Літвы Марыюс Януконіс адказаў, што «пасольства ніяк не ўплывае на дзейнасьць за сваімі межамі. Ёсьць дзьве чаргі: адна для грамадзян, другая — для турагенцтваў». А пра супрацоўніцтва паміж консульскім аддзелам і пасярэднікамі сказаў: «Выгады ад працы агенцтваў мы ня маем, апроч павелічэньня колькасьці наведнікаў Літвы». Цану ў 8—10 эўра за працу пасярэднікаў Януконіс ня лічыць нечым надзвычайным: «Гэта асабісты выбар людзей каля консульства. Калі яны ня маюць вольнага часу — абіраюць пасярэднікаў». Часовы паверраны таксама зазначыў, што літоўскае пасольства «ня мае ўплыву на цану працы пасярэднікаў».

На пытаньне «НН» пра стаўленьне Міністэрства замежных справаў да таго, што за 8—10 эўра можна атрымаць візу праз пасярэднікаў бяз чэргаў, нам адказалі: «Ніхто ня зможа даць вам зразумелага камэнтару. Але дакладна адно: турфірмы ня могуць гарантаваць атрыманьне візаў». Пра магчымую выгаду ад працы пасярэднікаў для саміх работнікаў консульства ў МЗС сказалі: «Гэта малаімаверна».

### Гарантыю даюць махляры

У сытуацыі з працай пасярэднікаў усё будуецца на даверы саміх падаўцоў дакумэнтаў. Турфірмы могуць спасылацца на правераныя знаёмствы ў консульстве, аднак «гарантаванае атрыманьне візы» — міт, створаны імі ж для рэклямы. Супрацоўнік фірмы «Альфа-тур» кажа: «Гарантыі для кліента мы не даём. Аднак 99% зь іх атрымліваюць візу». Гарантыю даюць хіба махляры, што нярэдка працуюць ля консульскіх аддзелаў пасольстваў.

Дзіўная ў такім выпадку пазыцыя пасольстваў і беларускага МЗС. Яны ведаюць аб сытуацыі з «абкраданьнем» і падманам грамадзян, але ж за падзеі за акном кабінэту ніхто не адказвае і не спрабуе вырашыць праблему. А права свабодна атрымаць візу ў дзяржавы Эўразьвязу і ЗША было дэклявана яшчэ ў мінулагодняй заяве Дзяржаўнага дэпартамэнту ЗША.

Чэргі ля візавых аддзелаў літоўскага ды іншых пасольстваў спрычыняюць масу прыкрасьцяў сумленным людзям. Гэтак, навучэнцы зачыненага Беларускага ліцэю не змаглі пасьля году ў падпольлі выехаць у Літву праз сытуацыю з чэргамі. Для іх цана візы плюс грошы, якія патрабавала за афармленьне фірма-пасярэднік, аказаліся непад'ёмнымі. Ад каго ж тады адгароджваюцца нашы заходнія сябры такімі тарыфамі? Для крымінальных элемэнтаў жа заплаціць дадатковыя 10 эўра — не праблема.

### 25 гадзінаў у чарзе

Па-іншаму сытуацыя з пасярэднікамі павярнулася ў нямецкім консульстве. Там таксама кажуць, што цяпер самая «гарачая» пара для работнікаў. Максымальна задзейнічаны працоўныя рэзэрвы, аднак і гэтага аказваецца недастаткова: тэрмін афармленьня візаў сягае 4 тыдняў. «Чэргаў нельга пазьбегнуць ніяк», — зазначыў дыплямат. Пра гэта ж кажуць і прадстаўнікі Міністэрства замежных справаў Беларусі, спасылаючыся на малое памяшканьне консульства. Усе зацікаўленыя бакі разводзяць рукамі, быццам бы так і трэба. Праўда, пад восень плянуецца пераехаць з вуліцы Будзённага ў больш прыстасаваны будынак у межах Міжнароднага адукацыйнага цэнтру. Мо там налета атрымаем прыклад эфэктыўнай працы?

Валера Булгакава, рэдактара культурніцкага часопісу «Arche», запрасілі на мерапрыемства ў Нямеччыну якраз у самы разгар сэзону. Ён расказвае, што яго «візавая эпапэя» пачалася 2 чэрвеня. «Каб не стаяць суткамі, вырашыў прайсьці па чарзе «заявы са штампам». Мой штамп быў на 24 чэрвеня. Калі патрапіў да акенца, у мяне запатрабавалі копію пасьведчаньня аб рэгістрацыі бюро культурных кантактаў «Фрыдрых», якое мяне запрасіла, і нумар часопісу «Arche». Пэўна, каб пераканацца, што я не самазванец. 28 чэрвеня мне сказалі, што запрашэньне выслана не за тым подпісам…» Булгакаў кажа, што вырашыў больш не змагацца, бо чэргі і так занялі ў агуле 25 гадзін.

Андрэю Хадановічу летась прыйшлося зьвярнуцца ў турфірму па атрыманьне Шэнгенскай візы. «Мяне запрасілі на фэстываль у Славакію. Там плянавалася прагулка на цеплаходзе ў Вену. Каб атрымаць Шэнгенскую візу, спачатку спрабаваў прастаяць чаргу ў консульствы Аўстрыі і Германіі, а пасьля пайшоў да пасярэдніка. Аднак візы так і не атрымаў: там былі патрэбны travel-чэкі і правы кіроўцы. Праз свой напружаны графік я так і пакінуў гэтую справу», — кажа Хадановіч.

### У дзьверы і ў акно

Прычыны сёлетніх чэргаў каля нямецкага консульства адна з кампаній-пасярэднікаў патлумачыла самазапісам людзей да сярэдзіны ліпеня. «Унутры чаргі маглі прадаваць ці абменьваць месцы. У гэтым нярэдка ўдзельнічаюць і прадстаўнікі турагенцтваў», — сказалі «НН» у адным зь іх. Выходзіць, што пасярэднікі самі працуюць на стварэньне чэргаў. Афармляючы групы «тых, каму ўжо надакучыла», яны фармуюць новыя — «каму вось-вось надакучыць». Адсюль і пастаяннае кола кліентаў ды заробак. «Паскарэньне працэсу афармленьня каля таго ж нямецкага консульства цяпер не зьяўляецца неабходнасьцю. Чэргі пачынаюць спадаць. Хіба ўжо на тэрыторыі консульства з пэўнай прычыны», — кажа пасярэдніца. Аднак каля нямецкага консульства штодзень стаяць у чэргах, запаўняюць заявы ня менш за дзьве-тры сотні чалавек. Каб не губляць чаргу, людзі нават сьпяць у машынах каля консульства, па некалькі разоў на дзень праводзяцца перапісы наведнікаў.

Выходзіць, што адзіны фактар для стрыманьня працы пасярэднікаў — гэта фізычная чарга. Дакумэнты здае і забірае сам падавец. Такая сытуацыя, напрыклад, ля консульства Францыі, іншых дзяржаў Шэнгенскага пагадненьня. Цікава, што няма там і натоўпаў — максымум 30—40 чалавек. Атрымаць візу можна ўжо і назаўтра.

Калі дзьверы ў Эўропу прачыненыя зусім крыху, жаданыя пралезьці праз акно большае. А ахвотнікаў дапамагчы за «ўмераную» плату заўжды знойдзецца багата.

**Сяргей Трафілаў**

Праблема пасярэднікаў — гэта таксама істотны недахоп нашага заканадаўства. На сайтах турыстычных агенцтваў-пасярэднікаў нідзе не сустрэнеце спасылак на дакумэнты, што рэглямэнтуюць іх дзейнасьць. Паўсюль толькі таямнічая фраза: «Гэта не забаронена, а таму — цалкам легальна». Таму ў консульствах, дзе можна афармляць дакумэнты праз трэцюю асобу, паслуга пасярэдніка каштуе 10 эўра. За тэрміновасьць — яшчэ столькі ж. На час «Басовішча», кажуць фанаты, каля польскага консульства кошт працы пасярэднікаў узрос удвая — да 20 эўра. Там, дзе чарга фізычная, — прадаецца месца.

# Нарач даражэйшая за Крым

## Дзе сёлета адпачываюць беларусы

Больш за мільён беларусаў штогод выяжджаюць за мяжу адпачываць. Куды едуць нашыя турысты і чаму яны выдаткоўваюць на адпачынак усё болей?

Паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, арганізацыяй турыстычных паслуг у 2000—2004 гадах займаліся ад 400 да 419 арганізацый. А вось колькасьць іх супрацоўнікаў за гэты пэрыяд зьменшылася з 4095 у 2000-м да 1900 чалавек у першым квартале гэтага году. У Міністэрстве спорту і турызму кажуць, што справа ў пераразьмеркаваньні патокаў паслуг. «Многія фірмы былі няздольныя аказваць турысцкія паслугі «на ўзроўні», таму і страцілі ліцэнзіі», — кажа **Віктар Янкавенка**, намесьнік загадчыка ўпраўленьня турызму. Сёньня, як кажуць у МСТ, на рынку засталіся толькі тыя, хто мае надзейных партнэраў за мяжой.

### Польшча стала заграніцай

Памяншэньне колькасьці тых, хто працуе ў сфэры турызму, — гэта таксама вынік зьніжэньня ліку беларусаў, што выпраўляюцца за мяжу. Летась турыстаў было меней на 180 тысяч чалавек у параўнаньні з узроўнем 2000 г. і на 320 тысяч — з узроўнем 2002-га. У 2001-м і ў 2002-м гэтая лічба павялічвалася на 50—100 тысяч чалавек і складала 1386—1430 тысяч турыстаў. Па выніках жа мінулага году за мяжу выправіліся ўсяго 1108273 чалавекі. За першы квартал 2004 г. — 84 тыс. (за той жа пэрыяд 2003-га — 293 тыс.).

Аднак гэтыя лічбы зусім ня сьведчаць пра колькасьць людзей, што выяжджаюць на адпачынак. Найперш яны адбіваюць згортваньне шоп-турызму — прымежнага чаўночнага бізнэсу. В.Янкавенка кажа, што найпершая прычына зьніжэньня — увядзеньне візавага рэжыму новымі сябрамі Эўразьвязу. «Раней 70% турыстаў ехалі ў Польшчу. Цяпер сэгмэнт рынку, што працуе на блізкую Эўропу, у стане адаптацыі».

Менавіта таму, нягледзячы на рэзкае паніжэньне попыту — больш чым на 70% за квартал і каля 23% за мінулы год, — кошт турыстычных паслуг павялічваецца. У 2000-м аказаныя турыстычныя паслугі ў суме каштавалі $7687,1 тыс. і БРБ 8153,8 млн, а летась — $11546,9 тыс. і 15891,3 млн. Прыбытак ад турыстычных паслуг за мінулыя чатыры гады склалаў 738—986,7 млн.




Цэны на заморскіх курортах досыць трывалыя, а вось на Нарачы ў гэтым годзе ложкамесца даражэйшае, чым у Крыме, — ад $5 да 12 за суткі. І гэта лягічна, калі ёсьць попыт.

### У Сочы ня рвуцца

Рынак турыстычных паслуг варта падзяляць на два сэгмэнты: адпачынак і экскурсіі. «Першую скрыпку» на беларускім рынку турыстычных прапановаў для адпачынку па-ранейшаму грае Крым. Гэты сэзон, паводле папярэдніх дадзеных МСТ, не выключэньне. Самымі дарагімі зьяўляюцца базы адпачынку: разам з праездам можа выйсьці да $300. Нашмат таньней выйдзе, калі ехаць саматугам. За ложкамесца — ад $4. У гэтым выпадку больш за ўсё патраціце на квіткі: калі на аўтобусе — ад 33 тыс., цягніком — пад 90. Тое ж датычыцца і Адэсы, іншых украінскіх ды расейскіх курортаў. Дарэчы, на апошнія беларусы ня вельмі імкнуцца.

Па цэнах адзінымі значнымі канкурэнтамі постсавецкім курортам для большасьці нашых турыстаў зьяўляюцца Турцыя і Баўгарыя. У Турэччыну зь Менску можна выправіцца і за $220—250 (без авіяквіткоў, што абыдуцца яшчэ ў дзьве сотні «зялёных»). Многія фірмы прапануюць вылеты з Масквы — яны таньнейшыя. Наагул, Турцыя, што ў апошні час праводзіць шырокую рэклямную кампанію, разьлічана на «сярэднюю клясу». Папулярнасьць гэтае краіны сярод беларускіх турыстаў прыпала на канец 90-х.

Баўгарыя — самая блізкая зь недасяжных за Саветамі мараў. Цяпер яе сабе можна дазволіць за 120—150 эўра на два тыдні зь пераездам на аўтобусе і за 320—350 эўра з авіяпералётам. Значна менш цікавасьці беларускія турысты маюць да Іспаніі і Італіі, пасьля ўвядзеньня візавага рэжыму менш сталі цікавіца польскай, літоўскай і латвійскай Балтыкай.




**Папулярнасьць беларускіх курортаў у апошнія гады рэзка падскочыла.**

### На Алімпіяду за 400 эўра

Хітом гэтага турыстычнага сэзону мусілі стаць туры на Алімпіяду ў Атэны. Аднак і за некалькі дзён да гульняў продажы вырасьлі ненашмат. Наагул, паездкі для балельшчыкаў сёлета прапаноўвала толькі адна турфірма (не было прапановаў нават ад Міністэрства спорту і турызму). Супрацоўнікі кампаніі кажуць пра два варыянты для заўзятараў. Адзін — гэта недарагія пуцёўкі ў Грэцыю за 400 эўра з авіябілетам і пражываньнем у гатэлі «дзьве зоркі» на тыдзень. «Яго абірае большасьць, бо білеты на алімпійскія спаборніцтвы можна дастаць без праблем і сёньня», — кажуць у фірме. Поўнафарматны тур за паўтары тысячы эўра зь пералётам, пяцізоркавым гатэлем, дастаўкай да месцаў правядзеньняў гульняў і алімпійскімі сувэнірамі бяруць рэдка. Ня дзіва, бо нават згодна з афіцыйнымі дадзенымі аб сярэднім заробку кошт туру складае каля 10 месяцаў працы. Дарэчы, кошт «неалімпійскага» туру ў Грэцыю складае 200—300 эўра + квіток на самалёт.

У экскурсійных прапановах лідэры — туры па Эўропе, Польшчы і Прыбалтыцы. За шэсьць дзён з наведаньнем Бэрліну, Парыжу і тамтэйшага «Дыснэйлэнду» пляціце 140 эўра плюс віза. Вялікай знаходкай турапэратараў было разьдзяленьне тураў. Раней можна было замовіць сабе паездку ледзь не праз усю Эўропу, цяпер — толькі па невялікай яе частцы. Гэтак жа і з Польшчай: падарожжа па паўночных гарадах на ўзьбярэжжы Балтыкі на пяць дзён абыдзецца ў 85 эўра плюс віза, а ў Варшаву і Кракаў — 65—70.

Рост попыту на беларускія курорты цалкам адпавядае плянам МСТ па разьвіцьці ўязнога і ўнутранага турызму. Галоўнае, што ў краіне застаюцца грошы. Аднак такую тэндэнцыю не ўтрымаць без укладаньняў у інфраструктуру. «Зручнасьці ў двары» хутка прыядаюцца.

**Сяргей Трафілаў**

# Адэса — гэта незабыўна

**Найтаньнейшы чарнаморскі адпачынак — на курортах Адэскае вобласьці. 10 дзён санаторыю з харчаваньнем і дарогай абыдуцца ў 150 у.а. Тым, хто пажадаў прабавіць вакацыі ў Крыме, давялося набавіць «за горы» 50—70 у.а. Беларус з псыхікай сярэдняе трываласьці вяртаецца з поўдня Ўкраіны з пачуцьцём палёгкі (у адрозьненьне ад суседніх Польшчы ці Літвы).**

Меркаваць па поўдні пра ўсю Ўкраіну — тое самае, што пра Беларусь па ўсходзе. Тым больш рызыкоўна гэта рабіць «на матэрыяле» публікі, што зьяжджаецца на базы адпачынку. Як правіла, гэта навакольная моладзь альбо кабеты зь дзецьмі ці безь іх. Сям'я ў поўным складзе — зьява рэдкая.

У вялікай сталоўцы нашага пансіянату заўжды вэрхал: кабеты, не «фільтруючы» лексыку («ідыёт» — гэта яшчэ даволі лагодна), прымушаюць дзетак паглынаць нясмачную піянерлягерную ежу. Беларускую сям'ю за сталом лёгка пазнаць па цывілізаваных паводзінах. Расейцы, якіх у параўнаньні з Крымам тут няшмат, без адчуваньня вялікадзяржаўнай еднасьці трымаюцца даволі ціха, зрэдку дазваляючы сабе дробныя ўнутрысямейныя «разборкі».

### Мова й каноплі

«Та ўсе ў нас гавораць по-русскі, но в інституце заставляють зубрыть украіньску», — кажуць суседкі за сталом, студэнткі зь Мікалаева. На нумарных знаках машын турыстаў зь Мікалаеўскай вобласьці (на экскурсійных мапах «Миколаїв» пазначаецца як «Николаево») — адмоўная часьціца «ні». Нейкі дзядзька па-ўкраінску абураецца: зусім абруселі. Пачуць украінскую на курорце цяжка. Нават ды-джэі адэскага радыё яе ня ведаюць. Мова ўяўляецца гэткім індыкатарам культурнага ўзроўню і тэрытарыяльнай прыналежнасьці суразмоўніка.

Ад пытаньняў мовы гутарка плаўна пераходзіць да праблемы алькагалізму. Сёньня ў вёсках Паўднёвай Украіны самагон не ў фаворы: балем правіць «шмаль».

У дзень ад'езду, праз выключную «руплівасьць» прадстаўніцы турфірмы, даводзіцца колькі гадзін сядзець у холе пансіянату на валізах разам зь мясцовымі бабулькамі, што кругласутачна глядзяць тут тэлевізар. Спачатку па нацыянальным канале паказваюць бразыльскі сэрыял — па-ўкраінску. Затым — расейскі. Не даючы веры вачам, падсоўваюся бліжэй да экрану: унізе бягуць украінскія субтытры.

### Чытво й пітво

На кніжных развалах расейскія дэтэктывы, модныя Муракамі, Нарбекаў, Каэльё (яго гандлярскі чамусьці анансуюць як нядаўна памерлага: «Памёр, а кнігі выходзяць». Недарэчна прыгадваецца Быкаў). Раптам сярод буянства вокладак вока выхоплівае сьціпла аздоблены томік «Кабзара».

Акрамя чытва на развалах можна па вельмі пралетарскіх цэнах набыць і пітво зь мясцовага вінзаводу. А вось крамы з крымскімі вінамі ва ўсёй Адэскай вобласьці не знайсьці.

Працяг на старонцы 10.

# Катынь: хто ўспомніць пра беларусаў?

**Расейцы ня лічаць злачынствы ў Катыні генацыдам ці злачынствам супраць чалавецтва і таму ня будуць перасьледаваць выканаўцаў расстрэлаў, якія яшчэ жывуць, пачулі 3 жніўня ў Маскве прадстаўнікі польскага Інстытуту нацыянальнай памяці (ІНП). Расейцы баяцца прэцэдэнту. Беларусаў на сустрэчы не было. Пытаньне Катыні хвалюе Менск ня больш, чым праўда пра Курапаты.**

Масква і Варшава маюць розныя погляды на катынскае пытаньне.

Адбылося сутыкненьне юрыдычных пунктаў гледжаньня. Паводле польскага права, злачынны загад не выключае адказнасьці тых, хто яго выконвае. Аднак расейскія законы не прадугледжваюць такіх высноў наўпрост. Згодна з тлумачэньнем расейскай пракуратуры, можна казаць пра нейкую адказнасьць, калі ідзе гаворка аб забойстве больш як дзесяці чалавек. Палякі кажуць, што маюць зьвесткі прыкладна на дзьве тысячы выканаўцаў.

Абодва бакі пагаджаюцца з тым, што амаль 22 тысячы афіцэраў польскага войска (сярод якіх тысячы ўраджэнцаў беларускіх зямель), што пайшлі ў палон да саветаў у 1939 г., былі расстраляны на загад Масквы. Зьдзейсьніла гэта органы НКВД. Расейцы не адмаўляюцца ад злачынства, не зьніжаюць лічбы ахвяраў, не хаваюць выканаўцаў. Ахвяры лічацца па змоўчаньні «палякамі», бо беларускія ўлады ніякім чынам не пацікавіліся лёсам сваіх землякоў.

ІНП дамагаецца, каб злачынства ў Катыні было прызнана генацыдам. Аднак расейцы на гэта не пагаджаюцца, паколькі расстрэлы адбываліся ў 1940 г., а канвэнцыя ААН падпісана толькі ў 1948-м. Яны лічаць расстрэлы не генацыдам, а толькі масавым забойствам. Тая канвэнцыя лічыць злачынствам супраць чалавецтва любыя забойствы на этнічнай, рэлігійнай і нацыянальнай глебе. Нацыстаў судзілі, не зважаючы на час падпісаньня канвэнцыі, аргумэнтуюць палякі. Расейцы ж баяцца прэцэдэнту, бо пасьля ў суд могуць зьвярнуцца сваякі ахвяр з крымскіх татар, беларускіх, прыбалтыйскіх ці сваіх расейскіх сялян. А тады давядзецца прызнаць, што ў 1917—1953 г. Савецкім Саюзам кіраваў людабойчы рэжым.

Акрамя таго, калі злачынства ў Катыні будзе прызнана генацыдам, дык, згодна зь міжнародным правам, акрамя непасрэдных выканаўцаў вінаватымі прызнаюць вартаўнікоў, перавозчыкаў і ўсіх іншых датычных. А такіх набярэцца тысячы дзьве. Частка іх яшчэ жыве.

Тым часам расейцы правялі 200 эксгумацый. Падчас сьледзтва выслухана больш за 900 сьведкаў злачынства. Ніводнаму зь іх ня выставілі абвінавачваньня. Са слоў галоўнага пракурора Расеі генэрала Аляксандра Савянкова, ніводнага з ініцыятараў і выканаўцаў расстрэлаў ужо няма жывога.

Расейцы ўпершыню паказалі 156 тамоў сьледчых спраў катынскай трагедыі. Сьледзтва тое цягнецца з 1990 г. Палякам будзе забясьпечаны вольны доступ да ўсіх дакумэнтаў. З расейскага боку сьледзтва практычна скончана, пакуль не стае дакумэнтаў толькі з Украіны.

Палякі наракаюць, што сьледзтва за 15 гадоў ня выявіла ні выканаўцаў, ні ўсіх месцаў расстрэлаў. Не выплачваюцца таксама кампэнсацыі сваякам ахвяраў.

Катынь стане адной з тэмаў перамоваў прэзыдэнтаў Пуціна і Квасьнеўскага ў Маскве. У студзені 2005 г. Пуцін зьбіраецца наведаць Асьвенцым. Сымбалічны жэст у Катынскай справе прыгожа ўпісаўся б у той візыт. Што гаварыць пра беларуска-расейскія сустрэчы: калі сярод «белтрансгазаўскіх» і абмяркоўваючы нейкія забытыя справы мінулага, дык напэўна ж не пра справядлівасьць да замардаваных. Беларускаму боку справы памяці пра ахвяраў СССР не ў галаве.

**Руслан Равяка**

## Пра Алімпіяду

**Працяг са старонкі 2.**

Чым меней дзён застаецца да адкрыцьця Алімпіяды ў Атэнах, тым хутчэй пачынае біцца тваё сэрца. І кожнае паведамленьне з Атэнаў успрымаецца з хваляваньнем. Ці пасьпеюць грэкі, асабліва пасьля сьвяткаваньня трыюмфу футбольнай зборнай на Эўра-2004, у час здаць усе спартовыя аб'екты Гульняў? Ці не сарвуць Алімпіяду хоць бы гатэльныя работнікі сталіцы Гульняў чатырохгодзьдзя, якія не задаволены сваім заробкам і пагражаюць страйкам? І што будзе зь пятнаццацьцю тысячамі бадзяжных жывёл, якіх муніцыпалітэт Атэнаў пастанавіў зьнішчыць, пасьля чаго некаторыя спартоўцы Канады прыгразілі арганізатарам Гульняў байкотам? І ці будзе належным чынам пастаўлена абарона гораду ад тэрактаў?

Аднак усе засьцярогі ў мінулым. І сёньня пачнуцца Летнія Алімпійскія гульні. Кошт квітка на цырымонію адкрыцьця складае 950 эўра. Паспалітаму беларусу трапіць туды можна, хіба выйграўшы конкурс НАКу ці выпадкова адкаркаваўшы патрэбную бутэльку «Кока-колы». Ноч у гатэлі падчас Алімпіяды каштуе 690 эўра. Шчыра кажучы, цэны крыху кусачыя. Хоць, зрэшты, ёсьць квіткі ўсяго па 10 эўра. Квіток на мужчынскую 100-мэтроўку будзе каштаваць 90 эўра. Грэкі баяцца, што ўсе білеты ня будуць раскуплены і давядзецца спартоўцам спаборнічаць пры паўпустых трыбунах.

Для жыхароў усяго сьвету, што ня трапяць на прарадзіму Алімпіяды, не застанецца нічога іншага, як назіраць за спаборніцтвам атлетаў са сваіх тэлевізараў. Наша БТ ужо даўно заключыла кантракт на паказ Алімпіяды. Як паведамляюць камэнтатары, гэта будуць першыя Алімпійскія гульні, паказаныя Беларускім тэлебачаньнем у поўным аб'ёме. У 2000 г. з Сыднэю вяліся рэпартажы толькі з асобных спартовых арэн: гімнастыка, дзьве барацьбы, весляваньне, лёгкая атлетыка

Цікава, ці атрымаем мы зноў расейскамоўных камэнтатараў «з вузьлікамі ў роце», якія сваім прафэсійным узроўнем на дзьве-тры галавы саступаюць польскім і расейскім калегам? Калі так, то ня дзіва, калі многія беларусы зноў замест свайго БТ абяруць рэпартажы каналаў суседніх дзяржаў.

Сам чакаю на Алімпіядзе-2004 выступу Івана Іванкова, якому жадаю шчырага трыюмфу пасьля расчараваньня на Алімпійскіх гулнях у Сыднэі. Чакаю, ці пакажа БТ выступы ўкраінскага сабліста Аляксандра Лукашэнкі і спаборніцтва ў стральбе з луку, ці мо які дамарослы цэнзар на БТ знойдзе крамолу ў слове «лукадром» — назьве арэны спаборніцтваў у гэтым відзе спорту. Тым болей што адзін лукадром у краіне, у Берасьці, ужо прыкрылі. Чакаю «золата» ад Каці Карстэн, Наташы Цылінскай, Вані Ціхана, Эліны Зьверавай і мо хто ведае ад каго яшчэ. Чакаю перамогі літоўцаў у баскетболе над амэрыканскай dream-team. Чакаю сусьветных рэкордаў у плаваньні і лёгкай атлетыцы, а таксама сумленнай барацьбы.

Ня трэба забывацца, што заўсёды пасьля асноўных Алімпійскіх гульняў праходзяць Паралімпійскія гульні. Гульні людзей, якіх язык ніяк не паварочваецца назваць інвалідамі. Гэта людзі моцнай волі і моцнага характару. Яны не замкнуліся ў сабе, не засталіся сам-насам са сваёй хваробай, а, наадварот, пачалі рабіць подзьвігі. Менавіта подзьвігі, іншага слова тут не падбярэш.

XXVIII Алімпійскія Гульні ў Атэнах стануць трэцімі для незалежнай Беларусі. На першых мы ўзялі адзін залаты мэдаль, на другіх — тры ўзнагароды найвышэйшай пробы. Няблага было б працягнуць геамэтрычную прагрэсію.

Хварэем за нашых!

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца (Барысаўшчына)**

## Татуаваньне

У №27 «НН» сустракаецца слова «татуіроўка» зь неўласьцівым мове суфіксам «ір». Я ня ведаў, як трэба называць па-беларуску рысунак на целе, да таго часу, пакуль мне ня трапіў ў трукі нямецкі акупацыйны пашпарт 1916 г., дзе ўсе надпісы зроблены па-нямецку і па-беларуску. Там напісана «татуаваньне». Я думаю, што да гэтага слова ні ў кога пярэчаньняў ня будзе.

**Алесь Ступень, Горадня**



Бэйсбольны чэмпіянат у самым зэніце, усё астатняе на другім пляне.

АЛІМПІЯДА Ў ЛЮСТЭРКУ ХМАРАЧОСАЎ

# Бакс-бакс захінае Алімпіяду

36 тысячаў кніг на алімпійскую тэматыку прапануе заакіянская нэт-кнігарня Amazon.com — гэтая лічба забівае напавал. Якасьць алімпійскіх фотаальбомаў на паліцах ведамых у Нью-Ёрку кнігарань «Barnes & Noble» уводзіць у стан грогі. Колькасьць навінаў ва ўсіх магчымых СМІ ўражвае. Досыць сказаць «бакс-бакс», як калісьці «сім-сім», і ўсё гэта робіцца табе даступным. Тым больш шакуе той факт, што тут, у ЗША, Алімпіядай цікавіцца толькі абмежаваная група заўзятараў.

Геаграфічная адлегласьць Новага Сьвету ад Старога і, у падмурку сваім, некамэрцыйны характар Алімпійскіх гульняў зрабіў іх, па сутнасьці, чужымі для амэрыканскай мары. Імпэрыя свабоды і грошай жыве ў напружаным чаканьні новых тэрактаў, стогне ў ліхаманцы напярэдадні прэм'еры чарговага блякбастэру кшталту «Catwoman», з ранку да вечару падлічвае шанцы Буша і Керы.

А як жа спорт?

У амэрыканцаў сваё разуменьне спорту, і на першым месцы, па-за канкурэнцыяй, бэйсбол. Гэта і хобі, і грошы, і адпачынак, першыя бачыны газэт і прайм-тайм на ТБ, усеагульная любоў да «New York Yankees» і паўсюдныя выявы яе капітана — імпазантнага мулата Дэрыка Джытэра. Бэйсбольны чэмпіянат у самым зэніце, усё астатняе на другім пляне.

Што да Алімпіяды, дык згадкі пра яе найчасьцей зьвяўляюцца ў зьвязку зь дзьвюма акалічнасьцямі: допінгавым скандалам у стане лёгкаатлетычнай каманды і антыізраільскімі выдаткамі грэцкага боку.

Прадстаўленьне пачынаецца. Але ці для ўсіх?

**Кастусь Лашкевіч, Нью-Ёрк**

ХРОНІКА

За правядзеньне пікету 3 жніўня на Кастрычніцкай плошчы Менску асуджаны актывісты АГП **Аляксей Прыходзька** (15 сутак), **Натальля Зубарэвіч** (10 с.), **Тацяна Ларыёнава** (30 б.в.). **Н.Зубарэвіч** пасьля 3 сутак утрыманьня ў прыёмніку-разьмеркавальніку 10 жніўня была дастаўленая ў аддзяленьне кардыялёгіі больніцы ў Бараўлянах. Актывіст прафсаюзу РЭПАМ **Іван Роман** 3 жніўня быў затрыманы каля прахадной Гарадзенскага заводу аўтамабільных агрэгатаў падчас раздачы прафсаюзных бюлетэняў — 174 бюлетэні канфіскаваны, хаця мелі ўсе выходныя зьвесткі. 3 жніўня супрацоўнікі міліцыі Ганцавіцкага раёну затрымалі ўдзельнікаў акцыі супраць разьмяшчэньня расейскай радыёлякацыйнай станцыі «Волга» ў Беларусі; арганізатар акцыі намесьнік старшыні Менскай абласной арганізацыі ПБНФ **Павал Батуеў** 4 жніўня атрымаў позву ў суд за «арганізацыю несанкцыяванага пікету». 4 жніўня за знаходжаньне на расейскай тэрыторыі й несанкцыяванае пікетаваньне каля вёскі Машукі Клецкага раёну былі затрыманыя маладафронтаўцы **Ганна Шкаранда, Паліна Табакова, Натальля Максімава, Іван Глеб, Вадзім Месядзенка, Павал Каранюхін, Алена Двайнова, Яўген Ваўкавец, Сяржук Савіч** і **Павал Красоўскі**. **С.Савіча** з Жодзіна папярэдзілі пра адлічэньне з Акадэміі МУС за ўдзел у рэйдзе з інфармаваньнем пра расейскую РЛС. Супрацоўніцу дзяржаўнай арганізацыі **Тацяну Жабко** (Маладэчна), якая таксама ўдзельнічала ў паходзе, на працы прымусілі напісаць тлумачальную наконт таго, дзе яна была падчас адпачынку. Чыгуначны раённы суд Віцебску 4 жніўня аштрафаваў **Барыса Хамайду** на 20 б.в. за «незаконную прадпрымальніцкую дзейнасьць»: Хамайда казаў, што бясплатна распаўсюджвае «БДГ» і ня мае з таго прыбыткаў, але судзьдзя да ўвагі паказаньні сьведкаў не прыняў. Газэта **«Рабочая салідарнасць»** 4 жніўня спыніла сваё існаваньне, бо яе заснавальнік — ужо ліквідаваная Беларуская партыя працы. **Вольга Завадзкая**, маці зьніклага тэлеапэратара Зьмітра Завадзкага, 4 жніўня накіравала ў Пракуратуру заяву з патрабаваньнем узнавіць расьсьледаваньне па справе яе сына і дапытаць А.Лукашэнку як сьведку. Актывістаў Свабоднага прафсаюзу беларускага **Віктара Стукава** і **Міколу Шараха** затрымалі 4 жніўня на прахадной ААТ «Полацак-Шкловалакно» і пасьля надгляду асабістых рэчаў забаранілі праносіць на тэрыторыю прадпрыемства прафсаюзны інфармацыйны бюлетэнь **«Регион»**; затрымка падчас забіраньня бюлетэняў і складаньня пратаколу была аформлена як спазьненьне на працоўнае месца. 5, 6 жніўня быў сарваны выхад **«Народнай волі»**: судовы выканаўца арыштаваў банкаўскі рахунак выданьня і паперу, на якой павінен быў друкавацца наклад. Нумар выйшаў толькі 7 жніўня, пасьля таго як рэдакцыя «НВ» заплаціла каля 70 млн руб. паводле пазоваў С.Атрошчанкі і Я.Рыбакова. 5 жніўня генпракурор В.Шэйман адхіліў хадайніцтва пра вызваленьне з-пад варты **Міхаіла Марыніча**, 6 жніўня Марыніч заявіў адвод новаму сьледчаму Барысу Рагімаву. 6 жніўня пад ціскам адміністрацыі Барысаўскага заводу аўтатрактарнага абсталяваньня (пагроза звальненьня з прычыны скарачэньня штатаў) заяву пра выхад з РЭПАМу падаў **Зьміцер Цьвяткоў**. Сябры АГП **Віктар Какарэка** і **Зьміцер Слуцкі** падалі пазовы ў Гарадзенскі абласны суд на выніки фармаваньня выбарчых камісій. 6 жніўня дэпутат групы «Рэспубліка» генэрал **Валер Фралоў** падаў судовы пазоў пра абарону гонару і годнасьці: ён патрабуе ад С.Атрошчанкі 100 млн руб. за тое, што ў газэце «Обозреватель» (заснавальнік Атрошчанка) яго назвалі антысэмітам. У кватэры актывісткі «Зубра» **Насты Васіленкі** з Баранавіч 6 жніўня супрацоўнікі міліцыі з санкцыі пракурора наладзілі ператрус, заявіўшы, што шукаюць скрадзены мабільны тэлефон; тэлефона не знайшлі, але канфіскавалі незалежныя выданьні і ўлёткі, а таксама дзяўчынін нататнік. 9 жніўня Калегія па грамадзянскіх справах Менскага гарадзкога суду не задаволіла скаргі **Сойму ПБНФ** на рашэньне суду Першамайскага раёну — суд адмовіўся пачынаць крымінальную справу супраць Белтэлерадыёкампаніі й журналіста Ю.Пракопава па абароне гонару і годнасьці партыі. Актывіста АГП зь Мёраў **Валера Каралёва** супрацоўнікі міліцыі затрымалі 9 жніўня на Маскоўскім аўтавакзале Менску падчас раздачы інфармацыйных матэрыялаў «5+» ды газэты «Время». Неўзабаве туды ж прыбылі супрацоўнік пракуратуры й двое з КДБ. Міліцыянт цікавіўся крыніцамі паступленьня літаратуры. Кадэбісты — поглядамі, перакананьнямі, паездкамі за мяжу.

**АШ**

# Адэса — гэта незабыўна

**Працяг са старонкі 9.**

## Крывасмокі

Страшнейшыя за адэскіх камароў толькі ўкраінскія мытнікі. Гадзіну «ператрахвалі» наш бусік. Нібыта спаборнічалі, хто зьдзярэ больш хабар. Нашы кіроўцы шакаваныя: мытнікі, маючы добры «выхлап» алькаголю, наўпрост патрабуюць грыўняў.

Па курортных вулках і пляжах на роварах разьяжджае патруль — пільнуе гандляроў безь ліцэнзіі (іх большасьць). Уразіла адсутнасьць у крамах касавых апаратаў, грошы кладуцца проста ў кішэні прадавачак. Запомнілася показка зь мясцовага радыё: «Каб хутка павысіць дабрабыт народу, трэба самым маламаёмным выдаваць бясплатна міліцэйскую форму».

## Шпацыр па Адэсе

«Налета ў нас юбілей — гораду 210 гадоў», — з гонарам распавядае экскурсаводка. Адэсіты ганарацца ўсім: тым, што Пушкін напісаў тут разьдзел «Яўгена Анегіна», што Міцкевіч два разы спыняўся ў гатэлі «Пасаж», што ў Адэсе вынайшлі слова «жлоб» і выраз «не фантан»… Як нам бракуе гэтае рысы — гонару за месца, дзе нарадзіліся! Асабліва гонар дзяцей «Паўднёвае Пальміры» — Ільф і Пятроў. Для іх тут адзін помнік на двух — дванаццатае крэсла мадам Петуховай.

Страшна падумаць, які «ёрш» віруе ў крыві карэнных месьцічаў. Са словаў гіда, у горадзе жывуць прадстаўнікі больш як 100 нацый. «Адэса-мама» ў разгар сэзону праз сваё сьмецьце, «накручаныя» тачкі і страшную колькасьць дзьвюхногіх паўстала хутчэй як паабтрапаная, але нятанная прастытутка.

На трапіць у Адэсе «на развод» — усё адно што ўбачыць Парыж і не памерці. Перад ад'ездам удзельнікі экскурсійнае групы дзеляцца, як і на колькі каго абдурылі таксісты, валютчыкі, фатографы, проста мінакі. Усе робіцца культурна і элегантна, у найлепшых традыцыях таварыша Бэндэра. Ня буду распавядаць, на чые трапіўся сам на Дзерабасаўскай, — зьезьдзіце і паспытайце. Гэта незабыўна.

***P.S.*** Каб занатаванае не выдавала на антырэкляму, дадам: мора было лагоднае, пясочак цёплы, віно — не бяды, дзяўчаты… нашы, вядома, прыгажэйшыя. Калі вам абрыдлі Канары і абла́жаны ўсе куткі Беларусі, яшчэ можаце пасьпець на «аксамітны сэзон» у Адэсу. Добры настрой і загар гарантуюцца.

**Анатоль Івашчанка**

# Пошук братоў па розуме працягваецца

## Як беларуская дыпляматыя працуе на Ўсходзе

27—29 ліпеня нашу краіну з афіцыйным візытам наведаў прэзыдэнт Судану Амар Хасан Ахмад аль-Башыр. Чаму беларусы, якія перажылі Хатынь і Курапаты, сустракаюць хлебам-сольлю кіраўніка краіны, які паліць хатыні ў сваёй краіне?

«Краіна бязьмежных магчымасьцяў» (БелТА) зьдзіўляе, сярод іншага, здольнасьцю ўраду дзяліць сваіх грамадзянаў на гатункі і вынішчаць непажаданую катэгорыю.

У часе больш чым дваццацігадовай вайны з карэннымі народамі поўдня краіны загінула каля двух мільёнаў чалавек. 2000 г. быў адзначаны правядзеньнем фактычнага генацыду ў Нубіі. Сёлета Судан зноў не сыходзіць зь першых старонак друку з прычыны трагедыі ў Дарфуры — заходніх раёнах краю. Праўрадавая міліцыя вынішчае тамака сялянаў, якім не пашчасьціла нарадзіцца з належным колерам скуры ды размаўляць на «нармальнай» арабскай мове. Заходняя прэса называе пляны аль-Башыра ў стварэньні «арабскага» Судану расісцкімі.

У такой сытуацыі хартумскаму лідэру прыйшлося даспадобы менскае запрашэньне: хоць куды, абы ў Эўропу. А А.Лукашэнка не шкадаваў словаў пра квітнеючую прышласьць Судану.

Беларускія дыпляматы апраўдваюць афрыканскую палітыку Беларусі старым нямецкім словам «Realpolitik». Маўляў, ня толькі мы сябруем з Суданам, але й Штаты маюць за хаўрусьнікаў сумнеўныя рэжымы кшталту Саудаўскай Арабіі — за пэўныя для сябе выгоды.

Што ж карыснага мы можам атрымаць ад сапраўды далёкай краіны, дзе пачынаючы з 1956 г. амаль няспынна ідзе вайна? «БДГ» назвала «экстравагантнай» заяву беларускага й суданскага бакоў аб магчымасьцях супольнага асваеньня нафтагазавых радовішчаў. Калегі ня вераць у нашы тэхналягічныя, кадравыя і рэсурсавыя мажлівасьці. Мне ня хочацца так скептычна ставіцца да нашага патэнцыялу. Але які павінен быць першы крок у працэсе асваеньня тых радовішчаў, размешчаных у раёнах пражываньня мяцежнага насельніцтва? Пацыфікацыя, або «зачыстка» іх. Які ўвогуле сэнс весьці перамовы пра радовішчы, якія кантралююцца ня ўрадам, а яго ўзброенымі апанэнтамі?

Можна, вядома, згадаць пра травеньскае мірнае пагадненьне паміж Паўднёвасуданскім Народна-вызвольным войскам і Хартумам. Але ёсьць багата падстаў усумніцца ў пасьпяховасьці яго ажыцьцяўленьня. Да таго ж, дамова прадугледжвае рэфэрэндум аб самавызначэньні Паўднёвага Судану праз шэсьць год. Таму невядома, з кім трэба дамаўляцца пра радовішчы — з аль-Башырам ці з уладаром Поўдня Джонам Гарангам.

Яшчэ адна цікавая ідэя — аб накіраваньні нашых выкладчыкаў у Судан. Г.зн. выкладчык супраціву матэрыялаў з БНТУ адправіцца ўпрочкі ў краіну, ахопленую вайной. Ці «выкладчык» — гэта такі новы эўфэмізм для абазначэньня ваенспэцаў?

> Беларускія дыпляматы апраўдваюць афрыканскую палітыку Беларусі старым нямецкім словам «Realpolitik». Аднак, як сьведчаць лічбы, амаральнасьць сама сабою яшчэ ня робіць замежную палітыку прагматычнай.



**Амар Хасан Ахмад аль-Башыр**

Іншыя напрамкі супрацоўніцтва больш абгрунтаваныя, але выклікаюць пытаньні наконт сваёй рэалістычнасьці — хаця б таму, што Судан ня мае вольных грошай. Узровень эканамічнага развіцьця краіны добра ілюструе той факт, што нават у Афрыцы Судан вылучаецца маштабамі рабаўладальніцтва. Усё гэта БелТа замаскавала пад эўфэмізмам «спадчына старажытнаэгіпецкай цывілізацыі». Не магло найстарэйшае тэлеграфнае агенцтва краіны схаваць праўду пра нашых сяброў, але ж выказала яе высокамастацкім стылем.

Зразумела, гаворка падчас маштабнага візыту магла ісьці не толькі пра 300 трактараў і радовішчы. Ёсьць іншая тэма, якая хвалюе і надзіць Хартум і Менск, — зброя. Менавіта вайсковы характар супрацоўніцтва падазрае ў дадзеным выпадку сьвет. Дзяжурным чынам гэта адзначыла «The Washington Post», гады ў рады згадаўшы Беларусь, ізноў у нялепшым для іміджу нашай краіне сьвятле.

Вельмі праўдападобна, што ў суданскай трагедыі мы ня проста назіральнікі. Мо нават і суўдзельнікі.

Каб «вудзіць рыбу» ў афрыканскім стаўку, палітыка краіны павінна быць грунтоўна распрацаванаю. Сёньня ж сувязі з Суданам носяць «спарадычны характар». Калі пашанцуе, дык прадамо. Таму і ўдаецца раптам павялічваць таваразварот у дзесяць разоў, пасьля чаго ён тут жа валіцца. Праўда, у гады падзеньня зьвесткі пра гэта не трапляюць на старонкі «Беларусі сегодня».

Адзначым, што такая сытуацыя існуе ня толькі ў адносінах з Суданам. Досыць пабываць у любой краіне Сярэдняга Ўсходу, каб пабачыць мэтады працы пэўных беларускіх фірмаў. Іх дэвіз: «абы хутчэй збыць што тубыльцам». Пляваць на якасьць вырабу, на пасьляпродажнае абслугоўваньне і г.д. Ніякі салідны пакупнік тэхнікі такога вытворцы купляць ня будзе. З такім падыходам мы ня можам падтрымліваць сур'ёзныя адносіны «неэкстрэмальнага» характару (калі прадаюць, каб спаражніць забітыя склады ды выканаць плян экспарту). Пры такім падыходзе мы сапраўды можам разьлічваць толькі на стасункі зь людзьмі накшталт аль-Башыра.

Цікава, што такія мэтады характэрныя перш за ўсё для найменш рэфармаваных прадпрыемстваў беларускай прамысловасьці (машынабудаваньне, вайсковая прамысловасьць). У тых галінах эканомікі, што зазналі перамены, напрыклад у лёгкай прамысловасьці, справы відавочна лепшыя. Гэтак, посьпехі беларускіх «Беліты» й «Мілявіцы» заўважныя на вітрынах шмат якіх сталіц ня толькі СНД.

Неяк «БДГ» ахарактарызавала замежную палітыку беларускай дзяржавы як «пошук братоў па розуме». Гэта было ў тыя часы, калі Менск з імпэтам, ня меншым, чым цяпер з Суданам, разьвіваў хаўрус з Сэрбіяй ды Пхеньянам. Прайшло колькі год, ужо «БДГ» прыбралі з саюздрукаўскіх паліцаў, а трапная характарыстыка ўсё яшчэ актуальная.

**Сяргей Рак**

# Бэрлін застаўся далёкім ад Варшавы



> 1 жніўня Польшча ўрачыста адзначыла 60-ю гадавіну Варшаўскага паўстаньня. Прамова канцлера Шродэра на ўрачыстасьцях расчаравала палякаў. Для халоднага стаўленьня да Бэрліна Варшава мае і больш прагматычныя прычыны.

Сяржук Вінаградаў

1 жніўня 1944 г. польская Армія Краёва распачала ў Варшаве ўзброенае выступленьне супраць нямецкай акупацыі, спадзеючыся яшчэ да прыходу Савецкае Арміі ўсталяваць у Польшчы незалежнае кіраваньне і тым самым уратаваць краіну ад сталінскага панаваньня. Аднак спадзевы палякаў на дапамогу Захаду не спраўдзіліся, а Сталін адмовіў у выкарыстаньні савецкіх аэрадромаў дзеля падтрымкі Варшавы. Паўстаньне было задушана.

Савецкія дывізіі ў бязьдзеяньні назіралі з правага берагу Віслы, як нямецкія танкавыя брыгады, падтрыманыя антыбальшавіцкімі расейскімі і ўкраінскімі злучэньнямі, жорстка расправіляліся з паўстанцамі і цывільнымі ды ператваралі Варшаву ў попел. У выніку задушэньня паўстаньня загінула, паводле некаторых падлікаў, каля 200 000 чалавек. Успрыняпае палякамі як адна з самых гераічных і трагічных старонак польскае гісторыі, Паўстаньне зьяўляецца сымбалем прагі Польшчаю незалежнасьці.

Падчас сёлетняга ўшанаваньня памяці паўстанцаў у цэнтры ўвагі знаходзіўся візыт у Польшчу нямецкага канцлера Шродэра, а таксама праблемныя аспэкты польска-нямецкіх адносінаў. Яшчэ нядаўна цёплыя і даверлівыя, узаемадачыненьні дзьвюх краін перажываюць ня лепшы пэрыяд. Прычын таму некалькі.

Незадавальненьне польскага боку выклікае дзейнасьць у Нямеччыне так званага «Зьвязу выгнанцаў» (Bund der Vertiebenen), які імкнецца прадстаўляць інтарэсы немцаў, дэпартаваных з далучаных да Польшчы нямецкіх тэрыторый. Кіруе Зьвязам дэпутатка нямецкага Бундэстагу ад партыі ХДС (хрысьціянскія дэмакраты) Эрыка Штэйнбах, чыя (адмоўная) папулярнасьць у Польшчы значна перавышае вядомасьць самога канцлера Шродэра.

Насьцярожанасьць польскага боку выклікаюць пляны Зьвязу пабудаваць у Бэрліне «Цэнтар супраць выгнаньняў». На думку польскіх назіральнікаў, такі цэнтар будзе паказваць лёс дэпартаваных немцаў ізаляванa ад гістарычнага кантэксту другое сусьветнае вайны і тым самым скажаць гістарычную праўду. Насамрэч пачатак бесчалавечным злачынствам і дэпартацыям быў пакладзены не ў 1945, а ў 1939 г., пасьля нападу Нямеччыны на Польшчу.

Яшчэ адна нямецкая незалежная арганізацыя, так званая «Пруская даверная ўправа» (Preussische Treuhand), ставіць на мэце вяртаць канфіскаванае ў заходній і паўночнай Польшчы маёмасьці яе былым нямецкім уладальнікам. Для гэтага арганізацыя пляную зьвярнуцца спачатку ў польскі, а потым — і ў Эўрапейскі суд у Страсбургу. Хоць шанцы гэткае скаргі на посьпех, на думку юрыстаў, невялікія, захады кіраўніка арганізацыі Рудзі Павэлка выклікаюць занепакоенасьць польскага боку.

На фоне такіх непаразуменьняў з асаблівай увагай чакалася прамова канцлера Шродэра ў Варшаве, бо шмат хто спадзяваўся пачуць ад нямецкага кіраўніка недвухсэнсоўныя словы, накіраваныя на вырашэньне канфліктаў. У сваёй прамове Шродэр ахарактарызаваў Варшаўскае паўстаньне як польскі гонар і нямецкую ганьбу ды падкрэсьліў адмоўнае стаўленьне нямецкага ўраду да прэтэнзій да Польшчы. Разам з тым, былі расчараваныя тыя, хто чакаў ад Шродэра шматзначнага жэсту, якім было кленчаньне колішняга канцлера Вілі Бранта ў Варшаўскім гета 34 гады таму. Акрамя таго, нямецкі ўрад дагэтуль разглядае выгнаньне немцаў з далучаных да Польшчы тэрыторый як неадпаведнае міжнароднаму праву і тым самым пакідае прастору дзейнасьці арганізацый накшталт Зьвязу выгнаньнікаў і Прускае давернае ўправы.

Такім чынам, вырашэньне польска-нямецкае спрэчкі вакол дэпартацыі насельнікаў далучаных да Польшчы Ўсходняе Прусіі, Усходняе Памэраніі ды Сылезіі фактычна адкладаецца на будучыню. Выглядае, што канфлікт яшчэ доўга будзе абцяжарваць нямецка-польскія стасункі.

У пахаладаньня адносін паміж Бэрлінам і Варшавай ёсьць і іншыя, больш глыбокія прычыны. Аднабаковая замежнапалітычная арыентацыя Нямеччыны на Францыю нанесла шкоду іміджу Нямеччыны ў іншых краінах Эўропы. Калі яшчэ зусім нядаўна, пры канцлеру Колю, Нямеччына мела ў Эўропе рэпутацыю надзейнага партнэра, то цяпер пераважае недавер. Прычынай таму — двайныя стандарты для вялікіх і малых краін Эўразьвязу, што праяўляюцца ў імкненьні Нямеччыны і Францыі абысьці нязручныя для іх правілы (напрыклад, абмежаваньне дэфіцытаў бюджэтаў). Дадамо сюды таксама жаданьне максымальна абмежаваць самастойнасьць Усходняе Эўропы ў міжнародных пытаньнях. Пры гэтым немцы разглядаюць Эўразьвяз як «нешта большае, чым проста супольную эканамічную прастору», і патрабуюць ад новых сяброў Зьвязу лаяльнасьці ў замежнай і эканамічнай палітыцы, спасылаючыся пры гэтым на эканамічную дапамогу Ўсходу і на прынцып «хто плаціць, той і кіруе».

Адным з прынцыпаў нямецкае замежнае палітыкі 90-х гадоў, на якіх настойваў польскі бок, было пазьбяганьне непасрэдных саюзаў з Масквой у абход Варшавы. Аднак сёньняшні кіраўнік Нямеччыны Шродэр разам з францускім прэзыдэнтам Шыракам раз-пораз сустракаецца з Пуціным, каб такім чынам супрацьпаставіць новую геапалітычную вось Парыж—Бэрлін—Масква Злучаным Штатам Амэрыкі і іх партнэрам. Зразумела, што такі паварот у нямецкай стратэгіі ўспрымаецца ў Варшаве зь вялікім недаверам, што падштурхоўвае Польшчу да яшчэ больш шчыльнага супрацоўніцтва з Амэрыкай.

Аднак пакуль што імкненьне Старое Эўропы «прыватызаваць» новую эўрапейскую ідэнтычнасьць як прыладу для стрымліваньня Амэрыкі вялікага посьпеху ня мела. Усходнеэўрапейскія сябры Эўразьвязу, у тым ліку і Польшча, разглядаюць Злучаныя Штаты як адзіны гарант бясьпекі ў рэгіёне і нават гатовыя на непапулярныя крокі — такія, як прысутнасьць іх вайскоўцаў у Іраку, — дзеля падтрымкі Амэрыкі. Акрамя таго, выветрываецца тое, на чым доўгі час трымаўся ўплыў Нямеччыны на Ўсходнюю Эўропу, — яе эканамічная магутнасьць. Адмоўны прырост насельніцтва праз нізкую нараджальнасьць, слабы эканамічны рост і нерэфармаваныя сацыяльныя сыстэмы пагражаюць паставіць пад пытаньне ролю Нямеччыны як самай магутнай эканомікі Эўропы. Ужо праз паўтара-два дзесяткі год наймацнейшай эканомікай Эўразьвязу можа стаць Вялікабрытанія, якая, дзякуючы дынамічнай гаспадарцы і вялікай культурнай вазе, мае добрыя шанцы зрабіцца самай уплывовай краінай Эўропы. У гэтым сьвятле польска-нямецкія непаразуменьні адлюстроўваюць геапалітычны зрух у Эўропе на карысьць Амэрыкі і Брытаніі. Здаецца, гісторыя палякаў нечага навучыла.

# Пяць дзён у рэальным сьвеце

У шаснаццаць — яшчэ непаўналетні.
Васямнаццаць — яшчэ ня дата.
Дваццаць адзін — паўнавартаснасьць Эўропы.
Сталасьць вызначаюць краты…

Працяг са старонкі 2.

Усё адбылося настолькі імгненна, што поўнасьцю асэнсоўваць гэтае здарэньне мне давялося ўжо ў камэры.

Мы яшчэ толькі ляцелі, схапіўшы таксоўку, на плошчу Якуба Коласа, а навіны ўжо сыпаліся як град з чыстага неба: аднаго за другім забіралі нашых хлапцоў, яшчэ задоўга да таго, як пачалася акцыя.

На плошчы ж і ўвогуле рабілася штосьці падобнае да рэвалюцыі: вуліца ўся гаманіла народам, паўсюль былі відаць амонаўцы, не хапала толькі танкетак. Мы ўціснуліся ў натоўп, на хаду разгортваючы расьцяжку «Малады фронт», прабіліся зь ёю ў першыя шэрагі і пачалі рухацца наперад, але праз колькі імгненьняў уперліся ў сьценку амону. Я і цяпер ня ведаю, што падштурхнула нас не зварочваць ад гэтай жывой сьценкі, а напіраць на яе, спрабуючы разьбіць. Жаўнеры цьвёрда стаялі, а мы апынуліся ў пастцы. Я ня бачыла, каго і як хапалі ды садзілі ў іхні «ментавозік», — на той момант я спрабавала адбіць у жаўнераў нашу расьцяжку, учапіўшыся ў тканіну па-мёртваму.

## У коле АМОНу

Хтосьці з амонаўцаў «па-ўладарску» паклаў руку на маё плячо, але я толькі адмахнулася — маўляў, не перашкаджай. Між тым, адбывалася страшэнная тузаніна, нас сьціснулі з усіх бакоў. Зьбілі панаму з маёй галавы, а спартыўная сумка неяк апынулася пад нагамі, сасьлізнуўшы з плячэй. Усё гэта было мне да лямпачкі, я ведала, што мае рэчы нікуды ня дзенуцца. Галоўным тады для мяне было тое, што мы зноў страчваем нашу расьцяжку. Вядома, сілы былі больш чым няроўнымі: куды дзяўчыне цягацца зь дзясяткам натрэніраваных хлопцаў? І я вельмі хутка апынулася ля аўтобуса з затрыманымі. Без расьцяжкі, якая зьнікла ў коле амону. Увайшла і спакойна села на крэсла.

А людзей хапалі і хапалі. Калі ў салёне ўжо не было жывога месца, жаўнеры пачалі піхаць юнакоў і дзяўчат нагамі. І толькі калі ўжо было відавочна, што больш нікога запіхнуць немагчыма, нас вывезьлі з плошчы. Каталі доўга. Сьпёка. Амонаўцы і самі пакутавалі ад надзвычай жорсткага ў гэты дзень сонца, сварыліся між сабою, што выклікала ў нас сьмех.

## Прыгожанькі Сярожка

У Савецкім РУУС, куды нас прывезьлі, чакаць давялося таксама доўга. Але сумаваць ніхто і ня думаў. Тэлефанавалі бацькам, каб паведаміць гэтую «радасную» навіну. Жартавалі зь нязлоснымі амонаўцамі — хлопцы нашых гадоў, фактычна гэткія ж дзеці, ставіліся да нас добразычліва. Кпілі, але бязь зьдзекаў. Адзін, прыгожанькі, падобраму заляцаўся да дзяўчат.

У мяне з сабою быў пакунак з камізэлькамі дарожных рабочых, якія плянавалася скарыстаць на акцыі і якіх не канфіскавалі. Гэты прыгожанькі Сярожка, магчыма, з думкаю забраць камізэлькі, а магчыма, і сапраўды проста зь цікаўнасьці, паспрабаваў адабраць пакунак. Я заўпарцілася. Людзі пачалі крычаць, што ён ня мае права канфіскоўваць. Пакунак парваўся. Але, відавочна, жаўнер не знайшоў там нічога для сябе цікавага і вярнуў усё мне. Інцыдэнт забыўся, нібы яго і не было, і мы працягвалі бавіць час за жартамі.

Пратаколы падпісалі ня ўсе. Магчыма, і нават хутчэй за ўсё, фраза «Ня буду нічога тлумачыць», якую я напісала на сваім пратаколе, і адыграла пераважную ролю ў маім зьняволеньні. У нас зьнялі адбіткі пальцаў, нас сфатаграфавалі. Забралі рэчы, вывернулі кішэні, расшнуравалі абутак, зьнялі гадзіньнік. Пакуль усё гэта афармлялася, я пагутарыла са сваім маладым ахоўнікам. І мы прыйшлі да паразуменьня, што ніхто ні на кога крыўдаваць ня будзе і не павінен. У іх свае абавязкі, у нас свае. І тое, што мы змагаемся супраць рэжыму, а яны арыштоўваюць нас, — так, прынамсі, і мае быць. Пакуль. Жаўнеры ўсяго толькі падпарадкоўваюцца кіраўнічай сыстэме. Прыйдзем да ўлады мы — і яны будуць служыць нам. У міліцыі і выбару іншага няма, бо жыць хочацца ўсім.

## Адна на пятнаццаць хлопцаў

На Акрэсьціна я трапіла ў адну камэру зь Любай, дзяўчынай з «Зубра». Болей у той «хаце» нікога не было. І таму першае знаёмства з гэтым памяшканьнем непасрэдна з «таго» боку дзьвярэй выклікала палёгку: я ўяўляла ўсё ў болей змрочных фарбах. Хоць раніцаю бакі нылі ад дошак. Пасьля лёгкага сьняданку з рысавай кашы і кубачка гарбаты нас павезьлі на суд. Расьпіхалі ў два аўтобусы. Жахлівая сьпёка. Мы абліваліся потам. Калі людзі пачалі перадаваць нам праз вокны аўтобуса ваду і ежу, амонаўцы і зусім пазачынялі ўсе доступы для сьвежага паветра. А самі ратаваліся ад сьпёкі марозівам.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Акцыя 21 ліпеня. Наста Азарка трапіла ў аб'ектыў фатографа «НН», калі арыштаваных разводзілі па аўтобусах.

Людзей выклікалі ў суд — каму прысуджалі спагнаньне, каго адпускалі з папярэджаньнем. Люба адчапілася лёгкім спагнаньнем. Мая чарга прыйшла ў ліку апошніх. І мне далі пяць сутак арышту. Я асабліва не адпіралася, заблытаўшыся ў сваіх тлумачэньнях і забыўшыся на ўсё. Дый адпірацца не было чаго. Хлопцы ж былі спачатку ўпэўненыя, што мяне не затрымаюць, потым — што не засудзяць. Верылі да апошняга. Але… лёс склаўся так, што, нягледзячы на сьведчаньні майго ўчарашняга знаёмага Сяроэжкі-амонаўца, які не праміную і на судзе пазаляцаца да мяне і які сьведчыў на маю карысьць, прыгадаўшы камізэлькі, што я «набыла» ў ЦУМе, — а паводле маіх слоў, я й прыехала ў Менск менавіта дзеля «шопінгу», — нягледзячы на адваката, які прасіў абмежавацца папярэджаньнем, судзьдзя ўсё-такі вынесла прысуд — пяць сутак адміністрацыйнага арышту. Значыць, так было трэба «камусьці» зьверху. Такім чынам, я апынулася адзінай дзяўчынай зь пятнаццаці «сутачнікаў». Хлопцы, вядома, былі ўражаны.

## Не блатныя і ня сьцервы

Па дарозе ў РУУС яны караценька расказалі мне, які кантынгент жанчын я магу спаткаць у камэры. І я была падрыхтаванай да ўсяго. У РУУС нам аддалі нашы рэчы і запіхнулі ў «аўтазак». Мне яшчэ пашанцавала трапіць ня ў «шафу», так што я мела хоць нейкае ўяўленьне пра рух машыны. Усё было прыстойна. І калі мы зноў апынуліся на Акрэсьціна, хлапцоў расьпіхалі ў дзьве «хаты» на першым паверсе, а мяне завялі на другі. Потым я даведалася, што «хаты» на першым паверсе — гэта штосьці накшталт «прахадной» і адтуль людзей пераводзяць у іншыя пустыя камэры вышэй. Так што мае хлапцы праз ноч апынуліся на трэцім паверсе.

Папярэджаная сябрамі, я чакала ўсяго. Але… звычайныя жанчыны. Вядома, алькагалічкі. Вядома, катора зь іх не аднойчы гасьцявала тут. Але зусім не блатныя. Зусім ня сьцервы. Нармальныя, культурныя жанчыны, якія па-добраму паставіліся да мяне. Нават з павагай, калі даведаліся, што я палітычная. Нават з радасьцю, бо са свайго вопыту ведалі, што і перадачы «з волі» будуць неблагімі (а так яно й было — вялікі дзякуй усім, хто не забываў пра мяне). Жанчыны вясёлыя, гаваркія. Вядома, са зламаным лёсам. Вядома, вартыя ня проста спачуваньняў, але й таго нармальнага жыцьця, якога яны так ці інакш былі пазбаўленыя з сваёй ці чыёйсьці вінаватасьці. І ня мне судзіць, хто больш няшчасны — «вольныя» матроны, якія асуджаюць, баючыся быць асуджанымі, ці гэтыя простыя, са зламаным лёсам жанчыны…

Дык вось. Была ў нашай «хаце» і «паханка», якая «гуляла» свой першы тэрмін, яшчэ калі я пад стол пешшу хадзіла. Была і «баландзёрка» (якая раздае пайкі), у якой таксама ёсьць свая трагедыя жыцьця і якая чакае цяпер пераводу ў жаночую калёнію.

Была з намі і бамжыха, якая гэтым разам «павысіла» свой статус — пайшла паводле адміністрацыйнага артыкулу. Дзяўчына адукаваная, культурная, зусім не падобная да бамжа. Яна і растлумачыла мне розьніцу паміж «чыстым» бамжом (якому, у прынцыпе, ёсьць дзе перачакаваць, які сочыць за сабой, ня лазіць па сьметніках і памыйках — чысты, адным словам) і бамжом, які, як кажуць, і ў Афрыцы бомж. І першыя, дарэчы, гідзяцца другіх.

Была з намі жанчына, таксама алькагалічка, таксама з прыстойным мінулым, жахлівым сёньня і, дай Бог, нармальнай будучыняй. Я параіла ёй напісаць у газэту і спадзяюся, што яе гісторыя яшчэ ўбачыць сьвет. Не для таго, каб апраўдацца. Проста іншыя «дзеячы ў пагонах» залішне шмат сабе дазваляюць. А мы не павінны моўчкі цярпець іх зьдзекі, паслухмяна схіліўшы галаву. Трэба, каб людзі зразумелі, што пагоны — гэта яшчэ не падстава, каб без пакараньня распускаць рукі. Мы, простыя людзі, мацнейшыя за ўсіх гэтых жаўнераў, таму што мы, у адрозьненьне ад іх, вольныя ў сваім выбары. Мы здольныя самастойна думаць і вырашаць. А яны ўсяго толькі падпарадкоўваюцца загаду.

Вось і выйшла, што я, самая маладзейшая з нашай вясёлай кампаніі (а цёткам было ўжо за трыццаць), мела і самы паважаны статус — палітычны. І гэтая павага адчувалася ў стаўленьні да мяне. Усе хорам падтрымлівалі мяне, перажывалі за хлапцоў, якім мне ніяк не выходзіла перадаць цыдулку, і скардзіліся на гэты ўсімі кляты рэжым.

## Азарачка, на выхад

Дарэчы сказаць, што і ахоўнікі ставіліся да мяне зычліва. Карацей, за пяць сутак я пасябравала з усімі, падарыла на памяць камізэлькі, знайшла сярод ахоўнікаў земляка зь Нясьвіжу і даведалася, у чым розьніца паміж нарамі і «шконкай». Як сказала мая новая знаёмая, Акрэсьціна — гэта санаторыя «Незабудка»: поўная свабода руху. Хочаш — сядзі. Хочаш — ляжы. Хочаш — хадзі. Санвузел на месцы. Гарачая вада кожны дзень. Памяшканьне рэгулярна праветрываецца. Кормяць — за будзь здароў. І вельмі файная ахова — ніхто ня скрадзе. Так што хочацца абвергнуць тую думку, нібыта асуджаныя жанчыны — сапраўдныя пачвары. Раз на раз не трапляе, але ўсё-такі лепей сядзець там пад 147-м артыкулам, чым пад іншым, а лепей зусім не сядзець.

Калі ўрэшце ахоўнік адчыніў дзьверы і сказаў: «Азарачка, на выхад», — я разьвіталася з усімі, нібыта і не зьбіралася пакідаць іх. Ахоўнікі запрасілі мяне яшчэ калі-нікалі наведаць іх гасьцінныя сьцены, і, праўду кажучы, пасьля гэтых сутак мне ня страшна будзе ўбачыць усіх гэтых людзей зноў. Але лепш, каб у іншым месцы і пры іншых абставінах. А на выхадзе мяне чакалі сябры, кветкі, шампанскае, цукеркі… Дзякуй вам усім за тое, што думалі пра мяне, што прыйшлі сустрэць. Кветкі цяпер стаяць у вадзе на маім століку — бел-чырвона-белыя, як наш сьцяг, — і пераконваюць мяне ў тым, што наша перамога блізкая.

І будзе час, калі мы будзем ласавацца марозівам, а той, хто аддае загады дзецям зьбіваць дзяцей, — сядзе. І не на пяць сутак, а на шматшмат гадоў.

**Настасься Азарка, Нясьвіж**

КУЛЬТУРА UNUSUAL

# Шматкі «Звязды»


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Выстава да 60-годзьдзя вызваленьня Беларусі ў Доме масонаў

На выставе, разьмешчанай у Музэі тэатральнай і музычнай культуры, зачароўвае ўжо сам шматслаёвы, скарбонкавы хранатоп. Будынак уяўляецца скрынкай, у якую падступны майстар замест аднаго дна ўклаў чатыры (вобразы любае батлейкі ды скрыні Пандоры зьліваюцца ў адзін). Знадворку — вулка зь ленымі мінакамі, выхаванымі мыльнымі опэрамі, салютамі, кока-колай ды дэкрэтамі — нашая «плюс XXI-стагодзьдзевая» рэчаіснасьць? А ты пераступаеш ганак Дому масонаў, што, паводле легенды, злучаецца падземным ходам з домам сьлыннага стваральніка «Міцкевіча на скале Аюдаг» Валенція Ваньковіча, і міжволі далучаешся да старадаўняе містычнае мудрасьці «вольных муляраў», завадатараў змаганьня ды змоваў у XVIII—XIX стагодзьдзях.

На першым паверсе — асноўная экспазыцыя. Акіян народнае культуры мае неакрэсьленыя межы ды біяграфію старое авантурысткі, што ўжо сама не згадае ўсіх сваіх подзьвігаў. Яскравая шчырасьць саломкі, хітраватая наіўнасьць маляваных твараў лялек, драўляная палітычнасьць ды дзяржуная крэатыўнасьць батлеек (у стварэньне якіх уклаў душу навучэнец Акадэміі мастацтваў).

А на другім паверсе вас сустракае таемная выспа савецкае рэчаіснасьці. Вока чапляецца за аскепкі, галінкі, шматкі, якія наліплі на жорны гісторыі і — захаваліся. Афіцыйныя падзякі акторам, поўныя таўталёгіі ды стылёвых памылак, сьціпла падпісаныя «Сталін». Скрадзеныя зь Нямеччыны «для абучэньня дзяцей» музычныя інструмэнты дакорліва вылупліваюцца на цябе праз шкло вітрынаў. Агромністыя партызанскія гусьлі пахнуць хваёвым дымам ды порахам. Самотна пазірае з фатаздымку Ўсеславянскага зьезду Янка Купала, аўтар непаліткарэктнага вершу «Сваякі», у якім жадае гэткім жа братам-славянам боўтацца на галінастым беларускім дубе. Па сьценах гарлаюць бяздарныя карыкатурныя выявы Гітлера ды вершы пра непераможную Савецкую Армію. Са стану патрыятычнае весялосьці выводзяць пакойчыкі акторак. Адчуваеш сябе злодзеем ці няўдакам-папарацы, якога вось-вось зловіць за каўнер велічная гаспадыня. Легкадумны бляск ды нязмушаная дзіцячасьць у пакойчыку Александроўскай. Вэер, піяніна, таямніца карункаў… Бракуе хіба матылькования напеву рамансу. Прыродная мудрасьць жытла Станюты. Як упырогаваньне зь лістоў ды шышак — існае ды некранутае. Бы сапраўдныя пачуцьці й лёсы, што працярушваюць сабе шлях праз друз ідэалёгіі, шматкі дзяржаўных газэт ды суседзкіх паклёпаў, нястачу ды зьдзекі да сапраўднага жыцьця.

**Болачка**

**Дом масонаў (Музэй гісторыі тэатраў) знаходзіцца па адрасе Музэйны завулак, 5. Т.: 229-26-67, 226-07-69, 226-08-11**

## Прэзэнтацыя кнігі Насевіча

12 жніўня а 16-й у Гістарычным архіве (вул.Крапоткіна, 55) адбудзецца прэзэнтацыя манаграфіі Вячаслава Насевіча «Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе». Гэта ўнікальная праца: на прыкладзе вёскі Корань, што на Лагойшчыне, аўтар дасьледаваў гісторыю беларускай вёскі наагул — ад XVI да XX ст.

## Спартакіяда дэмакратычных прафсаюзаў

У сярэдзіне жніўня ў Наваполацку пройдзе традыцыйны Рэспубліканскі спортфэстываль дэмакратычных прафсаюзаў памяці Міхала Путра. Арганізатар гульняў — незалежны прафсаюз ААТ «Палімір». У праграме — футбол, валейбол, шахматы, рыбацтва, а таксама конкурсы побыту й самадзейнасьці. Фэст прысьвечаны памяці аднаго з пачынальнікаў незалежнага прафруху ў горадзе на пачатку 90-х XX ст.

**БелаПАН**


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Сярэднявечны ўік-энд у Наваградку

У суботу—нядзелю ў Наваградку адбудзецца трэці фэст сярэднявечнай культуры «Наваградзкі замак'2004» з інсцэнізацыяй крыжацкага штурму, рыцарскім турнірам, канцэртамі, рамесьнікамі, сярэднявечнай кухняй і гульбішчамі. Зайграюць з паўтузіна гуртоў. Аляксандра і Канстанцін выканаюць песьні з новага дыску «Мой Галілей: Лепшае». Яны дадуць сольны канцэрт на цэнтральным пляцы а 18-й, а таксама возьмуць удзел у гала-канцэрце. Карысная інфармацыя пра фэст для гледачоў і ўдзельнікаў — на сайце www.rasa.fromby.net. Спыніцца можна ў паходным стане ў вёсцы Сялец або ў наваградзкім гатэліку.

**Сяргей Будкін**

## Клюбнае жыцьцё

**Гудвін**
Т.: 226-13-06, 626-13-03
**12** (чц), 21.00 — «P.S. Jazz».
**13** (пт), 21.00 — Аркадзь Эскін і ягоны джаз-квартэт.
**14** (сб), 21.00 — група «Мадэра Хард Блюз».

**Bronx**
Т.: 288-10-61, velcom: 103 і 105
**12** (чц), 22.00 — клюбны чацьвер: dj Mitya.
**13** (пт), 22.00 — live jazz: N.C.
**14** (сб), 22.00 — «Start party»: dj Bergamo, dj Top.

**Белая вежа**
Т.: 284-69-22, 239-16-00
**12** (чц), 19.00 — dj Dee, White Tower: dj Top, dj Grizzly.
**13** (пт), 22.00 — «Euroclub»: dj Mixell, go-go. Квіткі: 10000, 20000.
**14** (сб), 22.00 — «Euroclub»: dj Mixell, go-go. Квіткі: 10000, 20000.

**Бліндаж**
Т.: 219-00-10
**12** (чц), 23.00 — dj's Egor/ Zolart.
**13** (пт), 23.00 — dj's Egor/ Zolart.
**14** (сб), 23.00 — dj's Egor/ Zolart.

**X-Ray**
Т.: 223-93-55
**13** (пт). 22.00 — dj-bar with dj Top.
**14** (сб), 22.00 — dj-bar with dj Noche.

**Ямайка**
Т.: 252-07-26
**13** (пт), 2.00 — «The Afterparty»: dj Topj, dj Mitya.
**14** (сб), 2.00 — «The Afterparty»: dj Noche, dj Simone.

## Менская кінаафіша з 13 да 15 жніўня

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Чалавек-павук-2» (прэм'ера): **13—15** (пт—ндз) 15.00, 16.00, 17.30, 18.30, 20.00, 21.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Забіць Біла-2»***: **13** (пт) 13.30, 16.00, 18.30, 21.00; **14, 15** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Яшчэ пра вайну» (маст/ф), «За два крокі ад гільяціны» (д/ф): **13—15** (пт—ндз) 18.00.
«Законы прывабнасьці»: **13, 14** (пт, сб) 20.00; **15** (ндз) 20.00 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Чалавек-павук-2» (прэм'ера): **13** (пт) 16.10, 18.30, 21.00; **14, 15** (сб, ндз) 16.10 (іл), 18.30, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)
«Чалавек-павук-2» (прэм'ера): **13** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **14, 15** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)
«Кепскія дзяўчаты»: **13** (пт) 17.20, 19.20, 21.20; **14, 15** (сб, ндз) 15.20, 17.20, 19.20, 21.20.
«Забіць Біла. Фільм 2-і»***: **13** (пт) 18.20, 20.40; **14, 15** (сб, ндз) 16.00 (іл), 18.20, 20.40.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Кепскія дзяўчаты»: **13** (пт) 14.40, 16.50, 19.00, 21.10; **14, 15** (сб, ндз) 14.40 (іл), 16.50, 19.00, 21.10.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Пасьлязаўтра» **13—15** (пт—ндз) 16.20, 18.40, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Законы прывабнасьці»: **13** (пт) 11.00, 15.10, 19.00; **14, 15** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.10, 19.00.
«Забойная парачка: Старскі і Хатч»: **13—15** (пт—ндз) 13.00, 17.00, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Юнаму гледачу

**«Аўрора»**
«Напалеон»: **14, 15** (сб, ндз) 14.00.

**«Берасьце»**
«Кевін у краіне Драконаў»: **14, 15** (сб, ндз) 11.50.

**«Дружба»**
«Мулан»: **13** (пт) 10.30; **15** (ндз) 13.00.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **14** (сб) 13.00.

**«Мір»**
«Цуды ў Рэшатаве»: **13** (пт) 10.30; **14, 15** (сб, ндз) 13.00.
«Дзеці шпіёнаў 3D: гульня скончана»: **13—15** (пт—ндз) 14.00.

**«Перамога»**
«Пітэр Пэн у Нідзеляндыі»: **14, 15** (сб, ндз) 13.10.

**«Піянер»**
«Карпарацыя монстраў»: **13—15** (пт—ндз) 10.20.
«Курыныя ўцёкі»: **13—15** (пт—ндз) 12.20.
«Згубленыя ў падзямельлі»: **13—15** (пт—ндз) 14.20.

КІНО Ў МЕНСКУ

# І павукі бываюць самотнымі



Чалавек-павук-2 (Spider-Man 2) ЗША, 2004, каляровы, 127 хв.
**Жанр:** Комікс
**Адзнака:** 6,5 (з 10)

Рэжысэр Сэм Рэймі, які распачынаў сваю кар'еру хуліганскімі «Злобнымі мерцьвякамі», утульна адчувае сябе як аўтар гераічных коміксаў, прызначаных для сямейнага прагляду. Карцінка шыкоўная і вылізаная, драйв не такі нахабны, шурпаты (і крывакэрны), затое ёсьць шчодрыя мэлядраматычныя рэфлексіі й багатыя атракцыёны.

Ворагам Чалавека-павука ў другой частцы выступае ашалелы доктар Актавіюс (Альфрэд Маліна), да сьпіны якога прыклепаліся мэталічныя маніпулятары з разумовымі здольнасьцямі й кепскімі звычкамі. Адна з найбольш відовішчных звычак шчупальцаў — хапаць візгатлівых дзявулек, бабулек і пасажыраў мэтро і выкарыстоўваць іх у якасьці закладнікаў.

Натуральна, што перамагчы такога Васьмінога здольны толькі Чалавек-павук. Але ў ціхмянага Пітэра Паркера (Тобі Магуаер) сур'ёзныя праблемы: надчалавечыя схільнасьці мала сумяшчальныя з асабістым жыцьцём.

Пакуль Павук выратоўвае слабых, героя кідае нявеста (Кірстан Данст), да таго ж ва ўнівэрсытэце ў тайнага чleністаногага адрастаюць акадэмічныя «хвасты». Мэлядраматычныя пакуты на гэтыя тэмы складаюць ладную частку экраннага часу, але нельга назваць іх дарэмнымі. Нечакана забаўная падаецца сцэнка, калі Чалавек-павук едзе ў ліфце і скардзіцца выпадковаму спадарожніку на сваё цяжкае супэрмэнскае жыцьцё.

Самымі ўдалымі момантамі фільму зьяўляюцца бойкі паміж Павуком і Васьміногам на мурах хмарачосаў ці на даху электрычкі, якая мчыцца па Нью-Ёрку. У змаганьне шчупальцаў і павуціны трапна ўплецена тонкая іронія і пашана да культавых герояў амэрыканскіх коміксаў.

Кранае мэлядраматычная сцэнка, калі абывацелі абараняюць аслабелага Чалавека-павука ад Васьмінога. Так дзеці абараняюць свае цацкі.

Але гэтыя цацкі ўзрошчаныя на амэрыканскім асфальце — і нам іх ніколі не зразумець напоўніцу.

**Андрэй Расінскі**

НАВІНЫ КУЛЬТУРЫ

## Музэй Быкава

Распрацоўкай канцэпцыі музэю-сядзібы Васіля Быкава займаецца мастак Эдуард Агуновіч і дырэктар Вушацкага музэю народнай славы імя У.Лабанка Мікалай Кірпіч. Як будзе выглядаць музэй, стане вядома да канца году.

## Няможна без «базараў»

Традыцыйны маладачанскі фэстываль беларускай песьні й паэзіі ў 2005 г. спыніць існаваньне. Ён стане міжнародным фэстывалем беларускай і расейскай песьні й паэзіі. Ініцыятыву гэтую агучыў міністар культуры Леанід Гуляка, падтрымалі ягоны расейскі калега Аляксандар Сакалоў і стваральнік фэстывалю Міхаіл Фінберг.

## Баранавічы, Сан-Рэма, Ангулем...

Баранавіцкі гарадзкі канцэртны аркестар возьме ўдзел у Міжнародным фальклёрным фэстывалі ў Францыі, што пачнецца ў Ангулеме 18 жніўня. Для баранавіцкага аркестру гэта будзе восьмая паездка на фальклёрны фэстываль. Спаборнічаць ім давядзецца з калектывамі з дванаццаці краін Эўропы. Летась музыкі з Баранавіч ажыцьцявілі інструмэнтальнае суправаджэньне ўсіх конкурсных песень на фэстывалі італьянскай музыкі ў Сан-Рэма.

## Музэй лесу ў Рэчыцы

У Рэчыцы створаны Музэй лесу. Сярод сямісот яго экспанатаў можна ўбачыць каменную сякеру, рэдкія дакумэнты XIX ст. А ў вёсцы Забродзьдзе Вялейскага раёну мае зьявіцца музэй, прысьвечаны салдатам расейскага войска часоў першай сусьветнай вайны. Ініцыятарам яго стварэньня стаў жыхар вёскі мастак Барыс Цытовіч. Для экспазыцыі Цытовіч сабраў старыя картачкі, рэдкія архіўныя матэрыялы, асабістыя рэчы вайскоўцаў, палеглых на Вялейшчыне.

## Памерла Ляура Бэці

У 70 гадоў памерла кіназорка Ляура Бэці. Пачаўшы кар'еру як джазавая сьпявачка, у кіно яна дэбютавала ў фільме Фэліні «Dolce vita» (1960). Здымалася таксама ў Бэрталючы («Апошняе танга ў Парыжы», 1973) і Пазаліні («Тэарэма», 1968).

## Памёр Карт'е-Брэсон

У 96 гадоў памёр адзін з найбольш славутых фотарэпартэраў XX ст. Анры Карт'е-Брэсон. Фатаграфаваў перамогу Мао, сьмерць Махатмы Гандзі, грамадзянскую вайну ў Гішпаніі, здымаў Матыса, Сартра і Эдыт Піяф. Быў першым замежным фатографам, які ў 1954 г. трапіў у СССР.

## Музэй няскончаных скульптур

У Асуане (Эгіпэт) адчыніўся музэй няскончаных старажытных каменных скульптур. Некаторыя экспанаты музэю налічваюць па 4,5 тысячы гадоў.

## «Мур» — мюзыкл

З самага вядомага альбому гурту «Pink Floyd» «Мур» («The Wall») кампанія «Marimba Films» зробіць мюзыкл. У 1982 г. паводле альбому ўжо быў зьняты фільм, які вялікага посьпеху ня меў.

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl**

# Начныя кашмары

Андрэй Расінскі

Калі пачынаюць ганарыцца Беларусяй, то звычайна ўзгадваюць Скарыну, крыж Эўфрасіньні Полацкай, трактары, блакітныя азёры й рэкі, памяркоўнасьць, буслоў, летуценныя малюнкі Шагала, зуброў і кіношных партызанаў. Але ёсьць яшчэ схаваныя і жудасныя гісторыі, стрыманасьць, нямотнасьць і калатнеча, позірк бездані, твань і страх на цывілізацыйным разломе.

Начныя кашмары — неад’емны атрыбут Беларусі, голас сівых стагодзьдзяў і рэкі крыві, эскаляцыя жаху — і адзін з самых пэрспэктыўных экспартных тавараў. Тавар гэты не называецца, пра яго маўчаць даведнікі і яго не прапануюць у крамах, яго сарамліва хаваюць ад пажадлівых пакупнікоў — але ім заўжды карыстаюцца і маюць з гэтага неблагі прыбытак. Прыйшоў час аддаць належнае жахам, апрануць іх па прыстойнай магільнай модзе — і паставіць на службу краіне і людзям.

## I. Пантэон найлепшых кашмараў

### 1. Клопаты ваўкалака



Беларускі фальклёр багаты на ўсялякіх нячысьцікаў, дамавікоў, лесуноў і іншых кандыдатаў у героі «бульба-хорараў». Чаго варты адзін Кадук зь вялізнай галавой і шырокім горлам, які зьяўляецца ў ліхую часіну. Дарэчы, Адам Глёбус ужо скарыстаў стракаты пантэон у брутальных эратычных гісторыях — зьдзеклівых і сучасных.

Ніхто не перашкаджае ажывіць таварышаў у кашмарных снах вялікага гораду — ці то трымценнымі намёкамі, ці то нястрыманай трэшавай буфанадай. Працы для бульбыхорару хопіць.

Самым пэрспэктыўным фальклёрным пэрсанажам беларускіх жахаў па праве падаецца ваўкалак.

Дваістае стаўленьне беларусаў да ваўкалакаў — і спачуваньне і жах — стварае неабходную інтанацыю, а культавая фігура Ўсяслава Чарадзея задае гістарычны фон і неабходную апору. Праз стагодзьдзі князь-ваўкалак увасабляецца; мае нашчадкаў; зьяўляецца воўкам; кахае; абараняе…

### 2. Трансыльванія непакоіць

Усяслаў Чарадзей — далёка не адзіны беларускі гістарычны дзяяч зь небясьпечнаю славаю. Сьцяпан Батура, выдатны ваяр і таленавіты палітык, нечакана памёр і быў анатамаваны — сёньня на месцы гэтай падзеі кунсткамэра (!!). Акрамя таго, паходзіць наш кароль з Трансыльваніі, як і самы знакаміты румын граф Дракула. Зямляцтва даецца ў знакі — сваячка Сьцяпана Батуры, графіня Эржэбэт, забівала маладых дзяўчат і купалася ў іхняй крыві, каб вярнуць сабе маладосьць (вярнуць не вярнула, але крывішчы было шмат). Гэтаму трансыльвальскаму эпізоду прысьвечаны эратычны фільм Валяр’яна Бароўчыка.

Так што праз дынастычныя сувязі Беларусь ужо залучана ў Кашмарны Інтэрнацыянал.

### 3. Злыя чары Габрыеля Грубэра

Духоўныя асобы таксама вызначыліся ў сфэры загадкавага і жахлівага — асабліва ў часы Асьветніцтва. Ня буду згадваць, што езуіты, каб вымантачыць грошы ў сквапнай ліцьвінскай шляхты, часам пераапраналіся прывідамі і танчылі перад ашалелымі ахвярамі данс макабр, — гэта хутчэй дробныя дэталі.

А вось кіраўнік Ордэну езуітаў Габрыель Грубэр — як сьцьвярджае знаўца полацкай гісторыі і пісьменьнік Уладзімер Арлоў — мог бы прэтэндаваць на ролю нашага доктара Фаўста. Грубэр стварыў дзіўныя інжынэрныя цацкі, адна зь якіх, паводле чуткі, была жывая мэханічная галава. Гэта ня толькі робіць гонар езуіцкаму майстру, але ўпісвае яго ў пантэон такіх знакавых пэрсанажаў, як доктар Франкенштэйн, доктар Калігары і доктар-маньяк з «Мэтраполісу» Фрыца Ланга.

### 4. Мёртвыя хаваюць жывых

Выхаванцам полацкіх езуітаў быў і Ян Баршчэўскі, і гісторыя пра мэханічную галаву паслужыла яму падставаю для страшнай казкі пра драўлянага дзядка.

Рамантызм XIX ст. шмат зрабіў для рэабілітацыі і закліканьня жахаў. Рамантыкі адкрывалі народ і тайныя забабоны; у руінах драмала мінулае — яно прыцягвала й чаравала, але ўжо сышло і таму было бясьпечным.

Туга па страчаным і забытым была не ідыліяй, але помстай мінулага дня сёньняшняму; старыя духі ажывалі; двайнікі, альхімікі, цені, згубленыя душы — і злыя чараўнікі-навукоўцы вялі рэй.

Драўляны дзядок, кабета Інсэкта, цмок, які вывеўся зь яйка пеўня, — далёка ня поўны сьпіс загадкавага і жахлівага паводле Яна Баршчэўскага.

Віктар Тураў паставіў карціну «Шляхціц Завальня», але яна і блізка не дакранулася да полацкіх кашмараў. Так што ўвасабленьне страшных казак Баршчэўскага яшчэ наперадзе.

Адылі беларускія традыцыі жахлівага былі прадоўжаны Караткевічам, Гарэцкім і Быкавым.

### 5. Асьветніцтва цемрашальства

Цывілізацыйны разрыў, адчуты рамантыкамі як раскол паміж слынным мінулым і нікчэмным сёньняшнім, Караткевіч увасобіў наноў. Ёсьць акупацыйная, няправільная ўлада над забраным краем, ёсьць прыгнечаны народ, хавальнік праўды і забабонаў, — і ёсьць інтэлігент, які правільна прачытвае старажытныя легенды і вызваляе народ. (На гэтай схеме трымаецца ўся ідэалёгія Адраджэньня.)

Караткевіча дакаралі, што ягонае «Дзікае паляваньне» нагадвае «Сабаку Баскервіляў», але ёсьць проста агульная асьветніцкая мадэль. Болей за тое, у Конан Дойла і Караткевіча існуе адна першакрыніца — Жэв699данскі зьвер.

У XVIII ст. француская правінцыя Жэвадан пакутавала ад нападаў страшнага й няўлоўнага зьвера. Ахвяры за ахвяраю, забітыя і разарваныя. Кашмар гэты так і ня быў разгаданы, хаця зьвер, здаецца, быў злоўлены.



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

Гэтым падзеям прысьвечана некалькі фільмаў, сярод іх — дынамічнае і відовішчнае «Брацтва ваўка». Як і ў творы Караткевіча, француская шляхта аб’яднаная тайнаю жуды і выкарыстоўвае пачвару і забабоны, каб трымаць у страху насельніцтва.

Зачараваньне цемрашальствам навідавоку, але яно выкарыстоўваецца ў адукацыйных, асьветніцкіх мэтах. «Дзікае паляваньне» нагадвае гатычныя раманы Ганны Радкліф, дзе былі замкі, тайны, жудасьці — але ўсё завяршалася рацыянальным тлумачэньнем.

Барацьба героя за сьвядомасьць народу набывае ў «Чорным замку Альшанскім» шматабяцальныя абрысы параноі, калі псыхіятар — злачынец і здраднік, а выпадковы кіяскёр — антыбеларускі агент па распаўсюдзе наркотыкаў. Такім сюжэтным паваротам пазайздросьцілі б і giallo, крывавыя італьянскія жахі, дзе падзеньне з загадкі ў вар’яцтва — звычайная справа. Але Караткевіч ніколі не кідае надзеі на асьветніцтва.

Гэтыя спробы сёньня выглядаюць крыху наіўнымі. Нацыяналасьветніцкія мэты, якія калісьці ставіліся, часткова вырашаны, і хаця разьвіцьцё беларушчыны прыціскаецца, яна ўжо пануе ў сэрцах.

Страшныя гісторыі ад Караткевіча натхняюць, яны здольныя ператварыцца ў сучасныя кампутарныя гульні й новыя фільмы — часам зусім нечаканыя.

Так, «Навінкі» даўно ўжо песьцяць ідэю карціны «Дзікае паляваньне караля Траха», дзе знаёмая гісторыя, у адрозьненьне ад фільму Рубінчыка, эратызуецца цалкам: хлопец зь дзяўчынай, якія на старажытных могілках займаліся адукацыйнай рытмікай, абуджаюць дзікага караля зь ягонай сьвітай. Страхалюдзтва істоты адпавядае прозьвішчу.

Гэта забаўны трэшавы жарт, а вось начныя кашмары паводле Максіма Гарэцкага — куды сур’ёзнейшыя і радыкальнейшыя.

### 6. Дзьве душы на адно цела

Бездань паміж адукаванымі асьветнікамі-адраджэнцамі і цёмным народам не дае спакою Гарэцкаму, але штучнай надзеі на рацыянальную развязку, на шчасьце, не застаецца. З разломаў падымаецца мэтафізычны жах, адвечныя кашмары нараджаюцца ў цемры.

«Што яно?» — сьмерць і «Трасца»; а «роднае карэньне» — зарука немага крыку. «Стары прафэсар» адмаўляецца ад розуму — але губляе і жыцьцё блізкага чалавека.

Дзьве душы прэтэндуюць на адно цела і не знаходзяць ладу — і застаецца цела, пакінутае без душы: і не жывое, і не памерлае, і не сьвятое, і не праклятае.

Адвечны шлях — блуканьне з жахамі. Застаецца іх назваць, увасобіць, экранізаваць і прадаць.

### 7. Байкі жыцьця са Сьмерцю

Апошнія творы Быкава — гэта выдатныя экзыстэнцыйныя жахі, прыпавесьці, дзе ўжо няма жорсткай прывязкі да канкрэтнага часу, акрамя пазнавальнай атмасфэры кашмару.

«Байкі жыцьця» і вясёлая гісторыя «Трупа» нагадваюць атрутную зомбі-прыпавесьць Джорджа Рамэра «Дзень мёртвых», хаця, здаецца, Быкаў пра такое падабенства не падазраваў. Упартае рабскае зьнябеньне, асіплае ад магільнае сырасьці, аніяк не жадае памерці і забівае ды вучыць жывых — гэта і ёсьць беларуская зомбі-гісторыя.



### 8. Ружовы туман

Ружовы савецкі туман — яшчэ адна невычэрпная крыніца жахаў. Варта толькі гэты туман правільна ўтылізаваць.

Дарыё Арджэнта — італьянскі магістар хорару — быў у захапленьні ад маскоўскай сталінскай архітэктуры. Італьянскі мастак папросту ня быў у Менску…

Шэрыя дамы «Гораду Сонца», урачыстасьць і цяжкая важкасьць састарэлай і мёртвай савеччыны. Ня трэба канкрэтнага Леніна, зорачак і сярпа з молатам — ёсьць чырвоныя прыцемкі ў засені статуі і трупная замшэласьць камянёў.

Савецкі жах губляе канкрэтыку і ператвараецца ў ідэальную прахаладу краіны вечна памерлых.

Расейскі рэжысэр Мікалай Лебедзеў ужо скарыстаў Менск як загадкавую, атмасфэрычную і жахлівую дэкарацыю для свайго маньячнага трымценьніку «Паклоньнік». Але маньячныя giallo — не адзіна магчымы прадукт ружовага туману.

Абагульненасьць, непрывязка кашмараў дазваляе ім блукаць з краіны ў краіну. Так, мала хто заўважыў, што мэтафарычныя апавяданьні лідэра сплатэрпанку Клайва Баркера «Блюз сьвіной крыві» і «Сэкс, сьмерць і зьзяньне зорак» быццам наўмысна напісаны пад беларускія дэкарацыі.

А адвечныя беларускія партызаны, вампіры і мсьціўцы?

## II. Тайная манаполія на жахлівае

У Савецкім Саюзе жудасьцяў не было. Было будаўніцтва сьветлай будучыні, піянэрскія сьпевы і радасныя спаборніцтвы даярак і трактарыстаў.

У чырвонай засені не магло быць жахлівага, бо была камуністычная партыя — сонца, сьвятло і абарона ад усяго нячыстага, бясконцая крыніца шчасьця, якая не саромелася раздаваць сваю ласку ўсім ахвотным і — пад пагрозай расстрэлу — усім неахвотным.

Адна з самых арыгінальных зданяў — не мінулага, але будучага! — якая калісьці ў пралетарскім рызьзі блукала па Эўропе, замацярэла, атлусьцела, плявалася сківіцамі і цалкам адмаўляла сваю по-

# Беларусі

вязь з падазронымі астральнымі пэрсанажамі.

Калі зьняцку штосьці і здаралася ня тое, дык гэта былі прыкрыя «перажыткі мінулага». Але галоўныя жахі адбываліся па той бок жалезнай заслоны: там вылі гіены імпэрыялізму, акулы капіталу жралі абывацеляў без гарніру, здараліся суцэльныя катастрофы і швэндаліся непрыкутыя Франкенштэйны.

Школьніц заклапочвалі кашмарамі ў Гандурасе, і партыя ясна паказвала, каго і чаго варта баяцца. І гэта нядзіўна, бо страх — гэта бездакорная валюта ўлады, крыніца вернасьці і экстазу.

Таталітарныя рэжымы маюць манаполію на жахлівае — і гэта сарамлівая іхняя тайна. Уначы чорныя варанкі забіраюць людзей, а днём тыя, хто застаўся ў жывых, маніфэстуюць свой страх — на сходах і дэманстрацыях. Яны выкрываюць не свайго ненаеднага забойцу, а замежную пачвару-шпега. Бо ворагі — гэта нелюдзі і пачвары, а таталітарная ўлада — сьвятая і ў белых шатах.

Гістэрыка, крыкі, садызм і нэкрафілія — такое было з кожным таталітарным рэжымам. Мэтафізычны жах, зь якім чалавек нараджаецца й жыве, набывае тут жорсткую і абавязковую сацыяльную прапіску — у адпаведнасьці зь сёньняшняй лініяй партыі. «Крыважэрнае NATO», «жыды», «імпэрыялісты» — жахаўкі, якія мусяць адцяняць бездакорнасьць існай сыстэмы, — гэта ўсё злачынная і паказная прафанацыя чалавечых страхаў.

Адабраны і нацыяналізаваны жах запрыгоньвае. Ён мацунак унутры краіны і толькі зрэдку тавар на экспарт — у бразгаце зброі, гераічных крыках і дазаваных сьлёзах пра ўласныя ахвяры. Мілітарная тэматыка пераважае. Але дыктатарскі рынак нягеглы, недасканалы — гэта заўжды нішчымная карткавая сыстэма для сваіх — прыкутых і ўвязьненых спажыўцоў. Тут не дазволена прыватнае прадпрымальніцтва.

Спроба пазбавіць жах жорсткай сацыяльнай прапіскі і прарвацца да жаху мэтафізычнага выклікае рэзкае нездавальненьне, як гэта было з кнігай «Карнікі» Алеся Адамовіча.

Няма чаго казаць пра жах чысты, пра неймаверныя і прыдуманыя фантазіі, калі чалавек спрабуе прысабечыць жах, пагуляць зь ім, напалохацца і пазбавіцца ад яго, — тут чалавек цалкам вольны і сам сабе гаспадар. Гэта падрывае ўсю палітэканомію жаху пры дыктатуры, парушаецца галоўная манаполія — манаполія на кашмар.

Менавіта таму фільмы жахаў, фантастычныя жудасныя гісторыі забароненыя ў таталітарных дзяржавах болей за сэкс. Да жудасьцікаў ставяцца з грэблівасьцю і агідай, маўляў, «глядзяць іх толькі ненармальныя людзі ў звар’яцелым капіталізьме».

Маньяк Андрэй Раманавіч Чыкаціла таксама не любіў жахавак. Ён натхняўся гісторыямі іншымі. Як сьведчаць псыхіятры, спакушаным ахвярам забойца абяцаў «паказаць кіраўніка партызанскага атраду» — пасьля чаго выразаў у дзяцей грудзі і языкі.

Чыкаціла быў правільным і ўзорным савецкім чалавекам. Як правільным і ўзорным быў беларускі патрашыцель Міхасевіч, які лічыў сябе «віцебскім патрыётам». Гэтыя істоты былі часьцінкамі манаполіі на кашмар, якога не кантралявалі, — яны былі з сыстэмаю ў любаснай сувязі, забойцы адцянялі і падкрэсьлівалі манаполію.

І ўсё ж такі «жахлівая» манаполія не была цэласнай. Несьвядомым дзецям, яшчэ «неўкамунізьдзеным» у савецкім грамадзтве, дазволена мець сваю тэрыторыю: Георгі Міляр — нязьменная Баба Яга і Кашчэй Бесьсьмяротны — быў галоўнай хорар-зоркай дзіцячых фільмаў.

Зь сярэдзіны 80-х манаполія на начныя кашмары пачала разбурацца. На рынку зьявіліся маньякі, здані і прывіды ўсіх гатункаў — і сёньня гэтая крыніца не перасыхае.

Але палітэканомія пачуцьцяў мае свае правілы. Каб жахі былі канвэрсоўныя, служылі людзям і вызвалялі іх — яны мусяць нараджацца на сваёй тэрыторыі, мець традыцыі.

Такія традыцыі ў Беларусі ёсьць.

## III. Жахі на службе Беларусі

### 1. Чыстая жуда супраць чарнушкі

Дакладныя замкі гатычных раманаў — гэта ачышчаныя жахі. Жах у іх пазначаны, але агорнуты трымценнай і няпэўнай аўрай часу, аўрай вечнасьці. Такая ж аўра ў страшных прыпавесьцях.

Беларускае мастацтва даўно пакутуе на адукацыйна-адраджэнскі дыдактызм кашмараў (як люстэрка — шавіністычна-лукія жахі БТ).

Мусіць быць чысты жах. Ён зарука ад старэньня — і ад чарнушкі, якая шчэ выторкваецца ў творах Юр’я Станкевіча пра чужынскіх прыбышоў і лесьбіек-крымінальніцаў.

Вызваляе — чысты жах.

### 2. Апраўданьне кашмару

Але чаму я так упэўнены, што жах вызваляе? Чаму я патрабую разбурыць манаполію на кашмар, але зусім ня зьнішчыць яго?

Няўжо жах не запрыгоньвае? Не ператварае чалавека ў раба? Не прымушае яго калаціцца ад бездапаможнасьці?

Гэта і так — і ня так.

Запрыгоньвае комплекс ахвяры, запрыгоньвае штохвілінная прывязка да надзённых патрэбаў партыі, прэзыдэнта і недабітай сельскай гаспадаркі.

Рабства — палохаць і ганарыцца «кожным першым палеглым», ворагам ля мяжы, цэзіевым дажджом і «мовай гіне».

Жах запрыгоньвае, калі ён вам не належыць, калі вы яго не кантралюеце і не гуляеце зь ім, як дзіця. Калі жах прысабечваецца пэўнай групоўкай, яна пачынае вас палохаць і вамі кіраваць.

Каб гэтага не адбылося, трэба дасягнуць чыстага жаху бяз жорсткіх сацыяльных прывязак — і бяз штучнага адраджэнскага дыдактызму, — трэба выявіць жахі, размножыць, ачысьціць, расфасаваць і прадаваць — як унутры краіны, так і за яе межамі.

Як кожнае дзіця мае права на страшную казку, так і кожны народ мае права на свае кашмары. Кожны народ мае права гуляць зь імі, распаўсюджваць, прапаноўваць іншым.

Жахі мусяць служыць Беларусі.

**Малюнкі пачвар Валер’я Славука**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Ангельска-беларуска-расейскі слоўнік** / Т.Суша, А.Шчука, А.Таболіч, В.Федасеева; Пад агул. рэд. Т.Сушы, А.Шчукі. — 2-е выд., папраўл. і дапрац. — Менск: БелЭн, 2004. — 400 с. 2000 ас.

Пры адсутнасьці буйных беларускіх слоўнікаў для працы з заходнімі мовамі гэтае выданьне ня можа не прыцягнуць увагі. Слоўнік на 10000 лексычных адзінак, складзены аўтарытэтным калектывам выкладчыкаў Менскага лінгвістычнага ўнівэрсытэту, забясьпечыць пераклад ангельскіх тэкстаў сярэдняй складанасьці на беларускую або расейскую мовы. У «Кнігарні пісьменьніка» каштуе 7220 руб.

**Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразэалягізмы** / Уклад. Ф.Янкоўскі; Прадм. Дз.Бугаёва. — Менск: Беларуская навука, 2004. — 494 с. 1500 ас.

Прыказкі на любыя выпадкі жыцьця, народныя жарты, добразычлівыя пажаданьні й кленічы — узоры жывое мовы. Кніга руплівага зьбіральніка й сыстэматызатара моўных скарбаў вытрымлівае ўжо чацьвёртае перавыданьне. Цана 5800 руб.

**Клышка А. Ад каранёў да кроны:** Вершы. — 2-е выд.— Менск: Беларускі Экзархат, 2004. — 88 с. 450 ас.

Пэдагог, стваральнік шматразова перавыдаванага «Буквара» мае й вялікі паэтычны стаж. Гэты зборнік беларуска- і расейскамоўных вершаў ды пародый — своеасаблівае падсумаваньне напісанага за некалькі дзесяцігодзьдзяў. Цана ў «Акадэмкнізе» 4000 руб.

**Купала Янка. Тутэйшыя:** Трагічна-сьмяшлівыя сцэны ў 4-х дзеях / Прадм. і камэнт. П.Васючэнкі. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 94 с. 1500 ас.

Каляровая супэрвокладка, добрая папера й друк, фатаздымкі з тэатральнай пастаноўкі ў якасьці ілюстрацый — і Купалавы «Тутэйшыя» выглядаюць рыхтык кніга сучаснага моднага аўтара. Зрэшты, ня толькі паліграфічным афармленьнем, але й надзённасьцю гучаньня п’еса ані ў чым не саступіць творам сучаснай літаратуры. Несьмяротнасьць клясыкі, «меджду протчым». У «Кнігарні пісьменьніка» — 3520 руб.

**Макарцоў М. Песьні вандроўніка:** Вершы. — Менск: Чатыры чвэрці, 2004. — 56 с.: іл. 1000 ас.

**Сачанка Б. Апошнія й першыя** / Уклад. Т.Сачанкі. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 447 с. — (Беларуская проза XX стагодзьдзя). 2000 ас.

У кнігу ўвайшлі выбраныя часткі з раману «Чужое неба», аповесьці «Родны кут» ды «Апошнія й першыя», а таксама апавяданьні розных гадоў. Цана 7940 руб.

**Чыгрынаў І. Плач перапёлкі:** Раман, апавяд. / Уклад. Л.Чыгрынавай. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 415 с. — (Беларуская проза XX стагодзьдзя). 2000 ас.

Кнігу склалі раман «Плач перапёлкі» ды 14 апавяданьняў, напісаных у розныя часы.

**Беларусь: История и современность.** — Минск: БелЭн, 2004. — 144 с.: ил. 3000 ас.

Расейскамоўнае даведачнае выданьне сьцісла асьвятляе найважнейшыя бакі жыцьця «рэспублікі» — тэрытарыяльна-прыродныя асаблівасьці, дэмаграфічную сытуацыю, кірункі ўнутранай і замежнай палітыкі, стан народнай гаспадаркі, навукі, адукацыі. Даюцца зьвесткі пра літаратуру, мастацтва, кіно, архітэктуру й г.д. У разьдзеле «Канстытуцыйныя асновы дзяржавы» між іншага можна прачытаць пра «грамадзкую думку й рэфэрэндумы», а колькімі старонкамі пазьней — пра «інтэграцыю з Расеяй і супрацоўніцтва з суседнімі краінамі». Увогуле, кніга поўніцца духам аптымізму. Нездарма ў анатацыі адзначана, што «нават кароткі расповед аб рэспубліцы дае ўяўленьне пра яе непаўторнае хараство, яе працавіты й мужны народ, нараджае перакананасьць у тым, што яна ўваходзіць у трэцяе тысячагодзьдзе дастойным суб’ектам сусьветнай цывілізацыі».

**Леонов В. Без права на ошибку.** — Москва: За новую Беларусь, 2004. — 48 с. 30000 ас.

**Тацяна Вабішчэвіч**

казка

# Выпадак у лесе

**Першая нацыянальная Сарока:** Бяда! Бяда! Нас абразілі! Аплявалі! Усіх на зьвярыныя гульні пускаюць — і азіяцкіх тыграў, і акуня марскога ў слоіку, і нават мядзьведзя са сьцягам, а Сіваконя, гонар і надзею нашага лесу, — не!

**Барсук** (вымятаючы сьмецьце): Як гэта так?

**Сарока** (рэзка збавіўшы гучнасьць): Кажуць, лыч у брудзе. (Ізноў гучна) Ганьба! Ганьба!...

**Барсук:** За лесам брудных лычоў ня любяць. Вунь Парсюк суседзкі высунуўся быў — дык яго адразу ў заапарк. У нашага льва...

**Дзікі Сабака** (нячутна падышоўшы): У Караля Льва!

**Барсук:** Добра, добра — у караля льва...

**Дзікі Сабака:** У Караля Льва, я сказаў!

**Барсук:** ...дык у Караля Льва ледзьве зайцоў хапіла, каб выкупіць.

**Дзікі Сабака** (мякчэе): Сіваконя голымі рукамі не ўзялі б! Ён толькі апошнія гады ў сіваконскай скуры ходзіць. А раней быў о-го-го! Парадак у лесе навёў. Эх былі часы! Цяпер хіба папугайчык які зрыфмуе «леў—акалеў», дык паласуешся...

**Барсук:** А што ўсё-такі будзе з алімпійскай надзеяй?

**Дзікі Сабака:** Вунь воўк з адміністрацыі бяжыць, у яго спытаем.

**Воўк:** Поўны непратык. Ужо і ліса па замежных справах круцілася, і салавей ноту браў — не пускаюць, і ўсё. Эх, казалі ж яму: нацягвай скуру, хавай іклы... Лётае во цяпер па лесе.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сівакоњ** (не спыняючыся): Якія іклы! Я на новай пасадзе ўвогуле траваядны і няпарнакапытны. І пакуль не даказалі, што я там недзе некага задраў, няма чаго наносіць мне — і ня толькі мне — маральныя траўмы. Я ж харошы! Я і мухі не зачаплю!...

**Муха** (ляціць сьледам): Ён мяне не зачэпіць!

**Сівакоњ:** ...А ўсе гэтыя сланы і аслы толькі на словах дземакраты, а як касьнецца — гэткае ж зьвяр'ё! Ёсьць жа агульны для ўсіх закон джунгляў! І гэта яшчэ трэба паглядзець, хто насамрэч белы і пухнаты... Таму ўсе мы на чале зь мядзьведзем павінны больш актыўнымі быць ці што. Бо зь лесу ня выйсьці стала! А я да гульняў рыхтаваўся — пра мае дасягненьні ў бегу на кароткія дыстанцыі нават песьню склалі. І няхай Таварышч Леў не сумняецца: ускладзенае на мяне абавязацельства здабыць 25 мэдалёў я выканаць магу. Я яшчэ і не такое магу...

**Барсук:** Дык пытаньне ў тым, як табе на бегавую дарожку трапіць.

**Пракурорскі кот** (зьявіўшыся невядома адкуль): Можа, вусы яму накладныя?

**Воўк:** Ды з вусамі яго ўжо на ўзьлесьсі скруцяць! Падумаюць, што ён — гэта ты. Але надзея на станоўчае вырашэньне яшчэ ёсьць. Пазаўтра Сіваконева пытаньне разгледзіць сам Кароль Леў...

**Барсук:** А чаму аж пазаўтра?

**Воўк:** Заняты. Да яго Бабуін прыехаў і заўтра яны разам ідуць адбіваць рогі бунтоўным ласям.

**Дзікі Сабака:** Зрэшты, калі й не паедзе — такой бяды. Што нам тыя мэдалі. Галоўнае — у заапарк ня трапіць.

**Сяргей Мікулевіч**

**20—23 жніўня**
**запрашаем у вандроўку**
**«Золота Підкова Львоўшчыны»**
Менск—Жоўква—Крэхіў—Львоў—Алеск—Падгорцы—Золачыў—Сьвірж—Менск
Кошт вандроўкі: для дарослых 45 у.а. + 15 000 руб., для школьнікаў і студэнтаў — 40 у.а. + 15000 руб.
Кошт уключае: праезд аўтобусам, начоўку ў гатэлі «Львоў», экскурсійнае абслугоўваньне без уваходных квіткоў (квіткі ў замкі каштуюць 0,1—0,5 у.а.).
Неабходныя дакумэнты: пашпарт, для непаўналетніх — натарыяльна пацьверджаны дазвол на выезд за мяжу ад абаіх бацькоў.
Т.: 8-029-755-03-70, 222-88-76



**14—15 жніўня**
**Запрашаем на фэст сярэднявечнай культуры ў**
**Наваградак з заездам у Мір, Шчорсы і Любчу.**
Т.: 232-54-58, 273-81-14, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

**14 жніўня**
**запрашаем у вандроўку**
**Наваградак**
Кошт вандроўкі: для дарослых — 23000 руб., для дзяцей — 20000 руб.
Т.: 222-88-76
http://altusplus.narod.ru



# Як пахаваць сучасную беларускую літаратуру

**Адабраць** у Арлова і Глёбуса замежныя пашпарты.

Глёбусу яшчэ **забараніць** ужываць словы «я» і «чэлес».

А Шніпу — «сабака» і «граждан».

**Забараніць** Хадановічу ўжываць імёны і запазычаныя словы. Зрэшты, каб Хадановічу засталося хоць чымсьці пісаць, імёны дазволіць.

**Адабраць** кампутар у Курэйчыка. Зрэшты, каб ён мог хоць чымсьці пісаць, дазволіць калькулятар.

**Прыслухацца** да ўсіх парадаў крытыка Жукоўскага.

**Не прадаваць** спіртнога членам Саюзу пісьменьнікаў да дасягненьня імі 60-гадовага ўзросту. Зрэшты, каб ім было хоць чымсьці пісаць... Не, нічога не прадаваць.

**Выдаць** зборнік жаночай прозы.

У прэсе — **параўноўваць** усіх сучасьнікаў з Караткевічам і Кундэрам.

**Даць** поўную свабоду творчасьці Вішнёву.

**Алесь Коцюбаў**

КАІСА

# Беларусы ў Пардубіцэ

Чэскае мястэчка з 700-гадовай гісторыяй пакрысе ператварылася ў Мэкку аматараў клясычных шахматаў, брыджу, го і іншых гульняў, напрыклад, той, што ў нас завецца «швэдкамі». Фэстывалі тутака арганізуюцца кожнае лета з 1996 г. Сёлетні меў статус чэмпіянату Эўропы сярод аматараў, дарма што побач змагаліся гульцы высокага палёту. Беларусы ў Пардубіцэ — не навічкі. У 2004 г. наменьнікам галоўнага арбітра ў Пардубіцэ працаваў музыка й перапісчык Зьміцер Лыбін, а за дошку селі такія знакамітыя асобы, як Сяргей Азараў, браты Жыгалкі, Мікіта Маёраў, Андрэй Малюш, трэнэрка Руслана Мачалава… Сваіх выхаванцаў падтрымаў сталічны Палац шахмат і шашак, які аплаціў вандроўку.

Калі летась удзельнікі турніру пакутавалі ад сьпёкі і гулялі з мокрымі ручнікамі на галовах, сёлета арганізатары скупілі ўсе кандыцыянэры ў акрузе і забясьпечылі належны камфорт.

Згулялі так: Азараў — 4-е прызавое месца ў прэстыжным турніры «А» (6,5 ачка з 9), браты Жыгалкі — па 6 ачкоў, Маёраў — 5,5, Малюш — 5. Не заладзілася гульня толькі ў віцэ-чэмпіёнкі Беларусі Надзеі Паліводы: яна пакінула турнір «у мінусе». Затое спн.Мачалава стала срэбранай прызэркай Эўропы сярод аматарак у бязрэйтынгавай групе.

**ВР**

## Як бы вы згулялі?

**Д.Аруцінян — С.Азараў. Пардубіцэ, 2004. Ход чорных. Пагражае 1. Кс6 Тb5 2. а4. Як чорным захаваць лішнюю фігуру?**



**Адказ на заданьне з №29. Пасьля 1...Фg5? белыя прыгожа выйгравалі: 1. g7+! Ф(С)g7 2. Kg6+! (1...Kpg7 2. Ke6+).**

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Дзядзьку Міхалу зь Менску.** Вашы запісы не кладуцца ў канцэпцыю «НН», бо не падыходзяць ні для палосаў літаратуры, ні для «Камэнтароў і пошты».

**Марце Кеміcташ.** Па-мастацку слаба. Таму перабольшваньне і абагульненьне прачытваецца як некарэктнасьць у дачыненьні да мужчынаў.

«Наша Ніва» дзякуе Тацяне М.
і Зьвязу беларусаў замежжа за ўчасную дапамогу!

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем эсэіста Сяргея Шыдлоўскага** і выкладчыцу псыхалёгіі Полацкага ўнівэрсытэту **Ірыну Андрэеву** з узяцьцем шлюбу. Сяргея ж асобна — зь пераездам у Стары Полацак

**Андруся Дзенісевіча** віншую з Днём нараджэньня! Моцнага здароўя і плёну ва ўсіх пачынаньнях! Галоўнае — ня страціць веры ў нашу перамогу! Skarbnik

**13 жніўня** — Дзень народзін Аляксандра Рагачова — рэктара Гомельскага ўнівэрсытэту. Віншуем! Зычым усяго найлепшага. Студэнты

**Андруся Шпакава** віншую з Днём народзін. Усё будзе так, як трэба нам. Магнат Пілецкі

**Кацярына!** Віншую Вас з нараджэньнем новай Асобы! Няхай гадуецца на радасьць бацькам! Міхась

**«Тысячы сонцаў** не даюць мне спакою, і я мушу з усімі дзяліцца...» Памятаеце, Янка? Вітаю Вас! Міхась («сябар па радасьці»)

### КАНТАКТЫ

**Сапраўдныя беларусы**, адгукніцеся! Алесь, пр-т Інтэрнацыянальны, 2а-166, 213410, Горкі

### КНІГІ

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050 Менск, электронны адрас — exlibris@tut.by, вэбвузел — http://knihi.net, т. — 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новае дзецям**: Мілаш Мацоўрак, Адольф Борн «Мах і Шэбестава вандруюць па сьвеце», казкі М. Мацоўрака і О. Сэкары на аўдыёкасэтах, Пятро Васючэнка «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі». Т.: 8-029-643-57-33, exlibris@tut.by

**Прадам** кнігі: «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі», 4 і 5 тамы. Т.: 236-02-15. Ігар

### ПАДАРУНАК

**Прыму** ў падарунак добры партрэт пісьменьніка Юльяна Нямцэвіча для бібліятэкі Дому культуры на ягонай радзіме ў Скоках, а то там вісіць партрэт А.Пушкіна, «патаму шта ўсе ево очень любят». Т.: 8-029-727-55-82

### ПРАЦА

**Клявішніца** шукае месца ў гурце або працу ў кавярні. Музычная адукацыя ў наяўнасьці. Кірунак — пераважна рок. Т.: 252-62-12. Ірына

### РЭПЭТЫТАРКА

**Ангельская і швэдзкая мовы** зь беларускамоўнай рэпэтытаркай! Вопыт выкладаньня, замежныя стажыроўкі. Т. 202-97-20. Наста

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Адказы на крыжаванку з №29.

Па гарызанталі: 1. Ілжэнавука. 8. Парэ. 12. Ан. 13. Лупсякоў. 14. Эрганоміка. 16. Ласт. 17. Урад. 18. Даёнка. 20. Лыч. 23. Астан. 24. Каэфіцыент. 26. Ша. 27. Гвалт. 29. Аз. 31. Ія. 32. Таемнік. 35. Ківі. 37. Яшчарка. 38. Жах. 40. Лея. 41. Ашчадак. 44. Аул. 46. «Энрон». 47. Ра. 49. Хна. 50. Лук. 52. Сысун. 54. Стымул. 56. Дача. 57. Вік. 59. Капіляр. 62. Аладаў. 63. Мі. 64. Уланы.

Па вэртыкалі: 1. Ідэалёгія. 2. Жыгучка. 3. Нанамэтар. 4. Анод. 5. «Уліс». 6. Кук. 7. Апад. 8. Пялёстак. 9. Акант. 10. Роскаш. 11. Эўтаназія. 15. Ар. 19. ААН. 21. Кірмаш. 22. Дыліжанс. 25. Алтар. 28. Вяшчун. 30. ЗІЛ. 33. Екадумаў. 34. Кадрыля. 36. Вепр. 39. Хаос. 42. Чэ. 43. Кнуд. 44. Ахова. 45. Ласка. 48. Апачы. 50. Лыка. 51. КУП. 53. Нара. 55. «ЛіМ». 58. Іл. 60. Лі. 61. Ру.

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фота-рэдактар — Арцём Лява
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3377. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 11.08.2004.
Замова № 4959.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а